КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 17 (1247) 23 красавіка 2016 г.

Актуальна

Культурная бяспека

У чацвер, 21 красавіка, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка звярнуўся з традыцыйным штогадовым Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу краіны.

У выступленні беларускі Лідар закрануў літаральна ўсе аспекты грамадскага жыцця краіны. Так, вялікую ўвагу Аляксандр Лукашэнка надаў эканамічнаму блоку пытанняў. Прэзідэнтам Беларусі былі вызначаны праблемы ў эканоміцы і задачы па іх вырашэнні, абазначаны ключавыя кірункі дзейнасці па развіцці нашай краіны на бліжэйшую перспектыву.

— Даручаю Ураду да 1 ліпеня 2016 года забяспечыць падрыхтоўку дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця, у якой вызначыць усе ключавыя падыходы, прыярытэтныя напрамкі, першачарговыя меры і інструменты для фарміравання эканомікі ведаў, — адзначыў Прэзідэнт.

Паводле яго словаў, стратэгіяй развіцця Беларусі становіцца пераход на шлях інавацыйнага развіцця.

— І прычына тут не ў абмежаванасці мінерально-сыравінных рэсурсаў. Трэнд у эканоміцы сёння зусім іншы: галоўнае багацце — гэта мазгі, навука, інавацыі, а не тое, што Гасподзь паклаў у зямлю, — заявіў Прэзідэнт.

Таксама закрануты шэраг пытанняў, датычных сацыяльнай сферы: ад падвышэння пенсійнага ўзросту да якаснай падрыхтоўкі спецыялістаў для школ і інстытутаў. Але напачатку Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што 2016-ы абвешчаны Годам культуры.

— Выклікана гэта тым, што культура, у шырокім сэнсе слова, павінна адыгрываць больш актыўную ролю ў аб'яднанні народа вакол стваральных мэт, высокіх маральных прынцыпаў і нашых добрых традыцый. У бесперапынным глыбокім працэсе фарміравання працавітай, адукаванай, духоўна багатай і здаровай нацыі! — упэўнены Прэзідэнт Беларусі.

Акцэнт Года культуры, як заявіў Аляксандр Лукашэнка, будзе зроблены на мастацкай, творчай сферы. На думку Кіраўніка дзяржавы, вялікую ўвагу трэба надаваць і іншым напрамкам: культуры вытворчасці і земляробства, побыту і чалавечых адносін, добраўпарадкавання гарадоў і вёсак, беражлівага захавання гістарычнай спадчыны.

— Усё пералічанае — гэта і ёсць задачы Года культуры, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, Прэзідэнт краіны падкрэсліў, што на рэалізацыю дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2016 — 2020 гады закладзены значныя сродкі рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў.

— Урад і мясцовая ўлада абавязаны памятаць, што кожны рубель, укладзены ў будаўніцтва і рэканструкцыю аб'ектаў культуры, павінен прыносіць карысць. Нясвіж і Мір, Музей Вялікай Айчыннай вайны — добрыя прыклады. Але што далей? — разам з тым, зазначыў Лідар краіны.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на неабходнасць сістэмных падыходаў у сферы культуры.

Заканчэнне — **на старонцы 2.**

МАГІЧНЫ КЛІН НА ВУЛІЦЫ ШАГАЛА

У будучым Музеі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча акрэсліваецца непаўторная ўнутраная аздоба. Магічна прыцягваюць увагу першыя дэталі "гранітнага плаката" Эль Лісіцкага на падлозе першага паверху (паводле знакамітай работы "Клінам чырвоным бі белых"). Знакавым стала і нядаўняе перайменаванне вуліцы, на якой стаіць будынак: частка вуліцы Праўды займела імя Марка Шагала. Работы ж, якія праходзяць сёння на тэрыторыі музея ў рамках Рэспубліканскага суботніка, прыцягнулі ўвагу кіраўніцтва Віцебскага гарвыканкама. Урэшце, нядаўна міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў зазначыў, што сёлета, у Год культуры, багата беларусаў пажадалі працаваць на суботніку менавіта на аб'ектах і ва ўстановах сферы.

Фота прадастаўлена Віцебскім цэнтрам сучаснага мастацтва

СЁННЯ — РЭСПУБЛІКАНСКІ СУБОТНІК

26 КРАСАВІКА — 30 ГАДОЎ З ДНЯ АВАРЫІ НА ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ АЭС

Матэрыялы па гэтай тэме чытайце на старонках 3, 6 — 7,12 — 15.

Рэдакцыя плюс...

Ён нарадзіўся ў Ельску і працуе ў сферы мясцовай культуры вось ужо 43 гады. Скончыў Гомельскае музычна-педагагічнае вучылішча па спецыяльнасці "Культурна-асветніцкая работа". Пасля вучобы ў мінскім Інстытуце культуры ўдасканаліў веды ў арганізацыі і методыцы клубнай дзейнасці. Пачынаў з інструктара РДК, кіраўніка эстраднага калектыву, потым быў метадыстам, дырэктарам ГДК. З 1995 года кіруе аддзелам культуры, які займеў у дадатак цяпер ідэалогію і справы моладзі. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, з'яўляецца заслужаным дзеячам культуры Рэспублікі Беларусь… Час ад часу з ім раяцца калегі з іншых раёнаў і абласцей. Яму заўжды ёсць, што ім сказаць і паказаць. Нягледзячы на такую запатрабаванасць Валерый ГЕЙХМАН не лічыць, што ад памылак ён раз і назаўжды застрахаваны. Проста навучыўся іх своечасова выпраўляць.

Масавікі-забаўнікі?..

Падрыхтаваў Яўген РАГІН

— Калі стаў начальнікам, паўтара года літаральна жыў на раёне. У адзін і той жа дом культуры мог прыехаць два дні запар і без папярэджання. Інакш не даб'ешся, каб даручэнні выконваліся якасна і своечасова. Інакш кажучы, да дысцыпліны трэба прывучваць. Ёсць дысцыпліна — ёсць і праца.

— Эфектыўнасць работы начальніка аддзела вызначаецца наяўнасцю ананімак на яго ці іх адсутнасцю?

— Бывае, што тэлефануюць з вёсак: ці з бібліятэкай штосьці не так, ці дыскатэка не спадабалася. Рэагую. Ананімак жа, звязаных з, так бы мовіць, унутраным жыццём аддзела, не было. Значыць, працэс — адладжаны і крыўд-пытанняў у калег не выклікае.

— Няўжо вам ніколі не хацелася працягнуць кар'еру ў абласным цэнтры ці ў сталіцы? Што вас трымае шмат гадоў на адным месцы? І не толькі вас, але і жонку, двух сыноў?

— Калі ажаніўся, працаваў метадыстам ГДК, жонка — бухгалтарам у рыбсаўгасе. Ёй прапанавалі пасаду ў Мазыры, і мне нібыта месца знайшлося. Не "клюнулі". І ў вобласць у свой час не пагадзіліся пераязджаць… Я ў Ельску нарадзіўся, тут бацькі былі, брат з сястрой. Гэта вельмі важна: адчуваць дабрыню родзічаў, землякоў, аднадумцаў… Як я не ваяваў за дысцыпліну, а ворагаў так і не нажыў, абраз не чуў і сам нікога не абражаў. Вельмі крыўдна глядзець, як менталітэт людзей мяняецца. Не на карысць дабрыні. І найперш — у вялікіх гарадах. А я прывык быць шчаслівым.

— І што, ніколі туга не прыціскае?

— Не. Выхадныя не люблю. Быццам штосьці і робіш па гаспадарцы, але ўсё роўна аб працы думаеш… Калі кіраваў Домам культуры, жонка мяне ўвогуле амаль не бачыла. Але я яе папярэджваў, замуж выходзіш за культработніка. У маі будзе сорак гадоў, як мы разам жывём.

— Адну праблему "К" амаль не закранае. А звязана яна з тым, што ў асяроддзі работнікаў культуры многія шлюбы аказваюцца скасаванымі з-за непаразумення, што адзін член сям'і — публічны чалавек і мала бывае дома. Ці не таму ў нас шмат сямейных дынастый у культуры? Прынамсі, у такой пары — заўжды прафесійнае паразуменне.

— Наконт дынастый пагаджаюся. Аднак спыніцца хачу на іншым. Галоўны работнік культуры — жанчына (хоць у нашым раёне каля 25 працэнтаў работнікаў сферы мужчыны). Калі яна разумная, яна свайго мужчыну робіць, негалосна і незаўважна накіроўвае… Я б не сказаў, што ў нашым раёне такіх разводаў шмат. Так, творчыя людзі — вельмі няпростыя. З-за таленту ім даруецца многае. Але гэта не падстава забывацца на дысцыпліну.

Заканчэнне чытайце **на старонках 6 — 7.**

"Лічбавы" падыход

Культурны максімум: "танчым" па факце

Што ні кажы, а статыстыка — рэч цікавая. Для мяне гэта аксіёма, асабліва пасля азнаямлення з даведнікам "Беларусь у лічбах", які нядаўна з'явіўся на сайце Нацыянальнага статыстычнага камітэта краіны. Многія лічбы, паказчыкі і дыяграмы з названага выдання так ці іначай закранаюць сферу культуры краіны.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Мабыць, кожнаму цікава даведацца, што ў 2000-м годзе колькасць наведвальнікаў музеяў складала 3 мільёны 800 тысяч чалавек, а за 2015-ы — ужо больш за 6 мільёнаў чалавек. Прычым колькасць саміх музейных устаноў за гэты час павялічылася не так значна: са 134 да 157 адзінак. Так што цяпер можна з лічбамі ў руках казаць пра даволі ўдалае выкарыстанне музейшчыкамі свайго крэатыўнага патэнцыялу, паспяховую працу з наведвальнікамі ды ўдалы маркетынг, рэкламу і карысць ад правядзення разнастайных музейных акцый кшталту Дня адчыненых дзвярэй ці Ночы музеяў.

Праўда, за азначаны час, як паведамляецца на сайце Нацыянальнага статыстычнага камітэта, даволі значна знізілася колькасць карыстальнікаў бібліятэк. Так, калі ў 2000 годзе паслугамі бібліятэк скарысталася прыкладна 4 мільёны 500 тысяч чалавек, дык у 2015 — толькі 3 мільёны 250 тысяч чалавек. Справа тут, мабыць, не толькі ў зніжэнні цікавасці да кнігі, а і ў праведзенай за апошнія гады аптымізацыі сеткі бібліятэчных устаноў, асабліва ў сельскай мясцовасці. Напрыклад, калі ў 2010 годзе ў Беларусі дзейнічала 3 тысячы 849 публічных бібліятэк, дык у канцы 2015-га — ужо толькі 2 тысячы 893.

Натуральна, аптымізацыя закранула і клубныя ўстановы Беларусі. Праўда, колькасць клубаў скарацілася за пяць гадоў — нагадаю, менавіта ў гэты час аптымізацыя абвяшчалася і ажыццяўлялася — не так значна, як колькасць тых жа бібліятэк: з 3 тысяч 695 да 2 тысяч 937 адзінак.

Таксама за апошнія гады значна знізіліся паказчыкі наведвальнасці кінатэатраў. Скажам, калі ў 2010-м у кінавідовішчныя ўстановы прыйшло 9 мільёнаў 441 тысяча чалавек, дык летась зарэгістраваны мінімальны паказчык у 8 мільёнаў 125 тысяч чалавек. Зразумела, што дадзеная тэндэнцыя адлюстроўвае сітуацыю, калі з дапамогай Інтэрнэту прэм'еру таго ці іншага фільма (хай сабе і ў нізкай якасці) глядзяць на сваім дамашнім камп'ютары, запампаваўшы яе з пірацкіх сайтаў, задоўга да (ці нават замест) экраннага паказу. Да таго ж не варта забывацца, што за апошнія гады ў Мінску і абласных цэнтрах з'явіліся прыватныя кіназалы, якія так або іначай адцягваюць гледачоў з дзяржаўных кінапракатных арганізацый.

Заканчэнне чытайце **на старонцы 4.**

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ. / З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Актуальна

Культурная бяспека

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

— Калі будзе ўкаранёны сістэмны падыход да мадэрнізацыі ўстаноў культуры, якія маюць важнае рэспубліканскае значэнне? — спытаў Прэзідэнт.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, адно з важных дасягненняў дзяржавы за дваццаціпяцігадовую гісторыю Незалежнасці — захаванне багатай і разнастайнай гістарычнай спадчыны беларусаў, задавальненне культурных запытаў людзей.

— Галоўная задача ў Год культуры — актывізацыя інтэлектуальных і духоўных сіл грамадства, перш за ўсё моладзі, для далейшага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, — сказаў беларускі Лідар.

А Міністэрству культуры Беларусі, на думку кіраўніка краіны, сёння варта надаваць асаблівую ўвагу культурнай бяспецы дзяржавы.

— На жаль, у цяперашні час і гэта сфера духоўнага жыцця народа стала арэнай для супрацьстаяння палітычных сілаў, размежавання і дзяльбы дасягненняў. Сёння наша задача — не дапусціць канфрантацыі грамадства, усяляк садзейнічаць яго кансалідацыі дзеля сённяшняга і будучага дабрабыту нашай краіны, — заявіў Лукашэнка.

Пасля выступлення дэпутаты задалі шэраг пытанняў Прэзідэнту. Адно з іх тычылася стварэння грамадскай арганізацыі па ахове памяці аб Вялікай Айчыннай вайне.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэтай праблемай у Беларусі займаюцца многія маладзёжныя, грамадска-палітычныя аб'яднанні, дзяржаўныя органы і рэлігійныя дзеячы. Аднак калі пытанне стаіць глабальна і для яго вырашэння неабходна выдзеліць асобную арганізацыю, гэта можна зрабіць, паколькі яе стварэнне не забаронена заканадаўствам.

— Калі яна з'явіцца, будзем яе падтрымліваць, таму што вы будзеце займацца святой справай — не разбураць помнікі, а даглядаць іх, не прыніжаць памяць аб тым часе, як гэта вакол робіцца, а захоўваць праўду аб мінулай вайне, — сказаў Прэзідэнт.

К

Крок да прэміі

На сайце Міністэрства культуры краіны апублікавана падрабязная Інструкцыя аб парадку арганізацыі і правядзення Рэспубліканскага конкурсу тэатральнага мастацтва "Нацыянальная тэатральная прэмія".

Арганізатарамі конкурсу, што праводзіцца раз на два гады, з'яўляюцца Міністэрства культуры і Мінгарвыканкам.

Вырашана працягнуць традыцыю падзелу намінантаў па сектарах: драма, тэатр лялек, опера, балет, музычны тэатр, спектаклі для дзяцей і юнацтва. У кожным з раздзелаў будуць вызначаны найлепшыя мужчынская і жаночая ролі, а таксама спектакль-трыумфатар. Усяго — 18 статуэтак. Асобна назавуць найлепшую пастаноўку па творы беларускага аўтара.

У тэатраў яшчэ ёсць час прыняць удзел у I этапе конкурсу. Да 1 мая на адрас Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (220004, г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 11) неабходна накіраваць наступныя матэрыялы: заяўку на ўдзел, артыкулы ў прэсе на заяўленую пастаноўку, яе відэазапіс на DVD-дыску, а таксама фота- і рэкламныя матэрыялы.

Да 1 чэрвеня адборачныя камісіі шляхам тайнага галасавання простай большасцю галасоў прымуць рашэнне аб вылучэнні пастановак для ўдзелу ў II этапе. Каб вызначыць пераможцаў, сфарміруюць склады журы з ліку творчых работнікаў, тэатральных крытыкаў, мастацтвазнаўцаў, іншых работнікаў культуры, дзеячаў культуры і мастацтва, прадстаўнікоў арганізатараў і іншых зацікаўленых арганізацый. За найлепшы спектакль у кожнай з намінацый устанаўліваецца прэмія ў памеры 230 базавых велічынь. Пераможцы ў індывідуальных намінацыях атрымаюць па 40 базавых. У сітуацыі, калі абяруць некалькі пераможцаў на адну намінацыю, прэмію падзеляць паміж імі на роўныя часткі.

Па рашэнні аргакамітэта асобныя творчыя работнікі, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва краіны, юрыдычныя або фізічныя асобы, што прадстаўляюць спонсарскую дапамогу або робяць ахвяраванні на развіццё тэатральнага мастацтва, могуць быць узнагароджаны прызамі.

К

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Галіна МАХНАЧ.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2016. Наклад 4 777. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 22.04.2016 у 18.30. Замова 1571. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Ёсць пытанне!

Апошнім часам недахоп "белых" начэй, як у Санкт-Пецярбургу, у Беларусі кампенсуецца начамі музейнымі або нават бібліятэчнымі. Пра апошнюю з'яву і пагаворым.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Чаму "Ноч..." не для ўсіх?

Ноч музыкі і агню

Справа ў тым, што сёлета шэраг мінскіх бібліятэк вырашылі далучыцца да Міжнароднай акцыі "Бібліяноч-2016" і ўчора, 22 красавіка, працягнулі час сваёй працы да 23-й гадзіны вечара. У гэты дзень шэраг мерапрыемстваў — ад навуковых лекцый і майстар-класаў да канцэртаў і чытанняў літаратуры, — у бібліятэчных установах можна было наведаць цалкам бясплатна, а не за грошы, як падчас сталічнай Ночы музеяў.

Так, у навуковай бібліятэцы Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта гасцям прапанавалі Ноч музыкі і агню. Наведвальнікі паслухалі канцэрт беларускіх музыкантаў, узялі ўдзел у тэматычных майстар-класах і лекцыях пра музыку, папрысутнічалі на фаер-шоу ды згулялі ў настольныя гульні. А Рэспубліканская навуковая медыцынская бібліятэка на адну ноч пераўтварылася ў сапраўдную "Карусель жахаў". Тут чыталі творы Эдгара Алана По, шпацыравалі па знакамітым (і, натуральна, даволі страшным, асабліва для дзяўчат) музеі гісторыі медыцыны Беларусі, а таксама слухалі лекцыю "Катастрофы чалавечага цела".

Яшчэ адна ўстанова — Фундаментальная бібліятэка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта — правяла імпрэзу па тэме "Сучасны дакументальны экран. Смачныя гісторыі", у рамках якой адбыўся прагляд стужкі "Гісторыя беларускай страўні", быў зладжаны майстар-клас па прыгатаванні цукерак з бульбы, а таксама прайшлі квэсты і конкурсы. А Навукова-педагагічная бібліятэка Галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Міністэрства адукацыі Беларусі правяла ў гэты дзень "Кніжны фрымаркет" для абмену выданнямі. Пляцоўку падзялілі на тэматычныя секцыі, каб кожны наведвальнік меў магчымасць знайсці цікавую менавіта для яго літаратуру.

А тыя, хто хацеў правесці "Ноч з навукай", учора завіталі ў Цэнтральную навуковую бібліятэку Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Супрацоўнікі ўстановы культуры прадставілі на суд гледачоў лекцыю па генетыцы чалавека і ўнікальных магчымасцях дыягностыкі, а таксама зладзілі інтэрактыўныя варкшопы і тэматычныя майстар-класы на тэму навукі.

Чарвякі ці макароны?

Як бачна, усе пералічаныя вышэй бібліятэкі не знаходзяцца ў сістэме Міністэрства культуры. На жаль, сталічныя ўстановы, скажам, з Цэнтралізаванай сістэмы публічных бібліятэк горада Мінска, у падобнай акцыі не задзейнічаны. Як патлумачыла "К" кіраўнік сістэмы Алена Кубышкіна, калісьці супрацоўнікі ладзілі падобныя акцыі, але сёлета яны ў сталіцы не запланаваны.

А вось супрацоўнікі Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк Мінска "Бібліяночы" і "Бібліяпрыцемкі" ў сваіх установах як ладзілі, так і ладзяць. Праўда, не ў красавіку, а раней ці пазней. Як патлумачыла дырэктар ЦСДБ г. Мінска Таццяна Швед, "бібліяночы" ў іх ужо прайшлі ў дзіцячых бібліятэках № 3 і № 14, адпаведна, 19 студзеня і 19 лютага бягучага года. У бібліятэцы № 3 падобная акцыя запланавана ў кастрычніку, а напрыканцы года "Бібліяноч" адбудзецца і ў Цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы імя Мікалая Астроўскага.

Да слова, супрацоўнікі бібліятэкі № 14 падрыхтавалі і правялі сваю "бібліяноч" па матэрыялах кніг Джоан Роўлінг пра Гары Потэра. Чароўная шапка, якая, як вядома, "ніколі не памыляецца", "размеркавала" ўсіх гасцей па пэўных "факультэтах", дзе трэба было падтрымліваць адзін аднаго, годна пераносіць усе выпрабаванні, не згубіць здабытыя ў цяжкай барацьбе "ачкі", і берагчы малодшых і дзяўчынак. Напрыклад, паводле аднаго з заданняў, удзельнікам трэба было знайсці ў цёмным склепе, пры цьмяным святле свечкі, ключ, які быў схаваны ў ёмістасцях з рознымі наапаўняльнікамі: "чарвякамі" (насамрэч гэта былі халодныя адвараныя макароны), "павукамі" (гумавыя цацкі з "кіндар-сюрпрызаў"), сапраўдным халодным кефірам, мукой, маленькімі колкімі шышкамі і многім іншым. Усе госці, якія годна прайшлі ўсе выпрабаванні, натуральна, былі прыняты на першы курс Школы магіі і чараўніцтва…

Як сцвярджае Таццяна Швед, падобныя акцыі значна ўздымаюць цікавасць дзяцей і падлеткаў да ўстаноў. Таму каштоўнасць "Бібліяночаў" і "Бібліяпрыцемак" для кіраўніка Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк горада Мінска — несумненная.

Заканчэнне **на старонцы 7.**

Фотафакт

У суботу творчыя калектывы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў працягнулі Рэспубліканскую грамадска-культурную акцыю "Беларусь, я люблю цябе!". Па традыцыі апошніх месяцаў, выступленне артыстаў адбылося ў мінскім падземным гандлёвым цэнтры "Сталіца".

22 красавіка ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі медалі UNESCO "Пяць кантынентаў" і дыпломы Генеральнага дырэктара UNESCO Ірыны Бокавай уручылі народным артыстам Беларусі, народным артыстам СССР, прафесарам Валянціну Елізар'еву (на фота справа) і Ігару Лучанку. Згаданым медалём, заснаваным у 1996 годзе, адзначаюцца дзеячы культуры розных краін за значны ўнёсак у развіццё нацыянальных культур і культурнай разнастайнасці ў свеце.

Надзённае

(Пачатак тэмы ў № 16.)

З 4 красавіка ўступілі ў сілу змены ў Кодэксе пра адміністрацыйныя правапарушэнні адносна сферы аўтарскага права. Карэспандэнт "К" прапанавала начальніку Цэнтра па калектыўным кіраванні Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці Аляксею БІЧУРЫНУ жыццёвыя сітуацыі, з якімі сутыкаюцца (ці ў якія могуць патрапіць) работнікі ўстаноў культуры краіны, і іх магчымае развіццё з юрыдычнага пункту гледжання.

Настасся ПАНКРАТАВА

Правілы паводзін

— Як я разумею, зараз установам культуры неабходна абавязкова пераправерыць свае працоўныя камп'ютары і службовыя сеткі — раптам там папка са спампаванымі фільмамі ляжыць...

— Хутчэй за ўсё яна там дакладна ляжыць. А захаванне асобнікаў твораў аб'ектаў аўтарскага права (фільмы, музыка, відэакліпы і гэтак далей) на серверы, на службовым камп'ютары па змаўчанні цягне да адміністрацыйнай адказнасці. Часцей за ўсё людзі гавораць, што гэта папка — для асабістага карыстання. Тады ўзнікае пытанне, а чаму на службовым ПК захоўваюцца творы ў такім аб'ёме?.. Доступ да яго маюць іншыя супрацоўнікі, значыць, магчымае распаўсюджванне тых відэа- і аўдыяматэрыялаў. Нам кажуць, што гэтыя файлы неабходныя для падрыхтоўкі масавага мерапрыемства. Атрымліваецца, вы тыражуеце чужую інтэлектуальную маёмасць, а за гэта неабходна ўносіць аўтарскія адлічэнні.

У мяне час ад часу бываюць сустрэчы на рознага кшталту адукацыйных мерапрыемствах з начальнікамі раённых аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі дырэктарамі дамоў культуры, кіраўнікамі іншых устаноў галіны. Сталыя людзі часта жартуюць: "Ой, хіба за такую дробязь вы мяне прыцягнеце ды ў турму пасадзіце?" З Галівудам, маўляў, нічога не станецца, калі я тут пакажу парачку фільмаў… Што ж, гэтага чалавека можа і не атрымаецца прыцягнуць да адказнасці, але юрыдычныя механізмы ўдасканальваюцца і каса натрапіць на камень. Цікава, што некаторыя з тых культработнікаў самі з'яўляюцца творцамі. І калі іх творы нехта з камерцыйнымі мэтамі выкарыстоўвае, яны шчыра крыўдзяцца і абураюцца.

— Дарэчы, адносна культурна-масавых мерапрыемстваў. Часцяком у бібліятэках, ДК, ДШМ ладзяцца святы з удзелам персанажаў папулярных мультфільмаў...

— Адназначна: гэта з'яўляецца парушэннем аўтарскіх правоў. Вельмі шкада, калі бізнес-мадэль установы будуецца на бягучым попыце, і ніхто не клапоціцца пра неабходныя прававыя абгрунтаванні правядзення гэтай дзейнасці. Так адбываецца з той жа прычыны: пакуль у нашай краіне невялікая перспектыва прыцягнення да адказнасці… Нядаўна ўсе абмяркоўвалі гучную справу аўтааматара, якога транспартная інспекцыя злавіла на неліцэнзаваных пасажырскіх перавозках і паставіла яму ў віну незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць. Калі-небудзь і арганізацыі, якія займаюцца аховай правоў інтэлектуальнай уласнасці, дойдуць да такой ступені дэталізацыі справы…

— …і звернуць увагу на прыватных аніматараў, якія спрэс зарабляюць на выкарыстанні вобразаў папулярных анімацыйных персанажаў.

— Пакуль не ўсе камерцыйныя карыстальнікі інтэлектуальнай маёмасці пастаўлены на ліцэнзійныя рэйкі і законна выкарыстоў-

Пра культуру праз ІТ

Гэтым тыднем у Мінску традыцыйна праходзіла Міжнародная спецыялізаваная выстава "ТІВО-2016". Сёлета яе ўдзельнікамі сталі больш за 100 кампаній з 18 краін. Навукова-практычная канферэнцыя "Электронная культура" прайшла ў рамках форуму 20 красавіка.

Намеснік міністра культуры Аляксандр Яцко падкрэсліў рэгулярнасць і стабільнасць форуму з пяцігадовай гісторыяй, што збірае спецыялістаў публічных і спецыялізаваных бібліятэк, музеяў, тэатраў, а таксама ІТ-кампаній.

З цікавага: Сяргеем Павалішавым, дырэктарам hoster.by, быў прадстаўлены кірылічны дамен БЕЛ, які хутка можа стаць альтэрнатывай усім звыклай "кропцы бай". Алесь Суша, намеснік дырэктара па навуковай працы і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі, распавёў пра базу даных і партал нацыянальных культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца па-за межамі рэспублікі. Рэсурс пакуль не працуе онлайн, але гэта — справа часу. Адзіным замежным удзельнікам на канферэнцыі стаў украінскі бізнесмен Кірыл Віслабокаў, які на практыцы давёў, што прыватная ініцыятыва ў стане стварыць архіўную інфармацыйную сістэму, у чыёй дзейнасці будуць зацікаўлены і дзяржава, і замежныя замоўцы.

Відаць, праз актыўнае развіццё і выкарыстанне 3D-тэхналогій, у тым ліку і айчынных, шэраг дакладаў прысвяцілі менавіта гэтай тэматыцы: віртуальныя экскурсіі, у тым ліку па старадаўніх часах, рэканструяваныя мадэлі архітэктурных помнікаў і населеных пунктаў. Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы падзяліўся досведам супрацоўніцтва з кампаніяй "Тэхнамузей", якая дапамагла мадэрнізаваць экспазіцыю Мемарыяльнага запаведніка "Ляўкі". Канешне, увагай не абышлі і бібліятэчную сферу. Асаблівы акцэнт быў зроблены на стварэнні зводнага электроннага каталога бібліятэк Беларусі.

Канферэнцыю нельга назваць ненасычанай, але многія аспекты, падалося, цікавыя вузкаму колу спецыялістаў. Але з заўважанага дадам: асобныя выступоўцы пасля сваіх дакладаў хутка пакідалі залу па сваіх справах і не вярталіся. Выпадковых слухачоў гэтая галіновая сустрэча таксама не асабліва прывабіла. Між тым электронныя тэхналогіі ў культуры скіраваны на прыцягненне ўвагі і цікавасці публікі… К

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы 26 і 27 красавіка прадставіць прэм'ерны паказ спектакля Мікалая Пінігіна "Дзве душы" паводле Максіма Гарэцкага. на здымку: заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Ігар Сігоў і артыст Раман Падаляка ў сцэне са спектакля. / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

2016 ГОД КУЛЬТУРЫ

Ініцыятыва — бадай самае каштоўнае, што ёсць у развіцці творчасці і культуры. І важна, што ў Год культуры гэтая ініцыятыва праяўляецца з падвоенай энергіяй. А хэштэг #2016годкультуры стаў назвай новай рубрыкі "К" і пазнакай для такіх матэрыялаў на сеціўных рэсурсах газеты.

Творы народных мастакоў Беларусі Міхаіла Савіцкага і Гаўрылы Вашчанкі, заслужаных дзеячаў мастацтваў нашай краіны, а таксама мастакоў з Расіі і Украіны… Выстава жывапісу, прысвечаная 30-годдзю катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, працуе ў гомельскай Карціннай галерэі Гаўрылы Вашчанкі. Арганізатарамі падзеі выступілі Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў сумесна з Нацыянальным мастацкім музеем краіны, Беларускім саюзам мастакоў і Беларускай дзяржаўнай акадэміяй мастацтваў. А 26 красавіка экспазіцыя адзін дзень будзе дзейнічаць у ельскім Гарадскім доме культуры "Колас".

Віктар Шматаў. "Лёс".

Вольга РОПАТ

І пачатак…

Уладзімір Гардзеенка. "Дуб. Лакіраваная рэчаіснасць".

Сучасных варыянтаў творчага выказвання па пэўнай тэматыцы стае: інсталяцыя (напрыклад, гукавая ці прасторавая), фатаграфія, відэаарт… А што новага можна сказаць на мове жывапісу? Зразумела, на выставе прадставілі, у асноўным, пейзажы. Палатно Уладзіміра Гардзеенкі "Былое. Вясна", выкананае ў адценнях жоўтага, зялёнага, блакітнага, быццам бы аповед пра тэрыторыю, дзе засталіся "дажываць" рэчы. Мабыць, усё ж такі "выцясняе" прырода "матэрыяльную памяць". Яшчэ адна работа мастака "Дуб. Лакіраваная рэчаіснасць" выканана ўжо не ў рэалістычнай манеры. На палатне і яшчэ "жывое", і закранутае радыяцыяй лісце, галіны дуба, а зусім не вясёлая "вясёлка" паступова ахутвае дрэва. Тое, што пакрыта чарнобыльскімі "фарбамі", ператвараецца ў чорны сілуэт.

На кожнай групавой выставе знойдуцца, акрамя тэматычных карцін, і "ўніверсальныя" работы, якія смела можна выкарыстоўваць у экспазіцыях кшталту "ўспаміны пра горад". Такі жывапіс заўжды надае экспазіцыям эмацыйную раўнавагу: "разбаўляючы" напружанасць, вастрыню ўражанняў плаўнасцю і мяккасцю. Гомельскі мастак Генадзь Фядотаў напісаў, як падаецца, класічны пейзаж — узбярэжжа ракі. Аднак радыяцыю мастак паказаў ружовымі плямамі (вось і дысананс!), раскіданымі па жывапісным палатне акцэнтамі.

Сімвалічная карціна Уладзіміра Кожуха "Ачышчэнне" з выявай царквы мае падвоены сэнс. Кампазіцыйным цэнтрам твора з'яўляецца ікона, але ўвагу адцягвае і надпіс "Асцярожна, радыяцыя!" са знаёмым усім знакам небяспекі. Супрацьлеглым на карціне можна лічыць духоўнае (рэлігійнае) і матэрыяльнае (забруджанае). Акцэнт мастак робіць на першым. Карціна ж Віктара Шматава "Лёс" — пра "разбуранае" катастрофай жыццё людзей, радзіму. Чорнае прамавугольнае акенца старога дома ў драўлянай старажытнай раме (і зараз такія яшчэ сям-там сустрэнеш), падаецца, сімвалізуе безвыходнасць. Ну а чорны колер, паводле абстракцыяніста Васіля Кандзінскага, ёсць закончаная паўза, праўда, за ёй — працяг, пачатак новага свету. К

Пакуль — эскізы

Люстэрка жыцця — мастацтва. І тое, што на чарнобыльскай тэме ў Беларусі пакуль што не паўсталі ні літаратурныя эпапеі, ні манументальныя мастацкія творы, можа сведчыць пра спецыфічнае успрыманне тэмы грамадою.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Паводле логікі жыцця і законаў цывілізацыі менавіта пераадоленне крызісных варункаў, якое вымагае з'яднанасці, найбольшай мабілізацыі духоўных і фізічных сіл, здольнасці працаваць і змагацца, як кажуць, "праз не магу", якраз і робіць чалавека асобай, а натоўп — грамадствам. У мінулым стагоддзі для Беларусі такімі лёсавызначальнымі падзеямі былі дзве сусветныя вайны і Чарнобыль. Урэшце, нарадзілася пакаленне, якое ўспрымае трагічныя падзеі 1986 года, як даўнюю гісторыю. А між тым, Чарнобыль — усё яшчэ надзённасць наша. Праўда, ўсведамляюць гэта хіба спецыялісты сферы аховы здароўя, эколагі, што вядуць маніторынг забруджаных тэрыторый, сацыёлагі і эканамісты, якія аналізуюць наступствы для краіны ў доўгатэрміновай перспектыве.

Так, не было у нашай краіне па вялікім рахунку з нагоды Чарнобыля шырокай творчай плыні, хіба толькі рэфлексіі асобных мастакоў і пісьменнікаў. Сярод найбольш удалых зваротаў да згаданай тэмы варта назваць жывапісны цыкл Міхаіла Савіцкага з відавочным ухілам у рэлігійную містыку, прасякнутыя болем за роднае Палессе карціны Гаўрылы Вашчанкі.

Заканчэнне
на старонцы 13.

з аўтарскім правам

ваюць прадукт, каб казаць, што прыйшоў час лавіць аніматараў-прыватнікаў. Але, можа стацца, нехта захоча зарабляць на тым, што будзе аказваць паслугі па выяўленні фактаў незаконнага выкарыстання твораў. Умоўная калектарская служба будзе прапаноўваць аўтарам шукаць замест іх парушэнні (з мэтай атрымання пэўнага працэнта за свае паслугі). Цалкам законная дзейнасць, дарэчы. Часам існаванне праваўладальніка на шэраг папулярных фільмаў і мультфільмаў у эканамічных умовах залежыць ад таго, наколькі той перакрые кісларод усім нелегальным карыстальнікам. Тады і ўзнікаюць спецыяльныя людзі, якія фіксуюць, як індывідуальны прадпрымальнік у касцюме пазнавальнага персанажа працуе пад знакамітую музыку з дыснэеўскага мультфільма. А потым у судзе той прыватнік будзе здзіўляцца, што столькі гадоў так рабіў — і ніхто не скардзіўся. А тут ужо склад крымінальнага злачынства прысутнічае, бо чалавек шматразова атрымліваў ганарары за выкарыстанне аб'екта аўтарскага права…

— Але вернемся да бібліятэк. Паглядзіш на сайтах гэтых устаноў фотасправаздачы з мерапрыемстваў: тут трансформеры ходзяць, там Маша з Мядзведзем скача, далей яшчэ хтосьці з папулярных персанажаў…

— Выкарыстанне ідэй і вобразаў магчымае, калі імпрэза не мае ярка выяўленага камерцыйнага чынніку. Закон кажа пра выключэнні, дапускаючы прымяненне аб'ектаў аўтарскага права з дакладнай агаворкай: можна выкарыстоўваць творы без аўтарскіх адлічэнняў для адукацыйных, сацыяльна-карысных мерапрыемстваў без мэты атрымання прыбытку.

— Такім чынам, школьны тэатр можа паставіць, прыкладам, п'есу Андрэя Курэйчыка, без папярэдняй дамовы з ім.

— Так. Аматарскія калектывы законам выведзены з-пад сферы дзейнасці выключнага права на твор. Для такога кшталту калектываў ці асобных выканаўцаў дапускаецца выкарыстанне аб'ектаў аўтарскага права без атрымання дазволу і без выплаты ўзнагароджання аўтару. Але раскажу маё ўласнае адчуванне ад той практыкі, што склалася ў рэспубліцы. Гэта паслабленне празрыстае, але мае вузкую мяжу. Кіраўнікі непрафесійных тэатраў (тое ж датычыцца аркестраў, харэаграфічных калектываў і іншых суб'ектаў) часам кажуць: учора за пастаноўку мы грошай не бралі, але сёння неабходна абнавіць рэквізіт, набыць апаратуру, выканаўцам няблага было б нешта даць, таму хоць па дробязі з гледачоў збяром грошы. У гэтым выпадку калектыў пераходзіць мяжу некамерцыйнага характару. Вы маеце прыбытак (не важна, што ў малым памеры) — навідавоку парушэнне аўтарскіх правоў. Як прывіць павагу да інтэлектуальнай маёмасці? Павага да закона забяспечваецца непазбежнасцю яго выканання.

Наша дзяржава зацікаўлена ў пераходзе на рэйкі інавацыйнага развіцця. Зараз шмат гавораць пра эканоміку ведаў. Гэтыя прыгожыя словы маюць праламленне ў паўсядзённым жыцці: за чужыя веды неабходна аддаваць свае грошы. Тое ж самае з творчым прадуктам. Па маім бачанні, мы абавязкова прыйдзем да таго, што за любы твор давядзецца плаціць. Тады становіцца цікавым паспрабаваць прапанаваць свой арыгінальны прадукт, за які ўжо табе будуць выдаткоўваць ганарар. Так павінна выглядаць постындустрыяльная мадэль эканомікі. К

Працяг тэмы —
у наступных нумарах.

У Малдове гукалі вясну па-нашаму

У Бюро міжэтнічных адносін Рэспублікі Малдова па ініцыятыве грамадскага аб'яднання "Беларускі культурны рух Малдовы" зладжана старажытнае свята-абрад "Гуканне вясны". У якасці арганізатараў выступілі пяць грамадскіх аб'яднанняў беларускай дыяспары.

Палюбавацца на адзін з самых жыццярадасных беларускіх абрадаў і дапамагчы дыяспары прыйшлі прадстаўнікі Пасольства Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Малдова, калегі з рускай, балгарскай, польскай, украінскай дыяспар і шматлікія сябры.

Беларускі этнічны тэатр "Куфар" падрыхтаваў тэатралізацыю. Таксама ў святочнай праграме прыняў удзел вакальны хор "Зорачка" Беларускай грамады Рэспублікі Малдова.

На тэрыторыі парка Бюро міжэтнічных адносін было праведзена сакральнае традыцыйнае дзейства спальвання Марэны — злоснай багіні зімы, хвароб і смерці.

Ганна МАЗУР,
старшыня праўлення БКРМ

"Лічбавы" падыход

Культурны максімум: "танчым" па факце



(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Цікавую выбарку Белстат дае і па айчынных цырках, якіх, як вядома, у Беларусі ўсяго два — у Мінску і Гомелі. Яны за апошнія пяць гадоў даволі няблага нарасцілі колькасць наведвальнікаў сваіх мерапрыемстваў, асабліва ў сталіцы. Напрыклад, калі ў Белдзяржцырк у 2011 годзе завіталі на прадстаўленні 386 тысяч чалавек, дык у 2015-м — ужо 426 тысяч. Але пік гледачоў прыйшоўся на 2013-ы: больш за 461 тысячу наведвальнікаў.

З таго ж зборніка "Беларусь у лічбах" можна даведацца, што летась самымі папулярнымі ў Беларусі былі Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балету Рэспублікі Беларусь (амаль 245 тысяч наведвальнікаў за год), Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр (144 тысячы наведвальнікаў) ды Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага (81 тысяча наведвальнікаў). Сярод музеяў лідарамі з'яўляюцца Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (больш за 550 тысяч наведванняў за год), Мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой" (416 тысяч наведванняў) ды Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж" (амаль 408 тысяч наведванняў).

■ Названыя амаль 400 тысяч — той **максімум, якім гатовы ахвяраваць беларусы за культурныя** (а таксама, не забудзем, спартыўныя і турыстычныя!) паслугі ў месяц.

У зборніку прадстаўлены даныя і па наведвальнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Так, за мінулы год галоўную "кніжніцу" краіны наведала 82 тысячы 300 чалавек, а бібліятэчны фонд склаў прыкладна 9 мільёнаў 500 тысяч экзэмпляраў. Праўда, выдача кніг і часопісаў у Нацыяналцы за апошнія гады крыху зменшылася, магчыма, за кошт укаранення найноўшых камп'ютарных тэхналогій, якія дазваляюць чытачам выкарыстоўваць усё больш матэрыялаў установы праз Сеціва ці наяўныя платныя ці бясплатныя карпаратыўныя сеткі…

І апошняе. Як вынікае з тых жа статыстычных даных, за апошнія гады ўзровень спажывецкіх выдаткаў хатніх гаспадарак у Беларусі значна не змяніўся. Так, беларусы аддаюць прыкладна 40 % сваіх даходаў на прадукты харчавання, 2 % — на паслугі транспарту, 1,5 % — на паслугі ўстаноў аховы здароўя і недзе 5,4 — 5,7 % — на культуру, адпачынак і спорт.

Апошні паказчык — тая сума, на якую рэальна могуць прэтэндаваць культработнікі (як, натуральна, і спартыўныя ды турыстычныя арганізацыі). Скажам, калі ў месяц сярэднестатыстычны жыхар Беларусі летась атрымліваў прыкладна 6 мільёнаў 700 тысяч, дык 5,4 — 5,7 % ад гэтай сумы — гэта 360 — 380 тысяч рублёў. Менавіта на гэтыя тысячы беларусы штомесяц наведваюць музеі, клубы, бібліятэкі, канцэрты і тэатральныя пастаноўкі, а таксама адкладаюць грошы на адпачынак ці на прагляд хакейнага ці футбольнага матча, што называецца, "жыўцом". Зразумела, сума гэтая — цалкам умоўная: на яе, скажам, можна хадзіць штотыдзень на выстаўкі ці адразу аддаць за адзін канцэрт заезджай "зоркі" і больш не завітваць ва ўстановы культуры месяц ці нават два — тры, або набыць тую ж турыстычную пуцёўку, назбіраўшы патрэбную суму за цэлы год.

Гаворка тут пра іншае: названыя амаль 400 тысяч у месяц — той максімум, якім гатовы ахвяраваць беларусы за культурныя (а таксама, не забудзем, спартыўныя і турыстычныя!) паслугі. Ад гэтага "лічбавага" факту, на мой погляд, і трэба сёння "танцаваць" усім, хто працуе ў сферы культуры краіны і плануе атрымліваць тыя ці іншыя пазабюджэтныя даходы ад сваёй дзейнасці, выстаўляючы кошт білетаў на свае мерапрыемствы, уводзячы плату на бібліятэчныя, клубныя ці музейныя паслугі і гэтак далей. І хто цяпер скажа, што статыстыка — рэч нецікавая? Думаю, не памылюся, калі скажу, што праведзеныя факты, дыяграмы і табліцы пераканаюць у адваротным любога скептыка, нягледзячы на тое, ці працуе ён у абласным музеі, ці з'яўляецца супрацоўнікам сельскага дома культуры або бібліятэкі аграгарадка…

К



Настасся ПАНКРАТАВА

Маркетынг з нагоды беларускіх "...Масак"

Эстрадныя выканаўцы ўмеюць заявіць пра сябе, пры адсутнасці, як правіла, сур'ёзнай нагоды для размовы. Руку арбалетам параніў, машыну на паркоўцы падзёр, сэлфі на ўзмор'і зрабіў — і адразу прозвішча мільгаціць у мас-медыя. Айчыннаму тэатру ёсць пра што распавесці публіцы, аднак, ён нябыта саромеецца. Асабліва сціплы тэатр лялек. Днямі ж адбылося ўручэнне Расійскай нацыянальнай тэатральнай прэміі "Залатая маска" і адразу тры прадстаўнікі беларускага тэатра лялек атрымалі найвышэйшыя ўзнагароды ў суседзяў! І дзе інфармацыйная лавіна?



Распачынаючы калекцыю

Урэшце, пераможцаў ад Беларусі — больш. Упершыню за гісторыю існавання прэстыжнай прэміі ганаровую ўзнагароду "За выдатны ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва" расіяне прысудзілі дзеячу з замежжа — народнаму артысту СССР Расціславу Янкоўскаму. Адзін з інтэрнэт-парталаў у кантэксце навіны нават паспеў скласці топ-спектакляў Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага, дзе вядучыя партыі належаць бліскучаму акцёру.

Пра лялечнікаў мас-медыя распавядалі куды менш. Хутчэй рэагавала стужка навінаў у "Фэйсбуку", актыўна выдаючы ўслед за віншаваннямі развагі пра далейшы лёс тэатра лялек. А нагода для больш шырокай гаворкі і сапраўды шыкоўная! Лепшай работай рэжысёра прызнаны спектакль "Ваня" Аляксея Ляляўскага (прыватны санкт-пецярбургскі тэатр "Karlsson Haus"). Лепшым спектаклем Расіі сталася пастаноўка "Тоўсты сшытак" Аляксандра Янушкевіча, вучня Аляксея Анатольевіча. Доўгі час лаўрэат працаваў у Беларускім дзяржаўным тэатры лялек, а са студзеня 2015 года ўзначаліў Пермскі тэатр лялек (між іншым, прайшоўшы сур'ёзны конкурсны адбор і абышоўшы пяць канкурэнтаў). Сцэнаграфію Таццяны Нерсісян (галоўны мастак сталічнага тэатра лялек) да "Тоўстага сшытка" назвалі лепшай работай мастака. Такім чынам, прадстаўнікі айчыннай школы ўзялі амаль усе намінацыі ў раздзеле "Лялькі"!

Самі лаўрэаты да сваёй перамогі ставяцца даволі спакойна. Гэта і зразумела: у кожнага з іх маецца не адна прэмія вышэйшага гатунку з прэстыжных творчых спаборніцтваў. Як любіць паўтараць спадар Ляляўскі, узнагарода як шакаладка: далі — прыемна, не далі — ну і не трэба, маўляў, працуюць лялечнікі для душэўнай патрэбы, а не дзеля медалёў ды дыпломаў. Разам з тым упэўнена: прасоўваць творцаў, узнімаючы імідж мастацтва ў вачах публікі, павінны самі тэатры.

Абгортка паводле зместу

Сучаснае беларускае грамадства можа ганарыцца не толькі спартыўнымі поспехамі, але і дасягненнямі тэатра лялек. Адпаведна, і веданне пра першае куды больш. Я не сачу за спартыўнымі падзеямі, але нават мяне не абмінулі навіны, як на корце паспрачаліся Вікторыя Фёдараўна і яе галоўны трэнер Эдуард Уладзіміравіч: балазе падрабязнасці ліліся ледзь не з кожнага праса. А для тэатраў лялек не існуе такога інфармацыйнага поля, каб пра іх творчыя здабыткі гаварыла аўдыторыя, шырэйшая за спецыялістаў і адданых аматараў.

А між тым такія прадстаўнікі дзяржаўных тэатраў, як Аляксей Ляляўскі, Алег Жугжда з Гродна, Міхаіл Клімчук з Віцебску, Ігар Казакоў з Магілёва, ды не прывязаныя да канкрэтнай сцэны Святлана Залеская-Бень, Яўген Карняг, цяпер пермскі, але ж і наш Аляксандр Янушкевіч узнялі айчыннае сцэнічнае мастацтва на новую прафесійную вышыню. Гэта пацвярджаюць і за межамі рэспублікі, куды нашых рэжысёраў запрашаюць як з гастролямі, так і на пастаноўку, дзе ладзяцца з імі ў якасці хэдлайнераў майстар-класы ды просяць чытаць лекцыі. Іх імёны добра вядомыя ў іншых краінах. Баюся, нават лепш, чым на радзіме…

Калі рэжысёраў у асноўным турбуе творчае развіццё тэатра, дык перад адміністрацыяй штодзённа

■ Дык можа, **скарыстацца момантам?** Маркетолагі гатовыя ціснуць на "вокладку" тавара "адобрана кардыёлагамі краіны", "лепшы па прызнанні асацыяцыі стаматолагаў"... Спектакль — таксама тавар, а яго, нават найвышэйшага гатунку, патрэбна правільна прадаць.

маячыць неабходнасць выканання плану па напаўняльнасці залы. Дык можа, скарыстацца момантам? Напрыклад, маркетолагі гатовыя хоць-якую адзнаку ціснуць на "вокладку" тавара: "адобрана кардыёлагамі краіны", "лепшы па прызнанні асацыяцыі стаматолагаў"... Спектакль — таксама тавар, а яго, нават найвышэйшага гатунку, патрэбна правільна прадаць. Пастаўце на афішу: "Спектакль уладальніка "Залатой маскі" (а найперш — Нацыянальнай тэатральнай прэміі Беларусі) — гэта адразу надасць вагу для тых, хто сумняваецца ў выбары мерапрыемства.

Такімі маркерамі можна прывабіць новую частку патэнцыйнай аўдыторыі. Чалавек, які выбіраецца да Мельпамены раз-пораз, заўсёды вельмі разгублена глядзіць у зводную афішу: для яго ўсе тэатры аднолькава незнаёмыя. Каб канкураваць з заезджай антрэпрызай, наша назва павінна таксама быць на слыху, засесці ў візуальнай памяці. І "Залатая маска" — добры якар (нават той, хто нічога не ведае пра яе, зрэагуе на словы "найпрэстыжная" і "замежная").

Рэгіянальная панарама

Сціпласць упрыгожвае творцу, але не дазваляе менеджару прыцягнуць увагу. Некаторыя ўмеюць недагаварыць, каб "мінус" ператварыць у "плюс". Увосень пацешыў гастрольны буклет Свярдлоўскага тэатра музыкальнай камедыі: у раздзеле пра мюзікл "Кацярына Вялікая" вытрымкі з рэцэнзій падаліся празмерна захопленымі. Адшукала тыя артыкулы ў Сеціве. Выявілася, што такое аднадушнае захапленне атрымалася таму, што екацярынбургскія рэдактары спыніліся ў цытаванні на самым патрэбным месцы… Але ў мінскай зале амаль не было пустых месцаў. Вынік? Вынік!

Калі нехта з неадназначнага робіць "цукерачку", дык чаму мы не можам годна падаць сапраўднае дасягненне? Мне бачыцца, што сузор'е "…Масак" дае падставу абласным тэатрам дадаткова прыцягнуць і да сябе ўвагу публікі. Пастаноўкі Аляксея Ляляўскага ідуць у Гродна ("Візіт старой дамы"), Брэсце ("Самазванец"), на наступным тыдні там жа павінна адбыцца прэм'ера яго "Манерніц". Дарэчы, мастаком тут выступіла шыкоўная Таццяна Нерсісян. Яна, заўважу, часта працуе ў рэгіёнах, адна з апошніх гучных прац — магілёўская прэм'ера "На дне" ў пастаноўцы Ігара Казакова.

Вернемся да Брэсцкага тэатра лялек. У рэпертуары значыцца дзіцячы спектакль "Прыгоды Касперля і Сэпеля" зорнага дуэта Янушкевіч-Нерсісян. У пачатку красавіка пастаноўку прывозілі ў Мінск. На суботнім прадстаўленні было запоўнена з палову залы… Магчыма, у родным горадзе сітуацыя з наведваннем лепшая, але чаму б у далейшым не падагрэць бы цікавасць да цудоўнай пастаноўкі адным радком: аўтары — лаўрэаты прэстыжнай прэміі?

У мяне часам складваецца адчуванне, што тэатры забываюцца: спектакль — гэта таксама прадукт, які проста неабходна рэкламаваць. Усё ж такі не хапае ў штатным раскладзе многіх труп спецыялістаў па прасоўванні… А ў тых жа дзяржаўных калектываў з'явілася вялікая канкурэнцыя — безліч антрэпрыз, шоу роставых лялек папулярных анімацыйных персанажаў, нават па школах і садках "калясяць" прыватнікі. Заўсёднікі ведаюць, чаму і для чаго трэба ісці ў тэатр лялек. Астатніх неабходна зацікавіць і запэўніць. Спытаеце, галоўнае, каб глядач вярнуўся наступным разам? Тут ужо справа за рэжысёрамі. Якія, відавочна, не падвядуць, бо маюць, што сказаць. І калекцыя "…Масак" таму пацвярджэннем.

На здымках: кадры са спектакляў "Птушкі", "Гора ад розуму" і "Прыгоды Касперля і Сэпеля".

К

Мае адчыненыя дзверы



Георгій ПАПЛАЎСКІ,
народны мастак Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі і прэміі Саюзнай дзяржавы, акадэмік

Хтосьці сказаў, што калі чалавек хавае сваё мінулае, у яго няма будучыні. Сваё я ніколі не хаваў — яно ў мяне было цудоўнае.

Нядаўна ў мяне адбылася сустрэча з чытачамі і гледачамі (на фоне невялічкай персаналіі жывапісу, графікі і кніг з маімі ілюстрацыямі) у Прэзідэнцкай бібліятэцы. Многія пытанні былі звязаныя і з творчымі вандроўкамі па свеце (а я пабываў практычна на ўсіх кантынентах планеты, акрамя Антарктыды) і з маім жыццём ды працай на радзіме.

Маладосць здаецца вечнай, але аднойчы ты адчуваеш, што аказваешся ў новай прасторы, дзе неабходна не толькі пераасэнсаваць пройдзены шлях у мастацтве працягласцю больш за 60 гадоў, але і падумаць: як перабудаваць мастакоўскі арганізм пад новыя духоўныя рэйкі. На шчасце, ёсць яшчэ сілы амаль штодзённа па некалькі гадзін працаваць у майстэрні, пісаць алеем і акварэллю, хаця ўжо не магу, як раней, сарвацца з месца і апынуцца, скажам, дзесьці ў Мексіцы, на Кубе ці ў Аўстраліі, а мо на Байкануры. І нават на маю ўлюбёную Браслаўшчыну, дзе я шчасліва пражыў з сям'ёй больш за паўстагоддзя і дзе стварыў сотні рэчаў, не так проста мне сёння выехаць нават праз узрост — 85 гадоў, гэта не жартачкі… А тое — мая зямля запаведная, "ціхая гавань" — вёска Маскавічы. Там прайшла важная частка прафесійна актыўнага жыцця. Туды я заўсёды вяртаўся пасля вандровак па зямным шары.

Успаміны… Яны заўсёды з табой. І цудоўныя, і не вельмі. Вось сёння прыгадаў 26 красавіка 1986 года. Чарнобыль. "Чорная быль". "Чорная трава". Якраз 30 гадоў таму гэта адбылося. А я памятаю гэты дзень і што было пасля яго да самых дробязей. І, зразумела, як мастак ужо тады не мог застацца абыякавым. Ужо праз год выканаў цыкл "Чарнобыль" з шасці каляровых літаграфій. Эстамп "Дрэвы без лістоты" па змесце і форме стаў галоўным у гэтай серыі. Гаму я выбраў стрыманую, чорна-чырвоную, жалобную. Злева паказаў аркестр трубачоў, нагадаўшы пра тое, што тагачаснае кіраўніцтва краіны імкнулася заглушыць сляды трагедыі святочнымі фанфарамі. З правага боку — дрэвы без лістоты, алегорыя лесу, які, абкружаючы Чарнобыль, стаў небяспечнай і злавеснай крыніцай выпраменьвання радыяцыі — нябачнай смерці без колеру і паху. У цэнтры кампазіцыі — фігура жанчыны з дзіцем на руках: яна ўцякае, выратоўваючы малечу. Цень ад іх падае на аблокі, і там у дзіцяці ўжо няма твару! Малое знікла, растварылася ў гэтай пагрозлівай, трывожнай атмасферы. Прынамсі, у гэты час наступствы выбуху пачалі праяўляцца. Так здарылася, аркуш аб'ектыўна стаў перасцярогай таму, што адбудзецца пазней.

Астатнія аркушы — "Дэзактывацыя", "Рок-н-рол", "Раўнавага", "Бежанец" і "Плашчаніца. Пакуты" — я таксама стварыў у складанай сімволіка-алегарычнай форме, і ў той жа час — у рэалістычным рэчышчы. А ў жывапісе напісаў карціну "Адчыненыя дзверы. Памяці без віны забітых". Гэта такая светлая здань жаночай фігуры з дзіцем, якая ўзнікла ў праёме прачыненых дзвярэй у злавесных чырвоных водбліскаў на фоне чорнай невядомасці. Тут я імкнуўся паказаць пачуццё найвялікшай трывогі і адчуванне сусветнай трагедыі.

Дарэчы, чарнобыльскі цыкл — не выпадковы эпізод біяграфіі. Пазней ён натуральна перарос у роздум пра экалогію наогул, уключаючы і экалогію душы, балазе грозныя папярэджанні луналі ў паветры і факты нарасталі хутка. Так узнікла тэма "Беларускія будні", хоць мне не надта хацелася, каб нашы будні, гэта значыць — штодзённасць, марнасць, мітусня, сіла звычак, якія апраўдваюць усё, выглядалі так, як распавядаюць мае літаграфіі "Паляванне на лася", "Галгофа", "Экспедыцыя", "Бойня"…

Ці веру я ў шчаслівую будучыню сваёй зямлі пасля Чарнобыля… Зрэшты, мастакоўскае і чалавечае нутро заўсёды ўцягвала ў сябе самое галоўнае на свеце: шчырую любоў да Жыцця…

Занатаваў Барыс КРЭПАК

Сялянскі "праект" і "выцінка"

Васіль ГРЫНЬ,
дырэктар турыстычнай фірмы, удзельнік дуэта "Старое сяло"

Не сказаў бы, што з правядзеннем у нашай глыбінцы фестываляў з нацыянальнай афарбоўкай, традыцыйных святаў і абрадаў усё ідзе добра, багата ды класна. Але саграшыў бы супраць ісціны, сцвярджаючы, што ўсё дрэнна і ніяк.

З дзясятак гадоў таму, прыязджаючы своеасаблівай этнаграфічнай экспедыцыяй на Тураўшчыну, мы, не маючы кантактаў, з налёту не маглі знайсці нікога з носьбітаў аўтэнтычнага спеву. Падышлі да аднаго з тамтэйшых дамоў культуры: дзень працоўны, установа закрытая. Усё ж такі адшукалі дырэктара — ва ўласнай цяпліцы. Пытаем: "Дзе, хто?" — "А няма іх, памерлі старыя" — "Можа, у вас засталіся нейкія матэрыялы?" — "Якія матэрыялы? Мне канцэрт да 7 лістапада трэба рабіць, да дыскатэкі рыхтавацца…" Вось такое было, у асноўным, стаўленне да свайго роднага фальклору.

Цяпер сітуацыя змяняецца ў лепшы бок. Дзяржаўныя органы, вядома, працэсам кіруюць, але ініцыятыва збольшага ідзе ад людзей, якія жывуць на дадзенай тэрыторыі, што радуе. У іх — ва ўнуках ды ўнучках тых памерлых старых — прачнуўся голад па культурнай спадчыне сваёй краіны. Прычым, хутчэй, па культурнай, чым па гістарычнай. Іх цікавіць, скажам, не Вялікае Княства Літоўскае наогул, а рэчы канкрэтныя — хто яны самі, адкуль, на якой мове размаўляюць, якія песні ды абрады перадалі ім продкі? Беларусы — гэта нацыянальны сялянскі "праект", мы ўсе выйшлі з той культуры, каго ні вазьмі з класікаў літаратуры, дык амаль усе яны з глыбінкі. На жаль, такая "падпорка" з кожным годам абсыпаецца з прычыны фізічнага сыходу людзей — бабулек ды дзядуляў.

Нельга сказаць, каб гэта мінулае ў Савецкім Саюзе альбо суверэннай Беларусі не спрабавалі ды не спрабуюць захаваць: нашы архівы ды фонды ўтрымліваюць вялізныя аб'ёмы інфармацыі, здабытай экспедыцыямі этнографаў. Але справа ў тым, што, напрыклад, пры савецкай уладзе пасля таго, як звесткі перадаваліся ў адпаведныя навуковыя ўстановы, яе там сартавалі пэўным чынам: тое пасуе беларускай культуры, іншае — не. І ў такім выглядзе фальклор "спускаўся" ў дзіцячыя садкі, школы, інстытуты, клубы. Тыя, хто нёс гэтую "выцінку" ў масы — настаўнікі ды работнікі культуры, сапраўдныя, якія памяталі традыцыі, што слухалі ў вёсках, адкуль яны родам, песні бабуль, станавіліся закладнікамі сістэмы.

Ад гэтай абыякавасці да сваіх каранёў ва ўсёй іх разнастайнасці беларусы цяпер вызваляюцца. Шляхам і далучэння да невялікіх фэстаў ды святаў народнай культуры. Я сам уключаны ў рух — у фальклорны перш за ўсё, у народную культуру не перапрацаваную, а ў сапраўдную, у яе разнастайнасць, у дыялекты. Ганаруся, што маю дачыненне да фестывалю "Юр'евска гостына" Ніны ды Пятра Главацкіх у Кобрынскім раёне. Ён папулярызуе палескія традыцыі. Адзначу фестываль "Палескія сустрэчы" ў Любані, "Таночак" у аграгарадку "Бездзеж", у Моталі, акрамя ўжо раскручанага кулінарнага фэсту "Мотальскія прысмакі" яшчэ нешта з'яўляецца. Ужо даруйце за "рэкламу" палескага краю, ды люблю я яго. Так што на лакальнае фестывальнае жыццё, на яго развіццё я гляджу з аптымізмам.

"Кнігалаўка" на цвіках.

Занатаваў Алег КЛІМАЎ

Каб "Ваў!" паўтаралася…

Ганна СЕВЯРЫНЕЦ,
журналіст, выкладчык, літаратуразнаўца, ініцыятар праекта "Чытаем сваё. Класіка"

Я бачу праблему: зараз дзеці не шмат чытаюць беларускага, не шмат чытаюць класічнага.

Моладзь не разумее тых ключоў, якія натуральныя для пакалення, узгадаванага на вядомых усім літаратурных творах. Дзеці не разумеюць нас, не разумеюць свайго нацыянальнага падмурку.

Наша найпершая мэта — рыхтаваць сапраўдных чытачоў. "Чытаем сваё. Класіка" два гады таму мы задумалі з малодшым навуковым супрацоўнікам Літаратурнага музея Петруся Броўкі Таццянай Ткачовай. Разумею, што наш праект — кропля ў моры! Мы не перавернем ім свет, але вельмі хочацца, каб падобных імпрэз было шмат і не толькі ў сталіцы. Як кажа паэт і перакладчык Міхась Скобла, жатва багатая, ды жнэцоў не стае…

Добра памятаю сваё адчуванне ад беларускай літаратуры ў школьныя гады: сумна, маркотна, усё пра лапці і гаротны лёс… Я — настаўнік рускай мовы і літаратуры, але часам даводзіцца замяняць настаўнікаў-беларусазнаўцаў. Са шкадаваннем зазначаю ў сённяшніх школьнікаў журботна знаёмыя эмоцыі… Я прыходжу ў той самы клас, дзе вяла свой прадмет, толькі вочы маіх вучняў ужо ў тумане, бо ім сумна ад кніг нацыянальных аўтараў. Здаецца, і праграма па айчыннай літаратуры добра складзеная… Я імкнуся зразумець прычыны гэтай з'явы.

Верагодна, тое пачынаецца з нейкіх першых крокаў. Таму нам з Таццянай захацелася паспрабаваць зрабіць кожную сустрэчу з іскрай цікавасці да пісьменніка. Падобных размоў не так шмат — раз на месяц. Сваёй асноўнай аўдыторыяй мы бачым школьнікаў, студэнтаў — маладых людзей, у якіх яшчэ ёсць час і жаданне чытаць. Зараз мы адкрытыя для ўсіх. Радуюся, што склалася і кола наведвальнікаў сталага веку: яны прыходзяць, бо ім цікава, пасля шмат з намі размаўляюць. Я ведаю іх пайменна, нярэдка ў час гутаркі адрасую пытанні ім.

Кожны раз шукаем адметных спецыяльных гасцей. Звяртаемся да кампетэнтных людзей, якіх мне самой было б цікава распытаць. Калі размаўлялі пра Уладзіміра Караткевіча, то запрашалі даследчыка яго жыцця і творчасці Дзяніса Марціновіча. Падчас размовы пра Купалу хацелася пачуць названыя ў творах Песняра інструменты, таму паклікалі Яраша Малішэўскага, які чароўна грае на ліры.

Пасля яскравых абмеркаванняў вельмі хочацца, каб тыя, хто прысутнічаў у зале, кінуліся шукаць кнігі героя падзеі. Што да мяне, дык я сапраўды бягу чытаць! Аднак не ведаю, як гэта адбываецца ў іншых, бо, на жаль, другі раз многіх не бачым… Адчуваю: нам не стае зваротнай сувязі.

Была ў нас сустрэча па Быкаву. Па заканчэнні да мяне падыйшлі дзве дзяўчынкі. А я, як настаўнік, ведаю, што ўрок атрымаўся тады, калі да цябе звярнуліся на перапынку. І вось тыя дзяўчынкі з хваляваннем зазначаюць: "Ваў! Мы не думалі, што Быкаў такі! Калі да вас прыйсці яшчэ?" Шкада, але праз месяц я іх не пабачыла… Зразумела, гэта ж дзеці, іх трэба трымаць, а на такія мерапрыемствы іх мусяць натхняць настаўнікі. Пакуль мы не дасягнулі мэты. Неяк не атрымліваецца захапіць дзяцей і зрабіць з іх беларускаарыентаваных чытачоў. Таму ўжо зараз разумеем, што напэўна трэці сезон будзем рабіць па-іншаму. Марым ажыццявіць такую сістэму: выбраць трычатыры класы і працаваць ужо з імі ўвесь год. Мне вельмі хочацца працягу размовы. Так прасцей пабачыць, ці не марныя нашы запал і дзейнасць.

Занатавала Настасся ПАНКРАТАВА

Дзяжурны па нумары

Цвікі ў целе

Я прызвычаілася сустракаць у самых нечаканых месцах паліцы з буккросінгам. Пабачыўшы некалькі стосаў выданняў ля ліфта ў "Маскоўска-венскім" гандлёвым цэнтры сталіцы, пачала праглядаць карэньчыкі. Нават рукі працягнула да "У вайны не жаночае аблічча" (дакументалістыку айчыннага нобелеўскага лаўрэата Святланы Алексіевіч зараз многія перачытваюць), ды ўзяць не магла, бо яна была... насаджана на цвік! Аказваецца, перада мной — лаўка для пакупнікоў, з чыёйсьці дзікай ідэі зробленая з кніг…

Настасся ПАНКРАТАВА

Магчыма, я вельмі старамодная. Расла ў часы, калі кнігі былі жудасным дэфіцытам, а дзеля патрэбнага томіка неабходна было ўзяць "у нагрузку", як кажуць, аўтара трэцяга гатунку. Кожныя гастролі ў новым горадзе пачыналіся з таго, што бацькі-тэатралы кідаліся па кніжных крамах і камісіёнках (у малых гарадах Савецкага Саюза і на цэнтральных паліцах можна было знайсці тое, што ў сталіцы знікала ці не да выхаду са складоў).

Мая сяброўка распавядала, як у бясконцыя дні сваіх дзіцячых хвароб яна гадзінамі разглядвала кнігі з ілюстрацыямі Віктара Чыжыкава і прыдумляла гісторыі па малюнках Пітэра Брэйгеля. Не забудуся, як плакала маці, калі бабуля ненаўмысна выкінула так цяжка здабыты збор літаратурна-мастацкіх часопісаў "Новый мир". Памятаю, як у 1990-я, каб было за што жыць, бацькі з болем здавалі ў камісіёнку самыя каштоўныя найменні, а я ўпотай бегала ў тую краму і нашэптвала роднаму альбому Антуана Вато з надарванай вокладкай, што ён толькі мой і ніхто яго не набудзе…

Часам кнігі выкарыстоўваліся не па прызначэнні. У дзяцінстве я рабіла з іх пакойчыкі для цацак, высоўваючы на паліцы томікі ў патрэбнай мне заканамернасці. Неаднаразова стосы фаліянтаў станавіліся прэсам. А аднойчы настаўнік загадаў нам нарыхтаваць лісце, сказаўшы, што лепш за ўсё сушыць яго ў кнігах. Пад расправу патрапіла факсімільнае выданне Пальмера Кокса "Дзіўныя прыгоды і вандраванні лясных чалавечкаў" (тое самае, з якога Мікалай Носаў пазней "запазычыў" фабулу сваёй кнігі пра Нязнайку). Да гэтай пары не магу без пачуцця віны браць у рукі кнігу, якая ад недарэчнай вільгаці пайшла хвалямі…

Тады я адчула, што ў адказе за выданні, якія былі мне і асветай, і лекамі. Узяўшы на ўзбраенне папулярную тады песеньку "Кожнай старонцы трэба лячыцца ў кніжнай бальніцы", майстравала і размалёўвала згубленыя ў часы шматлікіх пераездаў вокладкі, клеіла з каляровага кардону парваныя карашкі. Дарэчы, і сёння ўжо разам са сваімі дзецьмі перыядычна ладжу такія "бальнічныя дні". І бачылі б вы з якім гонарам старэйшы распавядае пасля ў садку, як ён з сям'ёй рамантаваў хатнія (а заадно і ўзятыя з бібліятэкі) кнігі!

А зараз перада мной лаўка, збітая з кніг… Відаць, аўтару гэтага "тварэння" бібліятэка патрапіла ў спадчыну: тут класічны "джэнтльмэнскі набор" інтэлегенцыі. Па назвах можна прачытаць жыццё не аднаго пакалення. Вось першыя крокі з казкамі пра жывёл Рэдзьярда Кіплінга, потым падлеткавы максімалізм у кампаніі герояў Фенімора Купера ды Вальтара Скота, хлюпанне носам з Дзінкай, што развітвалася з дзяцінствам. А там прыйдзе чарга пафіласофствацаць з Уільямам Фолкнерам, паспрачацца з Міхаілам Шолахавым, узважыць свае ўчынкі з Іванам Шамякіным.

Прыйдзе… толькі не да таго, хто разглядае "Хатынскую аповесць" Алеся Адамовіча ў якасці падпоркі для спіны, а для "Белага адзення" Уладзіміра Дудзінцава і "Жыцця і лёсу" Васіля Гросмана знаходзіць прызначэнне толькі ў якасці сядушкі падчас марафону па шопінг-цэнтру…

К

Тактыка культурнага развіцця

Урокі Мухарынскай

Пры падтрымцы Міністэрства культуры краіны ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі адбыліся Міжнародныя навуковыя чытанні, прымеркаваныя да 110-годдзя знанага этнографа і мастацтвазнаўцы Лідзіі Мухарынскай, і Міжнародны фестываль этнакультур.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Конкурс у рамках фестывалю — справа звыклая. А фестываль, ды ў рамках… канферэнцыі? Спачатку было слова: чытанні прайшлі сёлета ў 25-ы раз. А далучаны да іх Міжнародны этнафэст — толькі ў сёмы. Але сінтэз слова і музыкі (іначай кажучы, навукі і практыкі) рыхтаваўся на Чытаннях спакваля. Спачатку былі гэткія музычныя "прывітанні", "кава-паўзы", потым яны перараслі ў музычныя інтэрмедыі і нават цыкл канцэртаў. Нарэшце, узнік фестываль. Захаваліся і іншыя карысныя "дадаткі": майстар-класы, лекцыі, выстаўкі.

Цягам фестывальных дзён можна было разважаць над выставай скульптур. І звярнуць увагу на тое, як спалучаюцца беларускія і армянскія традыцыі ў працах Рыпсімэ Геваркян, як Анастасія Слуцкая становіцца падобнай да старадаўніх усходніх ваяроў. Ці як традыцыі спляталіся ў выступленні ансамбля "Эрэбуні" Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур (кіраўнік — Рузана Аванесян). І хаця ў лекцыі "Сучаснае музычнае мастацтва Арменіі" Нарынэ Авецісян сцвярджала, што "ў сучасных творах вельмі цяжка меркаваць пра нацыянальныя карані", мы іх пачулі ў паказаных ёй аўдыя- і відэафрагментах.

Фольк-гурт "Кампанія Януша Прусіноўскага" дазволіў правесці параўнанні з польскім джазам, які часта бывае блізкі да шапэнаўска-імпрэсіяністцкіх гучанняў. Януш і яго музыканты гралі народныя мелодыі, але ў манеры імправізацыі "тут і зараз". А назаўтра, праводзячы майстар-клас, прымусілі студэнтаў і прафесуру вадзіць карагоды, скакаць у абрадавых дзеях, на практыцы спасцігаючы асаблівасці польскай народнай творчасці.

У канцэртных праграмах выступалі і аўтэнтычныя выканаўцы з Магілёўшчыны ды Брэстчыны, і сталічны аматарскі гурт "Кудмень", які аднаўляе мужчынскія палескія спевы (кіраўнік — Ірына Мазюк). На выставе Мар'яна Скрамблевіча з Гродзеншчыны можна было падзівіцца, як "размаўлялі" ў яго руках вырабленыя ім народныя музычныя інструменты. А ў фінальным канцэрце — паслухаць, якія фарбы знайшлі ў народных інструментах выкладчыкі і студэнты кафедры кампазіцыі: ад прызнаных Галіны Гарэлавай, Віктара Войцікa, Уладзіміра Каральчука да маладых Андрэя Цалко, Вячаслава Пяцько і іншых.

За тры дні па некалькіх секцыйных пасяджэннях раскідалася амаль сотня дакладаў. Яшчэ больш за тры дзясяткі змясціла студэнцкая канферэнцыя. Сярод надзвычай разнастайных тэм былі і спробы новага асэнсавання дзейнасці Уладзіміра Мулявіна (у прыватнасці, кандыдат мастацтвазнаўства, старшы навуковы супрацоўнік НАН Беларусі Тамара Варфаламеева падкрэсліла ягоны падыход да сялянскага фальклору скрозь прызму гарадской культуры), і, як заўжды, усё новыя і новыя ўспаміны пра Лідзію Мухарынскую. Галіна Сізко, старшы навуковы супрацоўнік Музея-запаведніка Пятра Чайкоўскага ў Кліне (Расія), падзялілася тайнай, якую адкрылі ёй калісьці бацькі — калегі і блізкія сябры Лідзіі Саўлаўны. Мухарынская і сапраўды паходзіла са старадаўняга роду грузінскай інтэлігенцыі — Мухрані, але нарадзілася… у Вене, таму так добра ведала нямецкую мову.

Што ж да ідэй Мухарынскай, дык ёй удалося, бадай, недасягальнае: змясціць у коле сваіх інтарэсаў не толькі этнамузыкалогію, але і прафесійную музычную культуру — ад беларускай да сусветнай. А яшчэ — "прайсціся" па ўсіх стагоддзях ды эпохах. І ў часы, калі паводле ідэалагічных раскладаў "прафесійная беларуская музыка пачалася з 1917 года", надрукаваць у часопісе "Нёман" артыкул "Неразгаданыя таямніцы" — пра айчынную музычную культуру XVII стагоддзя. Так што "ўрокі Мухарынскай" працягваюцца.

К

Масавікі-забаўнікі? Так! Але…

Рэцэпты ад "шэф-кухара" ельскай культуры: ці застанецца сяло, "вёскаўтрымліваючыя" спецыялісты і спроба адказу на пытанне "Куды мы коцімся?"

Валерый Гейхман. / Фота Яўгена РАГІНА

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Памятаю, калісьці работнікаў культуры называлі час ад часу "пенсіянерамі", бо, маўляў, нічога сур'ёзнага яны не робяць. Цяпер так не кажуць, бо мы адказваем не толькі за сваю непасрэдную працу. Заўжды ідзём насустрач сельсаветам — добраўпарадкоўваем тэрыторыю, даглядаем за помнікамі, сельскагаспадарчым арганізацыям — бульбу перабіраем, да прыкладу. І гэта натуральна! Калі не будзеш дапамагаць камусьці, хто дапаможа табе?

— Давайце згадаем вашы першыя крокі ў прафесіі. Хтосьці вёў за руку?

— За савецкім часам існавала настаўніцтва. Але не прыносіла яно асаблівага плёну, калі малады чалавек сам не хацеў хутчэй паказаць сябе са станоўчага боку. Ды і вучыць трэба ўмець… Цяпер, калі я аналізую сваю дзейнасць, калі даводзіцца рыхтаваць досыць маштабныя мерапрыемствы, іншым разам дазваляю сабе і паганарыцца тым, што атрымліваецца. Творчы калектыў (ад вядучага да рэжысёра) у нас даўно ўжо склаўся, я магу і не ўмешвацца ў ягоныя дзеянні. І калі прымаеш вось такі гатовы прадукт, дык грэе душу тое, што ў свой час прапанаваў калегам адзіна правільны рэцэпт культурнай "стравы"… Вельмі радуюся, што здолеў навучыць тых маладых спецыялістаў, якія ў нашай культуры па дзесяць — пятнаццаць гадоў ужо адпрацавалі. А колькі давялося ўгаворваць асобных стаць завочнікамі Універсітэта культуры і мастацтваў. У нас і цяпер вучыцца вельмі шмат людзей.

— Па чым вызначаеце якасць мерапрыемства?

— Па дакладнасці спалучэння ягоных складнікаў. (Выканальніцкае майстэрства самадзейных артыстаў пад увагу не бяром — яно не выклікае сумненняў.) Скажам, дзея на сцэне адна, а на экране слайд-паказ зусім іншы. Быў такі ляп у маёй практыцы. Альбо вядучы канцэрта спазніўся з падводкай нумара. Таму даводзіцца пастаянна хвалявацца і за ўсім сачыць. Кожная хвіліна павінна быць пралічаная. Урэшце, калі шэф-кухар далёка ад варыўні, пірог не такі смачны атрымліваецца. Так заўжды было і будзе.

— Давайце цяпер пра "як было" і "як ёсць". Лепей было тады ці цяпер?

— Гаворка пра тры эпохі: савецкую, "перабудовачную" і сённяшнюю. За савецкім часам гаворка пра недастатковае фінансаванне не ішла. Я на базе атрымліваў камплект імпартнай апаратуры, а ў нагрузку мне баяны, духавыя інструменты давалі. Будавалі клубы-гаргары, асабліва пасля чарнобыльскай бяды. Сродкі ніхто не лічыў і будучую сітуацыю не пралічваў. А будавалі калгасы, кожны навыперадкі хацеў паказаць, што ён лепшы. І па сёння з гэтымі гмахамі не можам разабрацца… У 1990-я разлад усеагульны распачаўся: у клубах размарозілі кацельні, спынілася фінансаванне. Але самадзейнасць, хоць і хісталася, а не знікала. Мяняўся менталітэт людзей. Раней, скажам, хары на энтузіязме дзейнічалі, а потым спевакі пачалі сутачныя патрабаваць. Мне і цяпер незразумела, чаму спартсменам-аматарам, да прыкладу, падчас спаборніцтваў нават талоны на харчаванне выдаюцца, а ад нашых артыстаў патрабуюць ранейшага энтузіязму, на выязных канцэртах — ніякіх сутачных. Мы ездзім у Расію, Польшчу за свой кошт. Словам, удасканаленне прававой базы культуры заўжды было і застаецца адным з актуальных пытанняў…

— Ну а трэцяя эпоха калі для вас распачалася?

— З 2005 года, з Дзяржпраграмы адраджэння сяла. Упершыню пра неабходнасць стварэння на Беларусі аграгарадкоў Прэзідэнт краіны выказаўся падчас знаходжання менавіта ў нашым раёне… Мы напоўніцу выкарысталі магчымасці гэтай Дзяржпраграмы. Цяпер у нас у кожным сельскім доме культуры — камп'ютары, якепская апаратура. Гэта стала падзеяй для нашага сяла.

— Яно застанецца?

— Застануцца аграгарадкі.

— Хто апошнім павінен сыходзіць з неперспектыўнай вёскі, яе стараста ці яе бібліятэкар?

— Бібліятэкар. Ён будзе прыязджаць сюды на бібліобусе, пакуль у гэтым паселішчы не знікне апошні чытач.

— Культура можа спыніць адток вясковай моладзі ў гарады?

— Калі ў вёсцы няма працы, ніякая культура не дапаможа. Так, вучні агульнаадукацыйных школ паступаюць вучыцца далей і ў вёску ўжо не вяртаюцца. Але не ўсё так змрочна. У раёне шмат маладых работнікаў культуры. У Кочышчах — дзве дзяўчыны, якія пасля двухгадовай адпрацоўкі засталіся на пасадах. У Скародным працуе дзяўчына з Зашыр'я, мае жытло. Спецыяльна для яе адкрылі летась клас баяна. А клас цымбал там з'явіўся пасля таго, як маладая настаўніца з Ельска пагадзілася ездзіць у Скароднае. Нават паспявае да вучняў у суседнюю вёску патрапіць… Я такія кадры называю "вёскаўтрымліваючымі".

— Вобраз работніка культуры ці не пастаянна атаясамліваецца з гэткім масавіком-забаўнікам, які адказвае толькі за адпачынак людзей…

— І я з гэтым цалкам пагаджаюся. Няхай хоць блазнамі нас называюць! Блазен, як вядома, быў не апошнім у свіце караля. А яго менавіта світа робіць. Інакш кажучы, блазен адначасова і смяшыў і выхоўваў… Калі ж сур'ёзна, дык спажывец культуры чакае ад нас менавіта якаснага адпачынку. Але адпачынак адпачынку — розніца. Мы павінны любым рухам сваім выхоўваць, спакваля, незаўважна, ненавязліва. На чым выхоўваць? На нашай нацыянальнай традыцыі, на беларускай мове, на танцах і песнях. Беларуская ідэалогія — у нацыянальнай культуры.

— Яна не знікне пад уплывам з аднаго боку — Расіі, з другога — Еўропы?

— Работнікі культуры для таго і існуюць, каб не знікла. Як ні спрабавалі цягам стагоддзяў вынішчыць наша спрадвечнае, а яно застаецца насуперак усяму. Ці сустрэнеце вы ў Расіі такія замкі, як у нас? Ці можа пахваліцца тая ж Амерыка адметнымі нацыянальнымі стравамі? А ў нас яны ў кожнай вёсцы розныя. Беларусь, да таго ж, можна назваць фестывальнай краінай. Адна толькі "Берагіня" чаго вартая! А "Залатая пчолка"? На ельскі фестываль гарманістаў прыязджаюць музыканты з замежжа. Вельмі шмат фэстаў дзіцячай творчасці. Вось вам і адказ на пытанне. Ёсць традыцыя, ёсць яе пераемнікі. Няма за што перажываць!

— Вы кажаце, застануцца аграгарадкі. Як павінна развівацца там культура пры адсутнасці належнага фінансавання?

— У нас цудоўны прыклад маецца: Зашырскі культурна-спартыўны цэнтр, якім кіруе Яўгенія Шадрына. Пры падтрымцы мясцовых уладаў тут, лічы, вуліца рамёстваў з'явілася. Калі ісці па ёй ды ў акенцы заглядваць, дык і каваля можна пабачыць, і ганчара… Я што маю на ўвазе? Людзей неабходна здзіўляць. І не толькі народнай творчасцю, але і паўнавартаснымі культурна-масавымі мерапрыемствамі… Так, камп'ютары ў бібліятэках ужо састарэлі, мяняць іх трэба. Шчыра скажу: некалькі разоў спрабавалі займець гранты. Не заўжды гэта атрымліваецца. Ды пракладу, фінансаванне ПРААН атрымалі на стварэнне цэнтра доступу да інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Дапамог праект "Развіццё міжнароднай і інфармацыйнай сеткі па Чарнобылю". Разумею, што трэба далей рухацца ў напрамку грантатворчасці. Але справа — вельмі няпростая. Тут нам трэба вучыцца і вучыцца. Аднак іншага выйсця няма. У Расіі, да прыкладу, фінансаванне культуры ажыццяўляецца толькі пад канкрэтныя творчыя праекты. Я проста перакананы, што эканамічныя форумы, што звычайна ладзяцца ў Гомелі, трэба рабіць выязнымі, каб інвестары на ўласныя вочы пераконваліся ў прывабнасці нашых прапаноў. А ў нас ёсць, скажам, этнаграфічны маршрут, дзе ўвязаны магчымасці нашых самадзейных калектываў, майстроў-рамеснікаў і гаспадароў аграсядзіб, які можна развіваць бясконца.

— Ельск вядомы яшчэ і рэгіянальным фестывалем "Грай, гармонік!" Інструмент, як вядома, папулярны ў славян, але па нашых СМІ пра гэта і не скажаш. Мо і ў ДШМ скарачаецца колькасць тых, хто жадае навучыцца граць на акардыёне і баяне? Ці патрэбна тут медыйная рэклама? Альбо баян — інструмент фестывальны, нават сакральны?

— Ідэя фестывалю прыйшла ў 1991 годзе. Памятаеце расійскую праграму Генадзя Завалокіна? Падумалі, а чым мы горшыя. Спачатку быў фэст раённы. Вызначыліся з сіламі. Іх хапіла для фестывалю рэгіянальнага з удзелам дзвюх соцень выканаўцаў. Узняўся такі пласт народнага мастацтва! Значна павялічылася і доля дзіцячага ўдзелу. Так што нам рэклама не надта патрэбная, на Ельшчыне гармонік быў, ёсць і будзе… Што ж тычыцца ДШМ, у нас 20-працэнтны ахоп навучэнцаў агульнаадукацыйных школ.

— Паказчык большы за абласны. Якім чынам яго дасягнулі?

— Трымаем сітуацыю пад кантролем. Конкурс — строгі, набор — якасны, выпуск — таксама. Пазалетась ДШМ заняла першае месца на Гомельшчыне па паступальнасці. Словам, вучыцца стала прэстыжна. У нас ёсць дзіцячы і дарослы камерныя аркестры, ансамбль народных інструментаў, духавы калектыў. Усе яны маюць званні, свайго слухача. А "Грай, гармонік!" стаў брэндам раёна. З баяністамі ж на сяле няма ніякага дэфіцыту.

— Выканальніцкае майстэрства фальклорнага калектыву Казлоўскага клуба прызнана гісторыка-культурнай каштоўнасцю Беларусі. Ці ёсць у вёсцы моладзь, гатовая пераняць гэтую традыцыю?

— Многія ялучане вучацца ва ўстановах, дзе ў заўсёднай пашане фальклор. І ўсе яны не мі-

наюць Казлоўскі клуб, бо пішуць рэфераты, рыхтуюць курсавыя, дыпломныя працы. Гэта адзін аспект. Другі ў тым, што нашы іншыя ансамблі апрацоўваюць і выконваюць песні па-казлоўску. Манера выканання — бурбонная: менавіта такія гукі чуюцца пры спеве. Усё ёсць на дысках, якія і ў замежнікаў карыстаюцца попытам.

— Пасля катастрофы на ЧАЭС з карты Ельшчыны знікла сем населеных пунктаў. Ці былі ў гэтых вёсках арыгінальныя народныя рамёствы? Што было зроблена для іх адраджэння?

— У цэнтральнай раённай бібліятэцы сабрана і ў асобнай зале выстаўлена больш за трыста экспанатаў: фрагменты нацыянальнага касцюма, ручнікі, фартухі, посцілкі, накідкі з адселеных вёсак. І калекцыя пастаянна папаўняецца, бо папулярнасць імправізаванага бібліятэчнага музея расце, а людзі, прыязджаючы на Радуніцу, штосьці абавязкова ахвяруюць бібліятэцы. Экспазіцыя адкрылася пяць гадоў таму. А ў вёсцы Шышкі было развіта ганчарства, нават цэх адпаведны працаваў. У Славечне цяпер працуе музейчык, дзе сабрана калекцыя мясцовай керамікі. У Зашыр'і таксама прэзентуюцца творы рамеснікаў, якіх ужо няма з намі. У нашым краязнаўчым музеі прадстаўлена ткацтва.

— Асобныя "канапныя" аналітыкі перакананы, што рэгіянальная культура сёння — у заняпадзе. Ваша меркаванне на гэты конт?

— Я спачатку адзін факт згадаю: дзесьці ў 1970-я ладзіўся першы Усесаюзны фестываль народнай творчасці. У кожным паселішчы быў харавы калектыў, процьма танцавальных і вакальных. Іх касцяк на сяле складала, натуральна, інтэлігенцыя. Сёння яе амаль няма. У многія сельскія школы прывозяць настаўнікаў з Ельска, бо так выгадна рабіць. Цяпер колькасны склад творчых калектываў — на парадак меншы. Падаецца, можна казаць пра нейкі заняпад. Але… Мы цяпер не колькасцю ансамбляў бяром, а якасцю іх выканання. Іншым разам нават прафесіяналы адстаюць ад аматараў. А вось колькасць фестываляў істотна павялічылася. І, паўтаруся, у мастацкай самадзейнасці стала больш дзяцей. Самі мяркуйце, заняпад гэта ці не.

— А такія работнікі культуры, як Яўгенія Шадрына з Зашыр'я, адчуваюць на ўласным кашальку, што яны — адны з лепшых у раёне?

— Стараемся нікога не пакрыўдзіць. Сродкі бяром і з пазабюджэту.

— Каб магчымасць была, што б вы ўдасканалілі ў «пазабюджэтнай» бухгалтэрыі?

— Зменшыў бы памеры камунальных паслуг. У Дабрынінскім культурна-спартыўным цэнтры займаецца дзіцячая секцыя прафсаюзаў (хочацца, каб спартыўная зала заставалася запоўненай), я з яе камуналку браць не маю права. Але ж свет узімку паліцца, і плаціць за яго аддзел. Прафсаюзная спартыўная школа і наш культурны цэнтр — не на роўных умовах. Гаворка зноў пра заканадаўчую базу. І не менш істотнае яшчэ вось што. Пры складанні планаў па аказанні платных паслуг насельніцтву ніхто чамусьці не ўлічвае аптымізацыю ў галіне культуры ды дэмаграфічную сітуацыю, якая не надта паляпшаецца. Як зарабіць пры гэтым грошы? Выйсце, відаць, толькі ў пошуку новых форм працы.

— Ваша стаўленне да аптымізацыі?

— Мы, напэўна, адзіны раён, які да мінулага года амаль нічога не зачыніў. А летась давялося закрыць пяць устаноў культуры. Мімаволі згадваю часіны, калі на сяле бібліятэкі і клубы знаходзіліся на балансе сельсаветаў. Чаму? У Новай Рудні, да прыкладу, мы яшчэ не паспелі знесці свой будынак, там ёсць дзе сабрацца людзям з любой нагоды. Ну, скажам, калі канцэрт да іх прыехаў ці раённае кіраўніцтва. У іншых выпадках вяскоўцы змушаны збірацца ля крамы, дзе і паветкі няма, і святла. А калі крамы ўжо няма? І ад дажджу не схаваешся… Я б зачыненыя ўстановы культуры перадаваў на баланс сельскіх саветаў. Гэта было б па-гаспадарску.

— Не баіцеся пераступіць рысу, якая аддзяляе культуру ад камерцыі?

— Мы яе пераступілі ўжо. І я не лічу, што адбылося штосьці кепскае. У нас ёсць, да прыкладу, ліцэнзія на перавозкі. Для таго, каб зарабіць, набіраем групу і вязём яе ў Жыровічы. Гэта што, не камерцыя? Ці ў аддзеле выпісваецца аўтобус або замаўляецца тамада на вяселле. У нас увогуле шмат платных паслуг.

— Калі развіваць вашу думку, праз пару гадоў установы культуры павінны будуць змагацца за самаакупнасць?

— Усё правільна. Прынамсі, да гэтага трэба імкнуцца. Глядзіце, знізіліся датацыі кінавідэапрадпрыемстваў, значыць ім давядзецца станавіцца больш самастойнымі ў фінансавым плане… Калі дырэктару СДК патрэбны тры мікрафоны агульным коштам у тры мільёны, ён іх зарабляе, а мы — купляем. Іншага выйсця няма. Пастаянна даводзіцца чуць, што наша насельніцтва — неплацёжаздольнае. Як? Вунь хлопец піва п'е ды курыць (гэта 60 тысяч прыкладна), значыць і на білет грошы мае.

— Што з савецкага часу вы вярнулі б? Дабрыню чалавечых зносін, з якой мы гаворку пачалі?

— Сістэму кіравання. А гэта не толькі фінансаванне. Калісьці не было метадычных цэнтраў. Хапала абласнога ці рэспубліканскага дома народнай творчасці, які завальваў раёны сцэнарыямі. Было ўсесаюзнае выданне "Культурна-асветніцкая работа", дзе акамуляваўся метадычны досвед неабсяжнай калісьці краіны. А цяпер мы не ведаем у поўнай меры, што ў культуры, напрыклад, Брэстчыны робіцца, ніяк са штатным раскладам разабрацца не можам. І такое ўражанне, што сітуацыя не зменіцца ніколі.

— У Ельскім раёне пражывае больш за 15 тысяч чалавек. Дзевяць тысяч знаходзяцца ў групе пра Ельск у вядомай сацыяльнай сетцы. Ці выкарыстоўваеце вы яе для зваротнай сувязі па пытаннях культуры?

— Выкарыстоўваем. Анонсы канцэртаў пастаянна даем у "Аднакласніках". Вельмі шмат абмеркаванняў па выніках нашых мерапрыемстваў. Нашы спецыялісты прысутнічаюць пастаянна і "Вконтакте".

— Якім чынам вызначаеце якасць мастацкіх твораў, якасць работы вашых устаноў культуры?

— Чатыры салісткі з Санюкоў на сцэне спяваюць так, як мама вучыла і як самі ўмеюць спяваць. І на той жа сцэне выступае сталічная зорка. Як ацаніць якасць іх выканання? Крытэрыі розныя. Чысціня голасу, правільнае дыханне — гэта не пра нашых кабет, якія займаюцца фальклорам. Галоўны крытэрый тут — шчырасць. Таму тыя салісткі ў параўнанні з высокімі, падавалася б, прафесіяналамі, збіраюць часам большыя залы. Цяпер — пра клубы і бібліятэкі. Я казаў, што працуе тут каманда. Але на адным якасным мерапрыемстве можа быць аншлаг, на другім, не менш якасным, — лічаныя дзясяткі, нават у ГДК. Тут справа ў тым, што мы недапрацоўваем у плане маркетынгавых даследаванняў. Не ведаем часам, якой аўдыторыі што патрэбна. Не робім рэкламу адраснай. Не прагназуем сітуацыю на заўтра, пасляўзаўтра. Нават калі гаворка пра бясплатныя акцыі. І гэта, падаецца, хіб не толькі нашага раёна. А гледача трэба было моцна ў руках трымаць. А сёння яго вярнуць неймаверна цяжка. Ёсць, безумоўна, бяспройгрышныя рэцэпты. Дапусцім, у канцэрце бяруць удзел толькі дзеці. На мерапрыемства з ахвотай ідуць мама, тата, бабуля, дзядуля, цёткі, дзядзькі, суседзі і сябры. Вось вам і аншлаг. Вось вам і выкананне плана… Карацей, вельмі сур'ёзнае анкетаванне неўзабаве

"Недапрацоўваем у плане маркетынгавых даследаванняў. Не ведаем часам, якой аўдыторыі што патрэбна. **Не робім рэкламу адраснай.** Не прагназуем сітуацыю. І гэта, падаецца, хіб не толькі нашага раёна. А гледача трэба было моцна ў руках трымаць. Сёння ж яго вярнуць цяжка".

"Адпачынак адпачынку — розніца. Мы павінны любым рухам сваім выхоўваць, спакваля, незаўважна, ненавязліва. **На чым выхоўваць? На нашай нацыянальнай традыцыі, на беларускай мове, на танцах і песнях.** Беларуская ідэалогія — у нацыянальнай культуры".

арганізуем на ферме ў Дабрыні, каб высветліць, што запатрабавана насельніцтвам, а што — не. Там часам па 100 — 150 чалавек на платныя канцэрты збіраюцца. І нам гэтую тэндэнцыю трэба пераўтварыць у правіла. У нашай справе ледзь што з-пад кантролю выйдзе, рады потым не даш.

— У чым будучыня прафесійнага і самадзейнага мастацтва? Куды мы ідзём?

— Яна залежыць, я перакананы, ад рэпертуарнай палітыкі. Нельга дапускаць таго, што цяпер робіцца. Не лічу сябе старамодным, бо люблю нечаканыя рашэнні, сучасныя мастацкія плыні, да прыкладу — харэаграфію. Аднак на сцэне не павінна весці рэй пошласць. Масавая культура — гэта калі дыктуем не мы, а калі дыктуюць нам. Я — не за цэнзуру, а за мастацкі адбор. Адну і тую ж сцэну можна па-рознаму ўвасобіць: брыдка і па-мастацку. І пытанне "Куды мы коцімся?" — пытанне вечнае і актуальнае ва ўсе часы. А што стрымлівае гэты негатыўны рух? Высокі густ, чытай — сапраўдная культура і мастацтва. Так што вечны бой кепскага з добрым працягваецца. У ахвяры трапляюць нашы дзеці і ўнукі.

— Ці запатрабаваная гаспадарчая група аддзела?

— Вельмі. Але ж яе неабходна камплектаваць тэхнічнымі сродкамі: грузавым транспартам, станкамі і прыстасаваннямі, чаго пастаянна бракуе. Не стае на заробак два з паловай мільёны рублёў і прафесійных будаўнікоў.

— Ці можаце назваць ельскі музей мультымедыйным комплексам?

— Пасля таго, як мы набылі мультымедыйную апаратуру, лічбавыя фотакамеру і дыктафон, магу. Але ці ў назве справа? Галоўнае, каб раённая ўстанова выхоўвала падлеткаў і моладзь. Наш краязнаўчы музей з гэтай функцыяй спраўляецца. Праз маё акно ён бачны. І сюды пастаянна прыводзяць школьнікаў з горада і раёна. А ёсць яшчэ камерцыйны маршрут "Дарогамі вайны". Возім дзяцей па Ельшчыне, паказваем помнікі і мясціны, дзе былі вёскі, спаленыя фашыстамі. Бацькі вельмі задаволеныя. Зменныя экспазіцыі пастаянна прапаноўваюць штосьці новае. Цяпер чакаем работы Міхаіла Савіцкага.

— Якой бачыце сферу беларускай культуры праз некалькі гадоў?

— На гэтае пытанне цяжка адказаць. Ведаю добра адно: нацыянальная культура — самадастатковая, яна неўміручая і будзе развівацца насуперак усяму. Мяркую, больш распаўсюджанай стане «культура на колах», нават для аграгарадоцкіх патрэб. Будзе развівацца пазабюджэтная дзейнасць. Але не абыдзецца і без дзяржаўнай падтрымкі. Сама па сабе культура добра сябе пачувае толькі ў багатых краінах з багатымі жыхарамі.

— Эканоміка культуры можа ўзмацніць эканоміку краіны?

— Калі маюцца на ўвазе грошы, што мы сёння зарабляем, дык пра істотнае ўзмацненне гаворкі не можа весціся. З дзяржаўнага бюджэту на культуру адлічваецца ад трох да васьмі працэнтаў. Нават калі мы кампенсуем гэтыя ўкладанні, ніхто з жыхароў Беларусі гэтага не заўважыць.

Пытанні задавалі Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Пётра ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Настасся ПАНКРАТАВА, Яўген РАГІН, Вольга РОПАТ, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

К

Ёсць пытанне!

Чаму "Ноч…" не для ўсіх?

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 3.)

Усё гэта так, і названая праца сапраўды робіць вялікі гонар бібліятэкарам. Ды ўсё ж шкада, што патэнцыял учарашняй "Ночы…", з бясплатнай рэкламай, якой цягам некалькіх тыдняў поўніліся сацыяльныя сеткі, медыя і нават метрапалітэн, як бачна, ніякім чынам не быў выкарыстаны сталічнымі публічнымі бібліятэкамі. А хто ведае, можа, якраз яны і аказаліся б 22 красавіка ў лідарах па наведвальнасці сярод жыхароў Мінска? Прадэманстраваць і паказаць ім сапраўды ёсць што, а нагода для гэтага, што ні кажы, была даволі сур'ёзная…

А што ў рэгіёнах?

Дырэктар Віцебскай абласной бібліятэкі імя Уладзіміра Леніна Тацяна Адамян распавяла "К", што "бібліяночы" на пастаяннай аснове ладзяцца ў Віцебскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Максіма Горкага, а таксама ў шэрагу раёнаў рэгіёна. На думку Тацяны Мікалаеўны, падобныя акцыі прыцягваюць у бібліятэкі новых наведвальнікаў, асабліва маладога веку.

З поглядам калегі згодны і іншыя кіраўнікі абласных "кніжніц". Як кажа дырэктар Брэсцкай абласной бібліятэкі імя Максіма Горкага Тамара Данілюк, "бібліяночы" даўно атрымалі сталую "прапіску" ў Жабінцы, Пінску і Маларыце. Цікавымі падобныя акцыі робяць, у першую чаргу, як лічыць Тамара Паўлаўна, тыя спецыялісты, што працуюць ва ўстановах. Так што кадравае пытанне ў названым аспекце, на яе думку, самае галоўнае.

На Гродзеншчыне Ночы бібліятэк пачалі рабіць яшчэ тры гады таму, адзначыла "К" дырэктар Абласной навуковай бібліятэкі імя Яўхіма Карскага Лідзія Мальцава, і яны карыстаюцца нязменным попытам у наведвальнікаў. Названыя акцыі за гэты час прайшлі ў Лідзе, Воранаве, Карэлічах, Шчучыне, а ў верасні адбудуцца ў Ашмянах і Берастовіцы. Лідарам у гэтай "начной" працы з'яўляецца Гродзенскі раён. Як распавяла галоўны бібліятэкар бібліятэказнаўства абласной навуковай Валянціна Жук, супрацоўнікі Сапоцкінскай гарпасялковай бібліятэкі ўжо трэці год запар ладзіць у сваёй установе "бібліяночы" пад назвай "Кніжнае бяссонне ў Сапоцкіне".

На Міншчыне "бяссонныя ночы" стала праводзяцца ў Нясвіжы і Салігорску. Прайшла падобная акцыя яшчэ на пачатку года і ў Мінскай абласной бібліятэкі імя Аляксандра Пушкіна. Як нагадала дырэктар бібліятэчнай установы Аксана Кніжнікава, у гэты вечар абраныя месцы са сваіх любімых твораў чыталі беларускія літаратары, акцёры і тэлевядучыя, адбыліся майстар-класы па рэдкіх мовах, здымцы кіно на смартфон, масавы гарадскі букросінг, паказ ролікаў-пераможцаў фестывалю "velcom Smartfilm" мінулых гадоў...

Таксама ўжо тры — чатыры гады ладзяцца падобныя мерапрыемствы і на Гомельшчыне. Прычым, як распавяла "К" дырэктар Абласной універсальнай бібліятэкі імя Уладзіміра Леніна Марына Рафеева, "бібліяночы" праходзяць напярэдадні або ў Дзень бібліятэк, які адзначаецца 15 верасня, а да акцыі актыўна далучаюцца дзіцячыя бібліятэкі рэгіёна і дзіцячыя аддзелы цэнтральных раённых бібліятэк.

І ў некаторых раёнах Магілёўшчыны "бібліяноч" "прапісалася" стала. Аднак, як лічыць дырэктар Абласной бібліятэкі імя Уладзіміра Леніна Ілона Сарокіна, падобныя акцыі наўрад ці могуць паспрыяць прыцягненню чытачоў у бібліятэкі. Ды і не ў гэтым бачыцца суразмоўцы асноўная функцыя бібліятэчных устаноў, бо "бібліяночы" — гэта ўсё ж цалкам папулярызатарскае мерапрыемства. На думку Ілоны Сарокінай, больш карыснымі для наведвальнікаў з'яўляюцца Дні адчыненых дзвярэй, якія ладзяцца ў Магілёве двойчы на год: 15 і 16 верасня ды ў сакавіку кожнага года. Пад час названых акцый ладзяцца экскурсіі па ўстанове, апавядаецца, як карыстацца каталогам і замаўляць выданні, дэманструюцца відэаролікі рознай тэматыкі ды многае іншае...

Што ж, магчыма, што і падобная форма працы з чытачамі сябе апраўдвае і мае права на існаванне. Айчынныя бібліятэкі, як бачна, сёння актыўна "ідуць у народ" і гэта, на мой погляд, самае галоўнае.

К

Барыс Звінагродскі. "Гомельскі рачны порт".

Мастыхін

"А мы Вас ведаем..."

У музеі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля прайшла выстава твораў заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Барыса Звінагродскага да 120-годдзя з дня яго нараджэння. Далёка не кожнаму чалавеку ўдаецца пакінуць свой след. А праз гады "святло далёкай зоркі" дасягае нашчадкаў, калі чалавек сапраўды быў асаблівым, зрабіў вялікі ўплыў на жыццё сваіх сучаснікаў. Ці не ў гэтым прычына ўсеагульнай павагі і доўгай памяці гамяльчан?

Сувязь з Гомелем у Барыса Фёдаравіча была непарыўнай: упершыню прыехаў у 1920-х, вярнуўся пасля вайны ў 1944-м, затым жаніцьба на гамяльчанцы Надзеі Аляксандраўне і нараджэнне доўгачаканага сына... І для нашага горада жыццёвы шлях мастака мае вялікае значэнне. Па-першае, выдатныя педагогі, такія, як Звінагродскі, спрыяюць з'яўленню таленавітых вучняў, а тыя, у сваю чаргу, перадаюць эстафету далей. Па-другое, вывучаць жыццё і творчасць лепшых мастакоў Гомельшчыны, калекцыянаваць іх творы музей Гомельскага палацава-паркавага ансамбля лічыць сваім абавязкам. У гэтым, акрамя іншых неад'емных функцый, выяўляецца яго ўдзел у культурным жыцці Беларусі. Гэтак мы імкнуліся сачыць літаральна за кожным паваротам у лёсе Барыса Звінагродскага. Але пераказваць біяграфію мастака, відаць, не мае сэнсу. Дык якім жа ён запомніўся гамяльчанам? Элегантны, заўсёды падцягнуты, з нязменным гальштукам-матыльком — яркі вобраз інтэлігента, які мае наўпростае стаўленне да мастацтва.

Сёння ў музеі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля сабрана істотная частка спадчыны мастака: каля 40 карцін, мноства фотаздымкаў, дакументаў, каталогі выстаў. У 2015-м у фонды паступіла яшчэ тры работы Звінагродскага: аўтапартрэт і два пейзажы.

Рака Сож — адзін з улюбёных "персанажаў" жывапісца. Яму ўдалося стварыць сапраўдныя пластычныя песні — пейзажы з гэтай водная артэрыяй Гомельшчыны. Яны настолькі скарылі жыхароў сваёй праўдзівасцю, што мастака называлі "спеваком Сожа". З поўнай аддачай ён пісаў навакольную прыроду, горад, людзей, сярод якіх жыў. Уважліва вывучаў натуру, старанна прадумваў і выпісваў дэталі сваіх карцін, разважаючы пры гэтым над вялікімі задачамі мастацтва. Цяпер відавочнае не толькі мастацкае, але і краязнаўчае значэнне твораў Звінагродскага.

Нядаўна музеем быў набыты партрэт мастака, напісаны Алесем Цыркуновым. На карціне Звінагродскі ў "булгакаўскай" шапачцы майстра стаіць у задумленні, адвярнуўшыся ад чыстага палатна. Падрабязна апісана абстаноўка майстэрні, скамечаны працоўны фартух кінуты на паліцу, на падваконні — кактусы розных відаў.

Знаходзячыся ўжо ў сталым узросце, Барыс Фёдаравіч распавядаў, што працуе над тэмай, якую можна апісаць так: "Дзень добры, племя маладое, незнаёмае... Галоўная думка — няўмольны рух жыцця наперад, змена старога маладым. Суцэльная сцяной стаіць стары лес... А на пярэднім плане цягнуцца да сонца, да святла тоненькія маладыя дрэўцы. Хоць іх няшмат, іх строй рэдкі, але за імі будучыня".

Дарэмна перажываў мастак за лёс рэалістычнага мастацтва! Яно па-ранейшаму ў пашане і ўяўляе з сябе аснову сучаснага жывапісу. І памяць пра гэтага чалавека, педагога, творцу працягвае жыць у нас. Хочацца з вялікай павагай прамовіць у адказ ад імя "незнаёмага племені": "Добры дзень, Барыс Фёдаравіч! А мы Вас ведаем..."

Алена КАЛУГІНА,
малодшы навуковы супрацоўнік музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля

Словы развітання

15 красавіка не стала кінааператара Уладзіміра Спарышкова, лаўрэата дзяржаўных прэмій Беларусі і СССР. "Знак бяды" і "У жніўні 44-га ..." Міхаіла Пташука, "Бацькі і дзеці" Вячаслава Нікіфарава і "Пераправа" Віктара Турава ды яшчэ дзясяткі іншых фільмаў і тэлесерыялаў, у тым ліку, ужо ў новую кінаэпоху абавязаны сваім бездакорным візуальным шэрагам менавіта гэтаму прафесіяналу. Выхаванец ВГИКаўскай школы, ён годна працягнуў традыцыі пляяды выдатных аператараў "Беларусьфільма". У складаная для айчыннага кіно часы Уладзімір Спарышкоў заставаўся верным сваёй прафесіі і быў адным з самых запатрабаваных майстроў у кінасферы на рускамоўнай прасторы.

Тэатральная плошча

Імя Францішка Аляхновіча, сёння знакавае для беларускай драматургіі, айчыннага тэатра, чвэрць стагоддзя таму было яшчэ выкрэсленым з гісторыі нашага сцэнічнага мастацтва. А ў далёкім 1926 годзе Аляхновіч працаваў першым літаратурным кіраўніком БДТ-II (цяперашняга Коласаўскага), праўда, зусім непрацяглы час, бо быў арыштаваны і рэпрэсаваны. Мусіць, сімвалічна і тое, што да спадчыны Аляхновіча звярнулася маладая актрыса тэатра, да таго ж дыпломніца рэжысёрскага аддзялення Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Ніна Обухава.

Танга з мінулым

П'еса "Цені" ставілася на Беларусі тройчы: першая пастаноўка ў БДТ-I датуецца 1921 годам, у 1995-м да яе звярнуўся Мікола Трухан у тэатры-студыі "Дзе-я?", аб'яднаўшы твор са "Страхамі жыцця" таго ж аўтара ў спектаклі "Здань". У прачытанні ж коласаўцаў п'еса Аляхновіча — не меладрама, а глыбокі метафізічны твор, блізкі да рамантычнай прыпавесці, прасякнутай роздумам пра духоўную сутнасць чалавека, яго веліч і мізэрнасць, ягоную сувязь з вечнасцю, Космасам. Невыпадкова спектакль мае крыху змененую назву "Цень думкі нашай..." Рэжысёр убачыла пэўную сувязь матэрыялу п'есы з лёсам яе аўтара. Праўда, гэтая повязь у спектаклі прасочваецца пункцірна. Скажам, у адным з эпізодаў Марыя, жонка Сцяпана, перад сваім самагубствам раптам ператвараецца ў маці Аляхновіча, якая ў роспачы звяртаецца да следчага ДПУ. Гэтая ж тэма заяўлена і ў фінале, калі лялька ў руках Матыльды трапляе ў клетку, а глядач чуе поўныя роспачы словы самога Аляхновіча, дзе ён быццам прадказвае сваю горкую долю і немагчымасць вяртання на Бацькаўшчыну. Такім чынам, праз асноўны сюжэт твора пачынае прасочвацца і другі, схаваны, а вобразы галоўных персанажаў быццам дадаткуюцца пэўнымі двайнікамі, а мо і прататыпамі. Мяркую, гэта лагічна, бо ў лёсах герояў праглядаюць аўтабіяграфічныя моманты. Так, бацька аўтара п'есы сапраўды быў прафесійным скрыпачом, а тэма трагічнага лёсу мастака, якога грамадства ператварае ў свайго роду адшчапенца, аб'ядноўвае вобразы Сцяпана і Міхася.

Сцэна са спектакля "Цені".

"Цені" без заспакаення

Прадвызначанасць лёсу чалавека становіцца галоўнай у спектаклі. Невыпадкова Андрэй Жыгур канцэптуальна запаўняе сцэнічную прастору лесвіцамі-драбінамі (шлях у вышыню, нашы рамантычныя жаданні, мроі, узнёслыя парыванні) і нацягнутымі рамянямі, якія, быццам ніці лёсу, абмяжоўваюць чалавека, робяць яго слабым, знішчаюць яго лепшыя задумы. Бязлітасны лёс увасабляецца і праз вобраз Матыльды (артыстка Ульяна Ацясава). У параўнанні з п'есай рэжысёр спектакля апускае некаторыя падрабязнасці яе мінулага (сіроцтва пры жывой маці, блуканні па чужых людзях). Для пастаноўшчыка істотна акцэнтаваць пэўны містыцызм вобразу. Перад намі не канкрэтны чалавек, зямная істота, а пэўны сімвал, накшталт здані, ценю, які ўвасабляе той самы няўмольны лёс. З яе героям спектакля, але гэтае пачуццё, жарсць, робяцца згубай для іх. Такім чынам, яна, быццам той самай лялькай, іграе іх лёсам. Цікава, што менавіта ў яе вусны ўкладае рэжысёр маналог пра сухое пажоўклае лісце, з якім яна параўноўвае слабых, бязвольных людзей (у п'есе яго прамаўляе Сцяпан).

Здольнасць спалучаць псіхалагічную дакладнасць, праўдзівасць перажыванняў з яркасцю знешняй формы ўласцівыя таленту Георгія Лойкі, які стварыў цэнтральны вобраз спектакля. Акцёр відавочна прарысоўвае тры асноўныя часткі сцэнічнага існавання свайго персанажа, тры фазы развіцця гэтага характару і яго пералому. У пачатку спектакля, калі ягоны Сцяпан з'яўляецца на добрым падпітку, адчуваеш роспач і расчараванне ад асэсавання ўласнай нікчэмнасці. Узнёслыя мары, творчы ўздым не для яго, само жыццё, асяроддзе не спрыяла гэтаму, і душа абрасла нейкай набрыдзю. Першая сустрэча з Матыльдай, у якой ён бачыць сваю ўваскрэслую Ганну, спачатку пасяляе ў яго душы нейкі страх, гэта як спатканне з нейкай зданню, ценем. Але потым адбываецца ўнутраны выбух, і магутнае пачуццё-жарсць, быццам віхура, ахоплівае яго. Рэжысёр тут быццам рассоўвае межы часу і ўводзіць у спектакль нейкія шалёныя сучасныя рытмы, калі герой танцуе танга з каханай, альбо са сваім жа мінулым. Ды лёс асуджае героя на новыя пакуты. Ягоная заганная сувязь вядзе да гібелі жонкі, і хворае сумленне пачынае сточваць яго, атручваць непрацяглае шчасце, каб канчаткова забіць у фінале, калі ён даведаецца горкую праўду, што Матыльда — яго ж дачка. Душа Сцяпана трапляе ў клетку назаўсёды, і выбавіцца адтуль фактычна немагчыма.

Сродкамі псіхалагічнага тэатру пераважна карыстаюцца і іншыя выканаўцы. У п'есе Марыя, жонка Сцяпана, быццам губляецца ў гэтым віры падзей і жарсцяў. Такой яна здаецца і ў пачатку спектакля: непрыкметная, крыху мітуслівая, клапатлівая гаспадынька. Але паступова разумееш, што ўнутраны свет, так бы мовіць, маштаб перажыванняў і пакут гэтай гераіні не менш істотны, чым у іншых персанажаў. Актрыса Наталля Аладка нібы узбуйняе гэты вобраз. Знікае яго побытавая аснова.

У ролі Міхася, сына Сцяпана і Марыі, мы ўбачылі маладога артыста Рамана Салаўёва (нагадаю, пазалетась ён стаў лаўрэатам Нацыянальнай тэатральнай прэміі). Сюжэтная лінія яго героя ў параўнанні з п'есай (дзе ён становіцца актыўным барацьбітом за новую Беларусь, потым вяртаецца да амаль звар'яцелага бацькі і сам заканчвае жыццё самагубствам) крыху падрэзан. У спектаклі яна вырашана сыходам Міхася з дому пасля нешчаслівага кахання з Матыльдай. Ды нават у тых сцэнах з ім, што захаваліся ў спектаклі, адчувальныя яго рамантычная узнёсласць і драматызм характару. У нечым ён падобны да бацькі: і узнёслымі рамантычнымі памкненнямі (хоць для Сцяпана яны ў мінулым), і роспачу, расчараваннем, трагічнай самарэфлексіяй, і нават вершамі. Сумна тое, што лёс іх, духоўна роднасных асобаў, раз'яднаў, раскідаў у розныя бакі, зрабіў сапернікамі, нават ворагамі.

Новы спектакль коласаўцаў сведчыць пра патэнцыял віцебскай трупы, а яшчэ пра тое, якія вялікія магчымасці для сучаснага беларускага тэатра закладзены ў нашай класіцы, якая не губляе сваё надзённасці, актуальнасці і шматварыянтнасці прачытання.

Юрый ІВАНОЎСКІ,
тэатразнаўца

Дызайнерскі ход

Погляд пасля вандровак?

Як мы паведамлялі, у галерэі "Акадэмія" адкрылася выстава работ студэнтаў кафедры касцюма і тэкстылю факультэту дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў да 40-годдзя згаданага факультэта. Мудрагелістая англамоўная назва "The Experience Of Experiment" ("Досвед Эксперыменту") падаецца мне зусім не выпадковай.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Гэта знак таго, што кафедра, якая дзесяцігоддзямі лічылася самай нацыянальна арыентаванай і ў пэўным сэнсе нават кансерватыўнай, сёння ладзіць навучальны працэс, сыходзячы з рэалій вялікага свету — адкрытых межаў, шырокай міжнароднай кааперацыі ў галіне культуры і мастацтва, нават перспектывы творчай кар'еры за мяжой. Студэнт савецкай пары і першых гадоў незалежнасці ведаў, што пасля абароны дыплома яму, хутчэй за ўсё, давядзецца жыць і працаваць ў Беларусі альбо ў блізкім сумежжы, дзе беларуская ментальнасць як з'ява і яе асобныя чыннікі могуць быць запатрабаванымі. Прынамсі, чужымі ўспрымацца не будуць. Адпаведна, базавымі ў навучанні і грунтам самастойнай творчасці тады былі беларуская нацыянальная традыцыя з яе народнымі каранямі, што сягалі ў глыбіню стагоддзяў, і цікавая нашай грамадзе рэчаіснасць, культурна-гістарычная і сацыяльная. Ды і тэхналогія ткацтва ў нас доўгі час заставалася нязменнай, у значнай ступені з прычыны адмежаванасці ад сусветных трэндаў. Сёння ж амбіцыйны малады чалавек гатовы да таго, што ў пошуках годнай працы не раз давядзецца змяніць не толькі месца жыхарства і творчы почырк, але і саму прафесію разам з грамадзянствам. Такія рэаліі... Было б дзіўна, каб акадэмія іх ігнаравала. Урэшце, мэта нашай галоўнай мастацкай ВНУ якраз і рыхтаваць студэнтаў да сапраўднага жыцця.

Я наўрад ці магу быць аб'ектыўным крытыкам работ студэнтаў згаданай кафедры. Калі я сам вучыўся ў нашым Тэатральна-мастацкім, сярод маіх добрых знаёмцаў было шмат студэнтаў — будучых спецыялістаў па ткацтве і мастацкай аздобе эксплю. Іх майстэрня знаходзілася на першым паверсе нашага вучэбнага корпуса, і я часта завітваў туды ў госці. Я бачыў, колькі высілкаў, нерваў трэба прыкласці, якую сілу волі мець каб "набраць" на ткацкім станку палоску ў пяць сантыметраў. А калі які фрагмент акажацца няўдалым, трэба распусціць зробленае і пачаць наноў. Гэта табе не тое, што мастыхінам фарбу з палатна саскрэбці ці гумкай алоўкавы штрых з аркуша сцерці. Праз гэтыя назіранні маю вялікаю павагу да рамяства ткачоў.

Мне асабіста бліжэй традыцыя. Хацелася б, каб габелен заставаўся габеленам. І каб ён вісеў на сцяне, а не ператвараўся ў нейкае падабенства тканай скульптуры. Але сусветная тэндэнцыя мае вектарам пераход ў аб'ём, ператварэнне шпалеры/габелена ў прасторавы арт-аб'ект. Таму студэнты нашай акадэміі, засвоіўшы на першых курсах асновы класічнага ткацтва, далей вывучаюць новыя матэрыялы і тэхналогіі, перспектыўныя кірункі. Работы, якія ілюструюць гэты працэс, і прадстаўлены на выставе. Акрамя ўзораў тэхналогіі класічнага ткацтва ёсць у экспазіцыі аплікацыі, батык. Касцюм жа на выставе прадстаўлены не вельмі выразна. На што здольныя студэнты гэтай спецыялізацыі, можна было пабачыць выключна на відэа. Ды ніякае кіно не заменіць рэальную рэч, рэальны экспанат.

Частка работ — курсавыя, частка — самастойныя. Варта адзначыць, што ўдзельнікі праекта маюць сваю публіку, ужо выстаўляліся па-за межамі Акадэміі. Як тэндэнцыю можна адзначыць цікаўнасць моладзі да сусветнай культуры. Яно, зрэшты, было заўжды. На тое і маладосць дадзена, каб вандраваць па свеце, набірацца розуму, а потым набытыя веды скарыстаць дзеля Бацькаўшчыны. Хто мае магчымасць, вандруе рэальна, іншы — віртуальна, па кнігах і ў Сеціве. Дык вось, немалая частка прадстаўленага ў экспазіцыі ўспрымаецца як ілюстрацыя да прачытанага ў кнігах і ўбачанага ў Інтэрнэце. Тут і канкрэтныя спасылкі на літаратурныя формы і творы (японская паэзія хоку і культавая для так званага "страчанага пакалення" кніга Фрэнсіса Скота Фіцджэральда "Вялікі Гэтсбі"), і спробы знайсці эстэтычную формулу філософскіх паняццяў, і памкненні асэнсаваць касмагонію і сюжэтныя коды міфалогіі. Удакладню, што ўся гэта разумовая праца адбываецца ў межах праграмы тэхналагічных эксперыментаў.

Не ведаю, як ставіцца да той акалічнасці, што студэнтаў, мяркуючы па экспазіцыі, не надта цікавіць уласна беларускі матэрыял. Альбо нават да таго, што з далучэннем да глабальнай інфармацыйнай прасторы выявілася, што беларушчына ў кантэксце сусветных камунікацый — з'ява неканкурэнтаздольная. І, адпаведна, вымушана пасунуцца з першых роляў ва ўласным жа арэале. Зрэшты, варта вызначыцца, наша Акадэмія — гэта школа "легіянераў" (паводле спартыўнай тэрміналогіі) ці кузня нацыянальных кадраў?

Хаця, канешне, гэта пытанне не да кафедры, не да факультэта. Не да Акадэміі наогул. Прыярытэты культурнага развіцця ў прынцыпе — вот што важна і важка.

К

Сакавіцкія аўдыя/відэаработы айчынных выканаўцаў рэцэнзуюць гітарыст і лідар-вакаліст гурта "N.R.M." Піт ПАЎЛАЎ (А.) і спецыяльны карэспандэнт газеты "Культура", музычны крытык Алег КЛІМАЎ (В.).

Аўдыя & Відэа

тэкст

Алег КЛІМАЎ, спецыяльны карэспандэнт "К"

Піт ПАЎЛАЎ, гітарыст і лідар-вакаліст гурта "N.R.M."





АЎДЫЯ

Гурт "Trollwald", міні-альбом "У гушчарах"

А.: — Музыка — вельмі характэрная для "металістаў" 30-гадовай даўніны, вельмі старамодная ды нішавая, што дзіўна для нашага часу. Тое нават спалохала. Цяперашняя генерацыя "цяжкіх" каманд выглядае значна больш свежай. Такое адчуванне, нібы калектыў працуе з аглядкай на прыхільнікаў традыцыйнага хард-н-хэві-кірунку. Да мінусаў аднясу і аднастайнасць гучання. Але ў параўнанні з "Litvintroll", адкуль цягнуцца карані гэтага складу, зроблены крок наперад. Я маю на ўвазе нармальны вакал. Граюць жа музыканты добра, запісана таксама на ўзроўні, да месца дуда, аднак, перспектывы (праз вышэйпададзенае) насяроджваюць. Патрэбен свой, непаўторны саўнд. Яго пошукам я і параіў бы ўдзельнікам гурта заняцца.

В.: — Першая ластаўка ад адной з частак са скандалам разваленага летась гурта "Litvintroll", фольк-метал-каманды вельмі цікавай, якая абяцае ў будучыні шмат. Сёе-тое з тых абяцанняў ужо выкананы "на выдатна". А вось міні-рэліз асабліва не ўразіў. Нават адмова ад гроўлінга (гыркання) агульную меладычную аднастайнасць не выратавала. Разумею, што калектыў пакуль яшчэ шукае, куды рухацца, на што рабіць упор, якія фарбы выкарыстоўваць. Майстэрствам ды талентам музыканты не абдзеленыя, а таму проста пажадаю ім прарыву ды ўдачы. Адносна ж дадзенай работы... Я параіў бы засесці за нешта больш сур'ёзнае.

Гурт "Усё Crazy", альбом "Па морах"

А.: — Каб гэта быў інструментальны рэліз, я ацаніў бы яго на цвёрдую "чацвёрку". Але тэксты "карты зблыталі". Да чаго ў іх столькі інвектыўнай лексікі? Каб прадэманстраваць яе веданне, ці што? Нічога арыгінальнага ў гэтым няма. І марская тэматыка чаму выкарыстана? Не ведаю. Не зразумеў. Напэўна, такое спяваюць у пабах англійскіх працоўных раёнаў. Спроба перасадзіць падобную "творчасць" на нашу глебу не падалася ўдалай. Дзе гэта музыка можа гучаць? Магчыма, як саўндтрэк да вельмі аўтарскага кіно пра моры-акіяны і з градацыяй "18+".

В.: — Усе беларускія беды, калі яны ёсць, праз тое, што мора ў нашай краіне няма. Так мяркуюць удзельнікі гэтага калектыву. Я ў чымсьці з імі салідарны, паколькі сам неаднаразова заўважаў, што на моры любога колеру думкі пра радзіму, якія перыядычна выклікаюць ува мне пачуццё занепакоенасці, кудысьці знікалі. Ну а ў зялёнай (чорнай, мёртвай ды іншай) роўнядзі, працягваюць меркаваць усё тыя ж удзельнікі "Усё Crazy", прынята адпачываць звышкультурна. Пра тое, уласна, і альбом: пра ваду вакол цела ды вадкасці, якая трапляе ўнутр яго. І пры гэтым па моцнае марское слоўца артысты ў камбуз не лезуць: ансамбль жа выконвае музыку, натхнёную кельцкай культурай, а народ гэты, як вядома, той яшчэ быў у лексіцы! Тут амаль усё, што адарванае ад сучаснасці, у той ці іншай ступені слухаецца: весела, тэксты смешныя ды хуліганскія. Але як толькі ансамбль пераходзіць да побыту сённяшняга... Ураўлівым людзям, выхаваным музыкай Вівальдзі ды прозай Тургенева, работу гэтую слухаць, вядома, не рэкамендуецца.

Гурт "Маленькі Альберт", альбом "Мой Drug"

А.: — Чым мне гэты гурт аказаўся адразу блізкім? Сваёй назвай: "маленькі Альберт" — гэта абазначэнне спрэчнага псіхалагічнага эксперыменту над дзіцем, а што азначае тэрмін "сабака Паўлава", думаю, ведаюць усе. У выпадку з гэтай камандай мяне не збянтэжыла таксама досыць традыцыйнае гучанне ды часам чутны парафраз на тэмы гурта "Nirvana". Запісана, сыграна, праспявана ўсё крута, ды і эмацыйна кранае. Патэнцыял для далейшага развіцця ёсць, слухач знойдзецца. Колькі парадаў я музыкантам даў бы, але не глабальнага кшталту, так, нюансы.

В.: — Грандж ўсё яшчэ жывы, аказваецца, хоць постгранджам яго назаві, як у гэтым выпадку. Дэпрэсіўнае "рубілава" з вакалам, у якім пры моцным жаданні можна ўлавіць інтанацыі... Сяргея Міхалка часоў росквіту развясёлага "Ляпіса Трубяцкога" (напрыклад, у трэку "Неба не чакае"). Сваю сотню прыхільнікаў на сольны канцэрт каманда, напэўна, збярэ. Ну а большае... Быццам бы, усё на месцы — музыка адпавядае жанру; недурныя тэксты; выкананне нармальнае. У гармоніі ўсё. Але неяк не чапляе. Асабліва інтэрпрэтацыя верша Ясеніна "Да пабачэння, сябар мой, да пабачэння..."

ВІДЭА

Гурт "Gods Tower", кліп на песню "Liar"

А.: — Кліп мне, у цэлым, спадабаўся, праўда, з-за таго, што песня вельмі доўгая, да канца прагляду відэа некалькі стамляешся ад яго. Тэматыка роліка блізкая, бо мне цікавыя такія героі. Адзіная прэтэнзія тычыцца менавіта кампазіцыі. "Gods Tower" калісьці сталі наватарамі ў постсавецкай "цяжкай" музыцы, дадзеная ж песня — вельмі тыповая па сваёй структуры для гэтага жанру. А наогул, я даўным-даўно люблю гэты гурт, таму і ўсё яму дарую...

В.: — Кліп складаецца з дзвюх частак. Карцінка першая: музыканты легендарнага гомельскага дум-метал-гурта на здымачнай пляцоўцы выконваюць песню. Другая карцінка: калі ў прэс-рэлізе да відэа гаворыцца, што кампазіцыя створана пад уплывам гісторыі з Джардана Бруна, то і бачым мы, як сярэднявечныя інквізітары вядуць нейкага чалавека на вогнішча — з усімі непрыемнымі наступствамі. Знята ўсё скупа, аскетычна, што, напэўна, мусіць падкрэсліць трагедыйнасць таго, што адбываецца. Песня "Liar" наўрад ці ўвойдзе ў "залаты фонд" каманды — нейкая незапамінальная яна. Але гэта ўжо мае асабістыя "прэтэнзіі": лічачы калектыў сапраўды буйной з'явай у постсавецкай цяжкай музыцы, я і стаўлюся да яго з глыбокай дзі бязмежнай павагай, як да глыбы ды манумента, узведзенага пры жыцці, наогул. А фанаты "Gods Tower" няхай наляцяць на мяне за небяспрэчнае меркаванне, што хітоў у гурта не так ужо і шмат. Калі, вядома, да мяне дабяруцца. Рррр!..

Журналісцкі аўтатур газеты "Культура"

Не ўмоўны лісток кнігавыдачы

Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Івацэвіцкага райвыканкама Святлана Завадская параіла нам заехаць у вёску Любішчыцы. Мы заехалі. І зноў не пашкадавалі. Высветлілася, што адзін з нас быў тут некалькі гадоў таму. Таму з'явілася нагода прасачыць дынаміку развіцца тамтэйшых клубнай ды бібліятэчнай устаноў.

Яўген РАГІН,
Кастусь АНТАНОВІЧ
Мінск — Стаўбцоўскі раён Міншчыны — Ляхавіцкі і Івацэвіцкі раёны Брэстчыны — Мінск

Рэпетыцыя музычнага калектыву ў Любішчыцах.



"А план я не выканаю!"

У Любішчыцы прыехалі пад вечар — той самы час, калі пасля працы людзі маюць магчымасць бавіць вольны час на рэпетыцыі або ўдзельнічаць у самадзейнасці ці тэматычных гуртках мясцовага дома культуры. І тая магчымасць выкарыстоўвалася. Якраз ішла рэпетыцыя вакальнага гурта пад кіраўніцтвам Людмілы Палонскай, на якую сабралася з дзясятак чалавек. Скажам адразу: узровень выканання — прыстойны, ды і з рэпертуарам праблем, здаецца, няма. Маючы гэтыя два складнікі поспеху, прасцей дасягнуць і фінансавых прыбыткаў. З гэтага і пачалі гутарку з дырэктарам Любішчыцкага СДК Святланай Ятчэня — чалавекам шчырым і эмацыйным. Вось толькі яна адразу зазначыла, што план па аказанні платных паслуг насельніцтву не выканае. З аднаго боку, у Дома культуры ёсць што прадаць. Гэта, як мінімум, народная і эстрадная творчасць з адметнай тэатралізацыяй. Хіба СДК (ён, дарэчы, нядаўна адзначыў сваё 50-годдзе) харэографа. Тым не менш статыстыка нярадасная. Калі браць апошнія канцэрты, то, па словах Святланы Ятчэня, у адным сяле прыйшло 8 чалавек, у другім — 25. У выніку на аплату паліва для машыны грошай пайшло больш, чым было зароблена на продажы білетаў на мерапрыемства. І праблема тая тычыцца не толькі ў любішчыцкіх творцаў. Такая ж сітуацыя ў народнага фальклорнага калектыву "Каланянка" з Целяханскай зоны абслугоўвання. Зарабілі яны на трох канцэртах 800 тысяч, а на паліва пайшло 700 з лішкам.

Логіка кіраўніка Любішчыцкага СДК нам зразумелая: няма гледача, няма і мэтазгоднасці выступаць з выязднымі мерапрыемствамі. А ці ёсць тады мэтазгоднасць дзейнасці самога СДК? Мяркуем, што ёсць. Хаця б таму, што паўдзельнічаць у мясцовай самадзенасці прыязджаюць у Любішчыцы нават з райцэнтра. Гэтаксама як прыязджаюць падзівіцца на саламяныя цуды Ніны Чымбар, якая кіруе ў СДК гуртком па саломкапляценні. Адзін толькі трактар у яе ўвасабленні чаго варты! А таму з задавальненнем пераймаюць у яе тэхніку мясцовыя дзеці і не толькі.

Што ж атрымліваецца? У Любішчыцах гатовы навучыць, як зрабіць цікавае мерапрыемства і як наладзіць працу з народнымі майстрамі. А вось як зарабіць грошы на паслугах сферы культуры — з вялікім жаданнем гатовы павучыцца самі. Няўжо абласны метадычны цэнтр не ідзе насустрач? Не надта верыцца.

(Не)лірычнае адступленне Кастуся Антановіча

Падчас нашых аўтатураў заўсёды спрабаваў знайсці адказ на пытанне: як зрабіць, каб сельская ўстанова культуры была прывабнай і карыснай як для мясцовага жыхара, так і для прыезджага турыста? Вядома, можна апраўдваць бяздзеянне несупадзеннем функцый установы з запытамі аўдыторыі. І тым не менш, мне здаецца, ажыццявіць такое спалучэнне інтарэсаў цалкам магчыма. Што для гэтага патрэбна: ключавы аб'ект (у Івацэвіцкім раёне гэта, вядома, Косаўскі палац і сядзіба Касцюшкі), а таксама падрыхтаваныя да інтэрактыўнай дзейнасці сельскія ўстановы культуры. Не абысціся ў гэтай справе і без сістэмы харчавання ды гатэляў (з гэтым на Івацэвіччане праблем няма). Застаецца хіба стварыць праграму для смартфонаў з картай аб'ектаў і іншай дадатковай інфармацыяй або скарыстацца наяўнымі інтэрнэт-картамі, дзе можна нанесці свае ўстановы. Хіба цяжка гэта? Мяркую, што не.

"Пазабюджэтныя" таямніцы паляшуцкай душы

Блок ушаноўваецца, а Караткевіч?

Пра сельскую бібліятэку Любішчыц, якой кіруе Ірына Кірчук, "К" пісала ўлетку 2008 года. У гэтай установе тады ўразіла крэсла… Блока,

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Навагрудак /

Ад Міцкевіча да Міцкевіча

У Доме-музеі Адама Міцкевіча ў Навагрудку працуе выстава "Запавет песняра: жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа", прымеркаваная да 110-годдзя пачатку яго літаратурнай дзейнасці.

Гэта ўжо другая экспазіцыя пра паэта, якую прадставіў Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа. За некалькі дзён працы выставы з творчасцю нашага песняра праз фатаграфіі людзей, мясцін, твораў і 18 ілюстрацый да паэмы "Сымон-музыка" мастакоў Міколы Селешчука і Барыса Заборава пазнаёмілася ўжо звыш 100 чалавек, у тым ліку студэнты-філолагі з Туркменістана, якія навучаюцца ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце.

Асобным стэндам на выставе дом-музей прапанаваў матэрыялы са сваіх збораў (фатаграфіі і кнігі), якія паказваюць сувязь Якуба Коласа з Навагрудчынай, якую ён упершыню наведаў у 1940-м у складзе рэспубліканскай камісіі па правядзенні мерапрыемстваў з нагоды 85-годдзя смерці Адама Міцкевіча. Часта быў тут пачынаючы з 1946 года, калі абіраўся тры скліканні запар дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР ад Навагрудскай выбарчай акругі.

Мікалай ГАЙБА,
дырэктар Дома-музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку

Вечара паэтычнага настрою "Прыгажосць, якой імя — жанчына".

Выстава "Памяць зямлі" у Століне.

Мастоўшчына /

Публіка, якая сапраўды ўмее слухаць…

У чытальнай зале нашай бібліятэкі частка фонду прызначаецца для карыстальнікаў са слабым зрокам.

Тут прадстаўлены дакументы на дысках, аўдыякасетах. Для тых, хто жыве ў свеце гукаў, супрацоўнікамі бібліятэкі праводзяцца агляды новых аўдыякніг «Раім паслухаць». Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца запісы класікаў рускай, беларускай ды замежнай літаратуры, фантастыка, дэтэктывы, жаночыя раманы, дыскі з аўдыяспектаклямі.

Удала падабраная аўдыякніга і размова з бібліятэкарам — гэта падзея для невідушчага чалавека. Ды і ўвогуле, абслугоўванне інвалідаў па зроку патрабуе індывідуальнага падыходу. Дарэчы, бібліятэкары праводзяць мерапрыемствы і ў сцянах бібліятэкі, і ў аддзяленні дзённага знаходжання інвалідаў. Паверце, гэта вельмі ўдзячная публіка, якая ўмее слухаць… Таму і вечар паэтычнага настрою «Прыгажосць, якой імя — жанчына» прайшоў у цёплай атмасферы. Гучалі запісы вершаў пра вернасць, каханне. Удзельнікі мерапрыемства чыталі ўласныя творы на беларускай, украінскай і рускай мовах.

Святлана ЧАЙКІНА,
бібліятэкар аддзела абслугоўвання і інфармацыі Мастоўскай раённай бібліятэкі

Плешчаніцы /

Дзякуй дзеду, што ставіў на гарох!

Кажуць, што спяваць можа кожны, але хачу заўважыць, што гэта не зусім так. У 2015 годзе да нас на працу ўладкаваўся малады чалавек Аляксандр Каленік. Таленавіты і ўлюбёны ў сваю справу. Вось ён і спявае, грае на гітары, піша музыку, вершы.

У Плешчаніцкім ГДК Аляксандр сабраў вакол сабе жаночую вакальную групу "Спявай, душа!" Кабеты ходзяць на рэпетыцыю амаль кожны дзень. З гэтага гурта вылучылася прыгожае трыа, салістам якога з'яўляецца Каленік. Гледзячы на Аляксандра ў працы, заўважаеш, наколькі ён адказна ставіцца да сваёй справы, бо кожны твор, які выконвае, адпрацоўвае перад люстэркам — і міміку твару, і харэаграфічныя рухі.

з пальчаткай Незнаёмкі на спінцы, з пажоўклымі аўтарскім рукапісамі на сядзенні. Паэт нібыта толькі што прысутнічаў, але на хвілінку выйшаў. Прыдумка вабіла інтрыгай чытача, стварала ў бібліятэцы адмысловую атмасферу творчага задумення, далучэння да Слова…. Крэсла захавалася і па сёння.

З Блокам усё тут зразумела. Вырашылі паглядзець у дадатак, а наколькі часта трапляе ў чытацкія рукі, скажам, наш Караткевіч. Знайшлі на паліцах поўны збор твораў рамантыка-летуценніка, разгарнулі том і ўбачылі нечакана, што на лістку бібліятэчнай выдачы — ніводнага запісу. Узяліся за другую кніжку і ўвогуле не знайшлі таго аркушыка. У трэцяй і чацвёртай — таксама. У чым справа? Біліятэкарка паведаміла, што аддзел камплектацыі Івацэвіцкай райбібліятэкі дасылае кнігі без лістка выдачы, інакш кажучы, дазваляе ім не карыстацца. Дзеля дакладнасці зазірнулі ў чытацкія фармуляры, дзе ўсе запісы па кнігавыдачы маюцца. Але ж гэта ўсё адно не дапаможа эфектыўна адсачыць запатрабаванасць той ці іншай кнігі. Меўся б электронны каталог — тады іншая справа: вылучыў курсорам назву выдання і атрымаў поўны пералік чытачоў канкрэтнай кнігі.

Але цяпер не пра яго. Апрача кнігавыдачы вельмі актыўна займаюцца ў бібліятэцы і творчасцю. Па словах Ірыны Рыгораўны, пачыналі яны з бісера, пасля зацікавіліся стварэннем народных ляляк-абярэгаў. Ды так, што могуць смела канкураваць з профільнымі народнымі майстрамі з Рагачоўскага, Старадарожскага і Любанскага раёнаў. А зёльніца, створаная рукамі Ірыны Кірчук і напоўненая мятай, мялісай да сардэчнікам, не згубіцца ў інтэр'еры і гарадской кватэры.

Апошнім часам заняткі, на якія збіраецца 8 вучняў, у бібліятэцы праводзяцца двойчы на тыдзень. Выкарыстоўваюць тут нават пластыкавыя бутэлькі, што добра і для экалогіі, і для дзяцей, якія з побытавых прадметаў робяць прывабныя рэчы і радуюць імі сваіх бацькоў.

Апошні трэнд у Любішчыцкай бібліятэцы — стварэнне ўзораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з мешкавіны і карункаў, а таксама велікодныя пісанкі і драпанкі. Бонус такой творчай дзейнасці — платныя майстар-класы, на якія прыязджаюць школьнікі з суседніх вёсак. Ды і Ірына Кірчук са сваёй камандай выязджае ў Івацэвічы, дзе праводзяць майстар-класы ў раённым музеі. Поруч з выкарыстаннем камерцыйнага фонду і камп'ютарнымі паслугамі майстар-класы дапамагаюць выканаць, а часам і перавыканаць план платных паслуг, што складае на паўгоддзе 750 тысяч рублёў. Словам, пабачылі мы тут не сельскую бібліятэку, а, лічы, раённы дом рамёстваў. Што казаць: у бібліятэцы знайшлося месца нават для адметнай фотавыставы.

Але згадаем, што нават самы прэстыжны медаль мае адваротны бок. Праз прадуктыўную дзейнасць бібліятэцы ў Любішчыцах няма дзе захоўваць усё створанае. А чаму б, да прыкладу, не адкрыць пры бібліятэцы імправізаваны музей? Тым больш, як аказалася пасля невялікай пошукавай работы, што адпаведнае памяшканне ў будынку вылучыць пад музей можна. Варта толькі яго добраўпарадкаваць, што, думаем, пад сілу той жа гаспадарчай групе. У выніку, раён можа атрымаць не проста сацыякультурны цэнтр для патрэбаў мясцовага насельніцтва, але і турыстычны аб'ект, прынамсі, лакальнага значэння.

(Не)лірычнае адступленне Яўгена Рагіна

І трэба ж было залезці ў тыя кніжкі?! Але факт застаецца фактам. У бібліятэцы Любішчыц, як, напэўна, і іншых вёсак раёна, лістком выдачы не карыстаюцца. Дык мо сапраўды не трэба? Я, каб высветліць ісціну, абтэлефанаваў некалькі аддзелаў бібліятэчнага маркетынгу (у тым ліку — па Брэстчыне) і знайшоў пацвярджэнне сваім перакананням: без гэтага дакумента не абысціся.

Прыехаў дахаты і паглядзеў свае кнігі, што бяру ў 21-й бібліятэцы-філіяле сталіцы. Усе лісткі выдачы (гл. здымак) — самаробныя, не друкарскага выпуску. На іх абодвух баках пазначаны чытацкі нумар і апошні дзень вяртання кнігі ў бібліятэку. Што гэта дае? А вельмі многае. Чытач дакладна ведае, да якой даты можа трымаць выданні. А бібліятэкар можа прасачыць, як часта канкрэтная кніга выдаецца на рукі. І гэтая апошняя функцыя простага аркушыка падаецца найбольш важнай. Бібліятэкар, ведаючы, наколькі запатрабаванае тое ці іншае выданне, будуе ў адпаведнасці з гэтым сваю штодзённую працу з чытачамі па папулярызацыі кніг, у дадзеным выпадку — вершаў і прозы Уладзіміра Караткевіча. Так што кожны работнік сельскіх устаноў наўпрост зацікаўлены ў тым, каб уласна выразаць і наклеіць на кнігі тыя лісткі.

Чытальная зала ў скверы

Перш чым знайсці цэнтральную бібліятэку Івацэвічаў, трохі пакруціліся па горадзе, які паказаўся нам тым днём шматлюдным і актыўным. Гэтае ж хацелі пабачыць і ў самой бібліятэцы. Адным вокам кінуўшы на кідкія заклікі чытаць і, вывучыўшы асартымент "буккросінгу", завіталі наўпрост да дырэктара цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Піліпа Пестрака і адпаведна — дырэктара ЦБС Галіны Гарэлік. Закрануллі тэму адсутнасці лістка выдачы на бібліятэчных кнігах. Як патлумачыла Галіны Гарэлік, раней лісткі зваротy літаратуры былі прымацаваны да кожнай кнігі. Цяпер з-за эканоміі фінансавання гэта не робіцца. Найперш, тая праблема тычыцца сельскіх бібліятэк. А як няма лісткоў у новых кнігах, то адпала неабходнасць запаўняць іх і ў старых выданнях, на апрацоўцы якіх яшчэ не эканомілі.

Дазволім сабе не пагадзіцца. Не нам указваць, што і як рабіць бібліятэкарам, але для невялікага аркушыка паперы, які ўклейваецца ў кнігу, не абавязкова закупляць фірмовыя разлінееныя бланкі. Думаецца, дастаткова будзе нават скарыстаных на адзін бок старонак фармату А4. Альбо зрабіць лічбавую фіксацыю кнігавыдачы.

Да слова, пра тэхніку. У самой ЦБС налічылі 14 камп'ютараў. Апроч таго ва ўсіх 16 бібліятэках аграгарадкоў таксама маецца па камп'ютары. Пераважная большасць — з выхадам у Інтэрнэт. Яшчэ колькі лічбаў. Усяго ў раёне дзейнічае 32 бібліятэкі з улікам бібліобуса, які мае 8 маршрутаў, абслугоўваючы раз на месяц да 40 населеных пунктаў.

І ўсё ж расповед пра Івацэвіцкую ЦБС хочацца завяршыць на пазітыўнай ноце. Як-ніяк установа змагаецца за сваіх чытачоў. Да прыкладу, каб усім было зручна, бібліятэка на працягу дня не зачыняецца, а абедзенны перапынак для супрацоўнікаў размеркаваны на розны час. А ўлетку ў маляўнічых скверах перад гарадской бібліятэкай мяркуецца ладзіць акцыю "Чытальная зала пад адкрытым небам". А каб да гэтай акцыі яшчэ далучыць айчынных паэтаў ды пісьменнікаў — цікавасць да яе была б гарантавана. Ды толькі апошні раз пісьменніцкі дэсант з Мінска быў тут на 70-годдзе з дня нараджэння Міколы Купрэева. А так яны — рэдкія госці. Што ж, будзе нагода іх запрасіць.

Агульнае (не)лірычнае заканчэнне

Пытанне з лісткамі бібліятэчнай выдачы па Івацэвіцкім раёне так і засталося адкрытым. Як, дарэчы, і пытанне з выкананнем планаў пазабюджэтнай дзейнасці, якія дзесьці выконваюцца, а дзесьці — не. Няўжо адказы на гэтыя пытанні варта шукаць толькі ў непрадказальнасці паляшуцкіх характараў?

К

Дырэктар Любішчыцкага СДК Святлана Ятчэня,

Кіраўнік сельскай бібліятэкі Ірына Кірчук.

Дырэктар ЦБС Галіна Гарэлік.

Сапамяны трактар Ніны Чымбар.

Фрагмент экспазіцыі ў Навагрудку.

Гурт "Спявай, душа!"

Майстар-клас па ткацкіх тэналогіях.

Бабуля і дзядуля Аляксандра былі салістамі ў Святавольскім доме культуры, што ў Івацэвіцкім раёне. Дзед адправіў унука ў музычную школу, нават ставіў яго на гарох, калі той прыносіў нездавальняльныя адзнакі.

Дарэчы, працаваць у нашым ДК не вельмі лёгка: з кастрычніка 2014 года ён зачынены на рамонт з-за аварыйнага стану, таму сёння не маем сваёй матэрыяльнай базы, а працуем у музычнай школе. Канцэрты даём, у асноўным, выязныя, а таксама ў парку адпачынку і на цэнтральнай плошчы Плешчаніц. У гэтым нам дапамагаюць мясцовыя ўлады.

Віталь СТАХОВІЧ,
дырэктар Плешчаніцкага ГДК
Лагойскага раёна

Гродзеншчына / Стукалі кросны і круціўся калаўрот

У Гродзенскім абласным метадцэнтры народнай творчасці прайшло рэгіянальнае свята ткацтва. Падчас яго 24 майстры, носьбіты і пераемнікі традыцый, былі адзначаны за ўнёсак у захаванне нацыянальнага мастацтва.

Зранку майстры вобласці спяшаліся ўстанавіць і адладзіць кросны, прасніцы, верацёны, калаўроты, стужкаткацкія станкі для правядзення майстар-класаў па найбольш распаўсюджаных на Гродзеншчыне ткацкіх тэхналогіях. Сёння ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь уваходзяць прадстаўленыя на свяце традыцыйныя тэхнікі падвойнага ткацтва вёскі Гудзевічы Мастоўскага раёна, простае двухнітовае ткацтва Ваўкавыскага раёна, творчасць Алены Шунейка па вырабе габеленаў у тэхніцы падвойнага ткацтва і аднабаковага перабору. Ёсць надзея, што з цягам часу і традыцыйныя ткацкія тэхналогіі Воранаўскага раёна, і "белае ўзорыстае ткацтва" Лідчыны папоўняць гэты спіс.

У час свята жанчыны з аматарскага аб'яднання Ганчарскага Дома культуры Лідскага раёна запрашалі паўдзельнічаць у мастацка-рэалістычнай дзеі "Калі да лёну з паклонам — аддзячыць добра лён". Старажытныя прылады для апрацоўцы ільну многія гараджане бачылі ўпершыню. Тыя, хто добра з імі спраўляўся, змаглі першымі пачаставацца хлебам і аладкамі з льнянога семя на мёдзе. А быў яшчэ паказ калекцый сучаснага маладзёжнага адзення "Колер абуджэння" (Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці) і "Па расе" (Гродзенскага каледжа тэхнікі, тэхналогій і дызайну), створанага па матывах народных традыцый.

Без упынку стукалі кросны і круціўся калаўрот у дзевяностадвухгадовай Марыі Мажэйка з Астраўца, а дзве дзевяцігадовыя Настачкі (Фурмановіч і Валюшка) з Гудзевіч падчас свята вырабілі закладкі для кніг.

Яніна БАРЫСЕВІЧ,
вядучы метадыст па выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Гродзенскага АМЦНТ

Століншчына / Каб жыць…

Выставай "Памяць зямлі" народнага майстра Беларусі Івана Супрунчыка адкрыўся цыкл раённых мерапрыемстваў, прысвечаных 30-годдзю аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Вернісаж адбыўся ў выставачнай зале раённага цэнтра ў мінулую пятніцу.

Іван Піліпавіч сваімі творамі адлюстроўвае тое, што адбылося 30 гадоў таму на Чарнобыльскай АЭС. На яго малюнках можна ўбачыць, што адбывалася з людзьмі ў першыя дні пасля аварыі, што робіцца ў вёсках, якія адселены, імкнецца спазнаць чалавечыя душы.

Пра кожную з карцін альбо драўляных скульптур Іван Піліпавіч можа распавядаць бясконца. На адкрыцці выставы ён правёў невялічкую экскурсію, расказаў, які сэнс укладаў у кожны з твораў, што сімвалізуе кожная дэталь.

Да мерапрыемства была падрыхтавана літаратурная выстава "Вечнае рэха Чарнобыля". Аўтары музычнага афармлення — выхаванкі Рэчыцкай дзіцячай школы мастацтваў Дар'я Гізун і Вікторыя Дзенісовіч.

Галіна ГАШЧУК
Фота аўтара

Экспедыцыя ў зону

Колькі помнікаў гісторыі і культуры выратавалі “па навуцы”?

У маім архіве захоўваецца аркуш паперы з запісам 30-гадовай даўніны. 1 мая 1986 года была мая чарга несці вахту ў прыёмнай першага сакратара Мінскага абкама партыі Анатоля Малафеева. Прайшло пяць дзён пасля выбуху на Чарнобыльскай АЭС, таму не здзівіла, калі зазваніла “вяртушка” і голас у трубцы прапанаваў запісаць інфармацыю аб радыяцыйным фоне: “Салігорск — 0,07 мілірэнтген; Любань — 0,08; Мінск — 0,025; Пухавічы — 0,025”. Пазней, 17 кастрычніка 1990 года, прачытаў у “Праўдзе”, што 1 мая 1986 года радыяцыйны фон у Мінску быў 0,06 мілірэнтген — амаль у два з паловай разы большы за той, пра які мне паведаміў голас у слухаўцы. Зрэшты, у 1986-м, прызнацца, мне мала што казалі гэтыя мілірэнтгены. Разбірацца я ў іх стаў, калі ў 1991 — 1995 гадах узначальваў Дзяржаўную гісторыка-культурную экспедыцыю па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры ў раёнах, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, і нямала патаптаўся па забруджанай зоне з дазіметрам.

На карціне Віктара Шматава паказана, якімі ўбачылі закінутыя вёскі ўдзельнікі экспедыцыі.

Калыска з бацькаўскага дома Мікалая Мельнікава, удзельніка экспедыцыі.

Пасуднік (канец XIX — пачатак XX стагоддзяў.).

На новай выставе "Помнікі этнаграфіі і народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Чарнобыльскай зоны аддзела старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук пакажуць знаходкі экспедыцыі. / Фота Аліны САЎЧАНКА

■■■

У 10 раёнах Гомельскай і 6 раёнах Магілеўскай абласцей, найбольш пацярпелых ад радыяцыі, былі 362 помнікі археалогіі часоў неаліта, бронзавага і жалезнага вякоў, ранняга феадалізму, у тым ліку найбольш старажытныя выяўленыя стаянкі першабытнага чалавека на тэрыторыі Беларусі (26 — 22 тысячы гадоў таму) каля вёсак Бердыж Чачэрскага і Юравічы Калінкавіцкага раёнаў Гомельшчыны. Там засталося 1283 помнікі гісторыі, звязаныя з падзеямі мінуўшчыны і знакамітымі землякамі, з подзвігам народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны; 97 помнікаў архітэктуры, у тым ліку 18 — палаца-паркавай архітэктуры, 67 — драўлянага дойлідства. Там знаходзілася больш за 750 старадаўніх абразоў і каштоўных кніг; дзейнічала 118 фальклорных калектываў, 16 дзяржаўных і 79 грамадскіх музеяў, 437 бібліятэк, жылі 795 народных майстроў і ўмельцаў, 70 захавальнікаў вуснай народнай творчасці.

Прыстасаванні для малацьбы — жорны (Нароўля, Хойнікі, Брагін).

Фотаздымкі невядомых нам гаспадароў адной з хат.

На жаль, усведамленне важнасці кірунку дзейнасці, пра які павядзём гаворку, прыйшло не адразу. Не выключаю, што і ў гэтым выпадку спрацаваў звыклы стэрэатып: культура — “па астаткавым прынцыпе”. Але мудра сказана: лепш пазней, чым ніколі! Раней за іншых такое ўсведамленне прыйшло да ўладаў тых краёў, што аказаліся бліжэй да бяды. У канцы 1990 года Гомельскім і Магілёўскім аблвыканкамамі пры ўдзеле Міністэрства культуры былі створаны камісіі па абследаванні стану помнікаў і распрацаваны мерапрыемствы на 1991 — 1995 гады па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны ў вёсках, якія падлягалі адсяленню. Заявілі пра сабе і навукоўцы. Вясной 1991-га на пасяджэнні аддзела старажытнай беларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук упершыню ўзнялі пытанне аб выратаванні помнікаў этнаграфіі і народнага мастацтва, што засталіся ў зоне. А 26 сакавіка таго ж года была прынята пастанова № 110 Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб стварэнні рэспубліканскай спецыялізаванай навуковай арганізацыі “Дзяржаўная гісторыка-культурная экспедыцыя па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры ў раёнах, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС”.

■■■

З-за кадравых праблем экспедыцыя пачала дзейнічаць толькі ў лістападзе 1991 года са штатам у 8 чалавек, з улікам бухгалтара і спецыяліста па справаводстве. Зразумела, сваімі сіламі падняць такую вялікую работу мы не маглі, нават пры ўсім жаданні. Фактычна гэта быў штаб, які мусіў распрацоўваць стратэгію і тактыку дзеянняў па выратаванні гісторыка-культурнай спадчыны, прыцягваць да гэтай справы іншыя зацікаўленыя арганізацыі, выдаваць адпаведныя рэкамендацыі органам улады рэспублікі і на месцах, актывізаваць грамадскую думку.

Станоўчую ролю выканала праведзеная з удзелам Міністэрства культуры і Дзяржкамчарнобыля 16 — 17 лютага 1993 года ў Гомелі рэспубліканская канферэнцыя па сучасным стане і праблемах выяўлення, выратавання і аховы гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі ў раёнах, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Аналітычныя напрацоўкі экспедыцыі з улікам выказаных меркаванняў знайшлі адлюстраванне ў Нацыянальнай праграме пераадольвання вынікаў чарнобыльскай катастрофы на 1993 — 1995 гады і на перыяд да 2000 года.

У практычнай плоскасці асноўнай формай дзейнасці была арганізацыя і фінансаванне экспедыцый у адселеную зону і пацярпелыя раёны з шырокім прыцягненнем спецыялістаў у адпаведных галінах. З часам сфарміраваўся касцяк энтузіястаў гэтай справы, перш за ўсё — з ліку супрацоўнікаў аддзела старажытнабеларускай культуры ІМЭФ Людмілы Агеевай, Уладзіміра Карэліна, Мікалая Мельнікава, Аляк-

Памяць зямлі

26 красавіка Музей старажытнай беларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў адноўленым пасля рамонту памяшканні адкрывае новую экспазіцыю, якая дае ўяўленне пра ўнікальную спадчыну той часткі Гомельшчыны і Магілёўшчыны, традыцыйны ўклад якой змяніўся пасля найбуйнейшай у свеце тэхнагеннай катастрофы.

Настасся ПАНКРАТАВА

Збіраць калекцыю этнаграфіі і мастацтва адселенай зоны пачалі з ініцыятывы доктара мастацтвазнаўства, жывапісца Віктара Шматава — ураджэнца Камарына Брагінскага раёна, які закранула чарнобыльская навала. Пасля аварыі на АЭС мастак неаднаразова вяртаўся ў родныя мясціны і на свае вочы бачыў, як шмат у адселеных вёсках засталося рэчаў, якія маюць музейную каштоўнасць.

— На разведку мы выбраліся маем 1991 года, — кажа загадчык сектара захавання гісторыка-культурнай спадчыны аддзела старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Мікалай Мельнікаў. — Свайго транспарту яшчэ не было. У Брагінскім райвыканкаме нам пайшлі насустрач: мясцовы аддзел культуры выдаткаваў аўтобус, каб мы змаглі праехацца па некалькіх вёсках. Якое этнаграфічнае багацце там засталося!

Само па сабе цуд, як змаглі захавацца ў дамах, напрыклад, унікальная ступа, на якой таўклі нагамі, драўляныя жорны, рабочая частка якіх была ўмацаваная кавалачкамі чыгункоў, шматлікія калаўроты ды іншыя прылады эпохі, вельмі далёкай для канца XX стагоддзя. Вандроўнікі нават заспелі хаты, крытыя чаротам. Рэчы неабходна было ратаваць! Тым больш па пакінутых дварах ледзь не з першых дзён пайшлі марадзёры. На шчасце, скарбы народных майстроў не ўяўляліся раскрадальнікам каштоўнымі.

Тое, што пачыналася з прыватнай ініцыятывы, паступова набыло статус Дзяржаўнай гісторыка-культурнай экспедыцыі па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры Беларусіі ў раёнах, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС. З 1991 па 1999 год адбылося 23 выезды па адселеных вёсках Гомельшчыны і Магілёўшчыны. Пад час іх навукоўцы знаходзілі сапраўдныя скарбы. Скажам, прывезлі і рэстаўравалі рушнік, арнамент якога да той пары быў невядомы айчынным этнографам.

— Даследаванні далі падставу для стварэння асобнага аддзелу “Помнікі этнаграфіі і народнага мастацтва чарнобыльскай зоны”, — распавёў суразмоўца. — Уласных пакояў для экспазіцыі ў нас не было. Дапамог Віктар Шматаў: ён дабіўся таго, каб нам выдаткавалі частку памяшкання на галерэі. Частку аддзела мы перавялі пад фондасховішча, бо ўсе здабыткі выставіць немагчыма.

Першыя ж прывезеныя экспанаты з адселенай зоны выклікалі ў супрацоўнікаў сапраўдную паніку. Давялося запрасіць санстанцыю, каб прыехалі і зрабілі замеры. Сам Мікалай Пятровіч не сумняваўся, што пытанняў з радыяцыйным выпраменьваннем не павінна ўзнікнуць. “Усе гэтыя рэчы зроблены да аварыі, зразумела, дрэва першапачаткова было чыстае. Яны знаходзіліся пад дахам у хатах, хлявах. На іх мог патрапіць максімум радыеактыўны пыл, таму мы яшчэ на месцы апрацоўвалі будучыя экспанаты шчоткамі, мыйнымі сродкамі і дадаткова праходзіліся па іх па прыездзе ў сталіцу”, — тлумачыць Мельнікаў. Да слова, экспазіцыя мае афіцыйна зацверджаны сертыфікат, што прадметы не ўяўляюць небяспекі.

Адзін з найбольш цікавых экспанатаў Мікалай Пятровіч знайшоў у вёсцы Ламачы Хойніцкага раёну ў кастрычніку 1994 года. Гэта была калода для пчол, вышэйшая за чалавечы рост. Заслону выдралі марадзёры, але ў цэлым яна засталася непашкоджанай. У той раз навукоўцаў прывёз аўтобус, у дзверы якога унікальная калода, як ні круці, не праходзіла. Давялося яе толькі сфатаграфаваць ды пакінуць на месцы.

— Наступным жа месяцам па сваіх справах у камандзіроўку на Хойніччыну зазбіраліся супрацоўнікі Інстытута радыёбіялогіі. Яны ехалі на “ўазіку”, а ў гэтай машыны ззаду дзверы наўпрост раскрываюцца — наша калода дакладна магла памясціцца. Паколькі радыёбіёлагаў ехала толькі двое, мы з Віктарам Шматавым напрасіліся “на хвост”, — працягвае расповед візаві. — Калегі заняліся сваімі справамі, а мы з вадзіцелем накіраваліся ў Ламачы і загрузілі калоду. А паколькі мелі час, дык вырашылі заехаць у суседнюю пакінутую вёску. Віктар Фёдаравіч пачаў рабіць замалёўкі для сваіх карцін, а я пайшоў па хатах. І ў адной з іх знайшоў здаравенную бочку-ляжак з цэльнага дрэва даўжынёй больш за два метры! У ёй зберагалі зерне, але з-за надзвычайнай вышыні звычайным спосабам яе нельга было выкарыстоўваць, таму яна ляжала на баку, зверху была дзюрка, праз якую гаспадыня і даставала запасы. Такому цікаваму экспанату месца ў сталічным музеі, але як яго вывезці? Шматаў разам з кіроўцам абмылі калоду-ляжак у бліжэйшай лужыне і ушчыльную ў машыну загрузілі. Так атрымалася, што наш “уазік” ужо быў забіты па плешку, таму, скурчыўшыся на каністры для паліва, падпіраючы галавой столь, праехаў да Мінска.

У новай экспазіцыі абодва рарытэты зоймуць пачэснае месца. А хутка іх выявы і здымкі іншых твораў народных майстроў можна будзе пабачыць у фотаальбоме “Захаваная памяць страчанай зямлі”. Гэтым выданнем Музей старажытнабеларускай культуры хоча падагульніць тыя навуковыя вышукі, з дапамогай якіх атрымалася захаваць культурныя здабыткі рэгіёна.

К

сандра Ярашэвіча на чале з кіраўніком падраздзялення, доктарам мастацтвазнаўства Віктарам Шматавым. Ураджэнец Брагінскага раёна, ён быў вельмі зацікаўлены ў нашай агульнай справе. Ужо з першай сумеснай экспедыцыі на яго радзіму ў чэрвені 1992 года было сабрана, адмыта ад радыяцыі і вывезена каля 200 каштоўных экспанатаў. Потым былі экспедыцыі ў Нараўлянскі, Хойніцкі, Касцюковіцкі і іншыя раёны. Вынікам стала стварэнне "музея ў музеі" з фондам амаль у 3 тысячы выратаваных і дэзактываваных каштоўнасцяў з 30-кіламетровай зоны ў акадэмічным Музеі старажытнай беларускай культуры, афіцыйна адкрыты 25 красавіка 1995 года. Далучаліся супрацоўнікі і іншых аддзелаў інстытута. Так, даследчык фальклору Уладзімір Сысаў, напрыклад, ад адной толькі Ефрасінні Мельнікавай, 1910 года нараджэння, у вёсцы Урэчча Слаўгарадскага раёна ў 1994-м запісаў больш за 100 песень і гэтым не вычарпаў яе рэпертуар. А колькі было сустрэч з іншымі носьбітамі вуснай народнай творчасці! Такім жа плённым было супрацоўніцтва з акадэмічнымі інстытутамі мовазнаўства і гісторыі. У выніку фальклорных, лінгвістычных, мастацка-этнаграфічных экспедыцый у 1991 — 1995 гадах было зафіксавана і падрыхтавана да друку тры з паловай тысячы твораў вуснай народнай творчасці, выдадзены навуковы зборнік "Гавораць чарнобыльцы". У ліку падзвіжнікаў гэтай справы нельга не згадаць супрацоўніцу Музея народнай архітэктуры і побыту Валянціну Малюшыну і Валерыя Каралёва з "Беларускага відэацэнтра", чыімі намаганнямі зняты відэафільмы аб Краснапольскім народным тэатры, фальклорных калектывах Нараўлянскага, Брагінскага, Чачэрскага раёнаў, носьбітах традыцыйнай народнай культуры, майстрах і ўмельцах Магілёўскай вобласці. Больш за 10 народных майстроў і ўмельцаў з пацярпелай зоны было выяўлена ўжо ў мінскіх мікрараёнах "Малінаўка" і "Шабаны". Аднавіў сваю дзейнасць фальклорны ансамбль "Вясёлка" з Нароўлі, які перасяліўся ў сталіцу.

■■■

Асабліва непакоіла захаванне археалагічных помнікаў. У гэтай справе мы ўдзячныя кандыдатам гістарычных навук Алегу Макушнікаву — кіраўніку тагачаснага археалагічнага цэнтра пры Гомельскім аблвыканкаме і Вячаславу Капыціну з Магілеўскага педагагічнага інстытута. Іх намаганнямі было праведзена даследванне стану аб'ектаў, дакладная фіксацыя на мясцовасці і тапаграфічных картах, пашпартызацыя і распрацоўка ахоўных зон. Было выяўлена больш за 60 новых пунктаў, не адзначаных у Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Дакументацыя з рэкамендацыямі па іх захаванні і папярэджаннямі ад магчымага разбурэння. Аналагічную работу ў дачыненні да помнікаў архітэктуры правёў Юрый Чантурыя з БелНДІгорадабудаўніцтва. Падрыхтаваныя ім тамы дакументацыі могуць быць карыснымі, калі дойдзе час для іх рэстаўрацыі.

Заўсёды ахвотна да нашых экспедыцый далучаліся супрацоўнікі раённых краязнаўчых музеяў. Яны і самі сёе-тое рабілі, але, працуючы разам, мелі магчымасць атрымаць кваліфікаваную навуковую кансультацыю аб каштоўнасці сабраных прадметаў народнай культуры і побыту, якімі потым папаўняліся фонды мясцовых музеяў — дзейных і тых, што меркавалася стварыць, як гэта рабілася з нашай фінансавай падтрымкай у Нароўлі.

■■■

Небяспечна было працаваць у забруджанай зоне? Не будзем перабольшваць, але заўсёды памяталі, што ёсць рызыка "хапнуць" радыяцыі і ад зямлі, па якой хадзілі, і ад пакінутых памяшканняў, і ад рэчаў, што трымалі ў руках. Здараліся і непрадказальныя выпадкі. Неяк зайшоў у адну з хат і не змог патрапіць у яе чыстую палову: нехта падпёр з другога боку дзверы. Аказалася, што ў пакой у пошуках корму завітаў дзікі кабан і не змог назад выйсці. А быў бы жывы гэты здаравенны вяпрук? Ці такі выпадак: папрацавалі амаль увесь дзень у 30-кіламетровай зоне, пара хутчэй ехаць ды сапсаваўся аўтобус. Да Нароўлі — 13 кіламетраў. Мабільнікаў, каб звязацца з райцэнтрам, тады не было. Настрой — нікудышны. Балазе ў аднаго з запаслівых удзельнікаў экспедыцыі знайшлася бутэлька супрацьрадыяцыйнага "Кабернэ". "Абараніліся дозай" і пайшлі пехатой да блокпаста, дзе была рацыя. Райаддзел культуры даслаў свой аўтобус і адбуксіраваў наш. Ды і "самасёлы" часам прымалі нас за марадзёраў, а іх там — аматараў паквапіцца чужым здабыткам — ставала. Запомніліся назаўсёды словы мясцовага жыхара на радзіме Аркадзя Куляшова ў вёсцы Саматэвічы Касцюковіцкага раёна: "Не ад радыяцыі мы мром, а ад болі на душы, калі бачым, што сталася з тым, што так цяжка нажывалася і так шанавалася". Хто пабываў там, той яго зразумее.

■■■

У 1996 годзе да дзесяцігоддзя аварыі выдавецтвам "Беларуская энцыклапедыя" быў выпушчаны 316-старонкавы зборнік "Чарнобыль", у якім амаль шостую частку аб`ёму занялі матэрыялы, звязаныя з выратаваннем і захаваннем гісторыка-культурнай спадчыны, што можна лічыць своеасаблівай справаздачай аб дзейнасці Дзяржэкспедыцыі. Яна спынілася ў 2000 годзе з завяршэннем тэрміну выканання Нацыянальнай праграмы пераадольвання вынікаў чарнобыльскай катастрофы на перыяд да гэтага года, а дакументы і напрацоўкі былі перададзены ў Нацыянальны архіў і тагачасны Дзяржкамчарнобыль. Спадзяюся, што яны запатрабаваныя.

Міхаіл ФІЛІСТОВІЧ

Уладзімір Кожух. "Аплакванне".

Пакуль — эскізы

Алесь Квяткоўскі. "Акуляры слёз".

Віктар Барабанцаў. "Кармініца".

Былыя жыхары вёскі Вяжышча, наведаўшы могілкі, завіталі і да сваіх хат, што апынуліся па другі бок зоны адчужэння. Радуніца 2005 г. 39 км да рэактара. / Фота Дзяніса Раманюка

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 3.)

Запамінаецца філасафічнага зместу графіка Георгія Паплаўскага. Былі вартыя ўвагі дыпломныя работы ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Ды ўсё ж тэма Чарнобыля ў мастацкім асяродку не набыла ў Беларусі гучання, якое б адпавядала маштабу падзеі. Сёння, калі мы згадваем, што трыццаць год назад выбухнуў Чарнобыль, і з гэтай нагоды ў сталіцы ладзяцца мастацкія імпрэзы, дык на іх дамінуюць дакументальныя карціны, створаныя мастакамі пад непасрэдным уражаннем ад пабачанага на зоне адчужэння адразу пасля выбуху і адсялення людзей.

Выстава ў Гарадской мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва так і называецца — "Зямля адчужэння". Прадстаўлены творы Віктара Шматава, Уладзіміра Кожуха і Віктара Барабанцава. Усе яны наведвалі з творчымі мэтамі раёны Гомельскай вобласці, знаходжанне ў якіх пасля красавіка 1986 года стала небяспечным для здароўя і жыцця. Немагчыма без болю глядзець на зафіксаваныя імі рэаліі зямлі, пакінутай жыхарамі. Жывапіс Шматава — гэта задакументаваныя факты. Мастак дакладна паводле вобразнага ладу і побытавых дэталяў пераводзіў на палатно тое, што бачыў на ўласныя вочы. Кожух трансфармаваў пабачанае ў сімвалічныя вобразы, у якіх, аднак, лёгка прачытваецца рэальная аснова. Барабанцаў жа, маючы схільнасць да метафарычнай выяўленчай мовы, засяродзіўся на абагульненых вобразах, дзе пра зыходную канкрэтыку можна толькі здагадвацца. Увогуле творы ўдзельнікаў так званых чарнобыльскіх пленэраў духам і зместам нагадваюць франтавыя замалёўкі 1941—1945 гадоў старэйшага пакалення мастакоў. Але з тых замалёвак потым нарадзіліся эпахальныя палотны, тым часам як чарнобыльская тэма ў нашым мастацтве засталася на стадыі фіксацыі фактаў.

У Мінскай абласной бібліятэцы імя Аляксандра Пушкіна адкрыецца выстава карцін Алеся Квяткоўскага "Чарнобыльская малітва" . Па словах мастака, яны рабіліся не да сумнай гадавіны. Але трыццацігоддзе катастрофы стала падставай для асэнсавання шляху, кропка адліку якога — Чарнобыль. Прадстаўленыя творы — свайго кшталту фрагменты роздуму пра лёс Радзімы ў трагічных варунках стагоддзя. Назву выставе дала вядомая кніга Святланы Алексіевіч.

Васіль Зянько. "Пустэльнік".

Гэтымі ж днямі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрылася выстава "Чарнобыль. Выпрабаванне на трываласць", дзе экспануюцца дакументы, з якіх відаць, як дзяржава і грамадства працавалі дзеля пераадолення наступстваў катастрофы непасрэдна пасля выбуху. Тут жа кіна- і фотадакументы; літаратура, датычная Чарнобыльскай праблемы, артэфакты, якія адлюстроўваюць эмацыянальны стан дзён. Адначасова са згаданым мерапрыемствам адбылася прэзентацыя новай рэдакцыі навукова-мастацкага альбома "Чарнобыль". Аўтар-выдавец Дзяніс Раманюк, ён жа браў непасрэдны ўдзел у стварэнні альбома. Да таго ж да справы спрычыніліся эколаг і біёлаг Ігар Бышнёў і фотамастак Анатоль Кляшчук. У канцэптуальным сэнсе Дзяніс Раманюк доўжыць працу ягонага бацькі, выдатнага навукоўца-этнографа і фотамастака. У ягоных творчых работах адчуваецца і ўласны почырк, і эстэтыка Міхася Раманюка, у чыёй аснове — дакументалізм, які робіць фотаздымкі гістарычным дакументам, а таксама засяроджанасць на сутнасным, стрыжнявым чынніку з'явы ці аб'екта.

Не будзе памылкай далучыць, хай сабе і не наўпрост, да чарнобыльскага кантэксту выставу Васіля Зянько "Час як рэнтген" у сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва. Выявы на ягоных карцінах нібыта прасвечаныя рэнтгенаўскімі промнямі, так бы мовіць, да костак, да структуры, да сутнасці. На думку мастака, такім "рэнтгенам" для чалавека і ягонага свету з'яўляецца Час, які раней ці пазней ўсё расставіць па сваіх месцах, усяму дае сапраўднае найменне, вызначае цану. Прынамсі, такія думкі прыходзяць, калі глядзіш на выставу ў дні сумнай гадавіны.

Падсумоўваючы агляд мастацкіх акцый, так ці інакш прымеркаваных да трыццатых угодкаў Чарнобылю, магу сказаць, што сёння нам усё яшчэ цяжка асэнсаваць глабальны маштаб таго, што адбылося 26 красавіка 1986 года. Вялікае бачна здалёк. 30 гадоў у дадзеным выпадку — тэрмін невялікі. Ды і Чарнобыль мы, лічы, не аналізуем, а перажываем эмацыйна. А інакш і быць не можа, бо мы ўсе — удзельнікі і сведкі. Значыць не можам глядзець на сваю бяду стороннім вокам.

І яшчэ. Я падзяляю думку пра тое, што катастрофа стала для нашай краіны выпрабаваннем на трываласць. Беларусы здалі гэты цяжкі іспыт як паўнавартасная нацыя — годна і мужна. Сёння наш чарнобыльскі досвед — гэта здабытак глабальнай цывілізацыі. Яго аналізуюць ва ўсім свеце, калі здараецца бяда ці ўзнікае падобнага маштабу пагроза.

Помніцца, Рыгор Барадулін назваў беларусаў "эксперыментальным народам у Бога". Можа, якраз з чарнобыльскага попелу і паўстане новая цывілізацыя, абрысы якой толькі-толькі акрэсліваюцца. Мастакі часта бачаць далей навукоўцаў. Значыць, у перспектыве мы мусім чакаць ад беларускага мастацтва праз асэнсаванне Чарнобыльскай эпапеі новага далягляду і, адпаведна, эпахальных твораў. Пакуль жа мы маем толькі накіды, эскізы…

К

Чалавек чалавеку

Фатограф Сяргей Плыткевіч патрапіў на канцэрт "Песняроў" у Хойніках у 1986 годзе выпадкова. "Першая паездка, я тады быў пазаштаным супрацоўнікам газеты "На страже Октября", — распавядае ён. — Дзякуючы гэтаму супрацоўніцтву і ўдалося патрапіць у зону".

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Свае ўражанні ад той камандзіроўкі вядомы фотажурналіст апісвае так: "Прыязджаеш з чаканнем таго, што ўбачыш штосьці жудаснае, але на месцы ўсё абарочваецца ці не завядзёнкай. Усё спакойна… Але ў паветры — такое напружанне, якое нельга выказаць. Адно слова ўзгадваецца — сюррэалізм".

"Па шчырасці, я паехаў туды, таму што хацеў разабрацца, — дзеліцца Сяргей Плыткевіч. — Інфармацыя ж "выбухнула" не адразу, а пасля майскіх святаў. Патрапіць у тыя раёны як "звычайнаму смяротнаму", так простаму журналісту было немагчыма. Але праз газету Міністэрства ўнутраных спраў мне ўдалося прабіцца".

Работа фатографа ўключала суправаджэнне міліцэйскай службы, якая не толькі патруліравала, забяспечвала парадак, але і суправаджала канцэрты… Зрэшты, у абавязкі ўваходзілі і рэйды на самагоншчыкаў. Гучыць нечакана, але тая першая паездка ўключала ў сябе, у тым ліку, і такія "прафілактычныя" заезды. А вёскі і гарады Чарнобыльскай зоны былі, хутчэй, дадаткам да больш глабальных задач.

"Прыехалі ў Васілевічы — усё спакойна. Далей Калінкавічы. Ну, мяркую, убачым штосьці. Але і тут таксама нічога незвычайнага. Хойнікі… Людзі разгубленыя, але даволі спакойныя. І толькі міліцыянеры кажуць, што трэба піць чырвонае віно, якое дапамагае "супраць радыяцыі"… Гэта адчуванне і запомнілася: будзённы рэйд супраць самагоншчыкаў у раёнах, а побач вось гэта трагедыя ў пацярпелых вёсках, гарадах, якую не можаш усвядоміць, бо няма відавочных праяваў".

На канцэрт "Песняроў" фатограф таксама патрапіў выпадкова: міліцэйскія службы забяспечвалі парадак на масавым мерапрыемстве. "Народу было процьма, я нават і не чакаў такога, — прыгадвае Сяргей Міхайлавіч тыя імгненні. — Тады гэта выступленне падавалася жэстам уладаў, якія апякуюцца пацярпелымі. Але, насамрэч, было зразумела, што гэта і ўчынак музыкантаў, якія прыехалі да слухачоў, людзей. Бо ніхто, упэўнены, іх не прымушаў, як і мяне, ехаць туды. Тое было ад чалавека — чалавеку. Людзі сабраліся на канцэрт: ліквідатары, жыхары… І не толькі з Хойнікаў. Гэта яднанне, вядома, запомнілася. І тое, як цёпла прымалі ансамбль…"

На жаль, большасць з каштоўнага матэрыялу, зробленага фатографам для "На страже Октября", было згублена. У 1996 годзе частка негатываў была прадстаўлена для выставы аднаму з фондаў, ды архіў так і не вярнулі. У тое нямногае, што ўдалося захаваць з паездак 1986 — 1989 гадоў, і ўваходзіць гэты фотарэпартаж з канцэрта "Песняроў" у Хойніках, ды яшчэ серыя-рэпартаж з вёскі Сабалі, гісторыя якой вартая асобнага артыкула, які ў хуткім часе "К" і прапануе.

Нагодай для гэтага матэрыяла, прысвечанага падзеям вясны і лета 1986 года, звязаным з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС, сталі фотаздымкі Сяргея Плыткевіча: вядомы майстар камеры выклаў іх на ўласнай старонцы ў сацыяльнай сетцы. А журналісты "К" за тыя кадры "зачапіліся" і, у выніку, агледзелі падзеі, зафіксаваныя 30 гадоў таму яшчэ на чорна-белай стужцы, у трох вымярэннях. Як пабачылі гастролі "Песняроў" у Хойніках, што адлюстраваны на фота, і па Гомельшчыне наогул артысты ансамбля, якія ёсць на здымках Плыткевіча, гледачы на стадыёне гарадка і, уласна, фатограф. І гаворка ў гэтых матэрыялах зусім не пра тое, як бравыя артысты рынуліся з "культурным абслугоўваннем" у пацярпелыя ад аварыі рэгіёны. І яны, і іншыя героі тэкстаў "К" распавялі нам пра жыццёвыя ўражанні тых дзён. Мяркуем, гэта і ёсць "бліжэйшае да сэрца".

Канцэрт "Песняроў" у Хойніках. Сола — Валерый Дайнэка.

На авансцэне — Уладзімір Мулявін.

Уладзімір Мулявін, Аляксандр Растопчын і Ігар Пеня.

Валерый Дайнэка, Ігар Пеня, Уладзіслаў Місевіч, Міхаіл Кулькоў, Анатоль Кашапараў.

Тры вымярэнні

Успаміны музыкантаў ансамбля "Песняры" аказаліся рознымі па насычанасці падзейным і эмацыйным складнікамі. Але такое спалучэнне дазволіла скласці фрагменты ў віртуальнае абмеркаванне. Віртуальнае, паколькі большасць з тых артыстаў, хто зафіксаваны на фота і пагадзіліся падзяліцца ўспамінамі, сёння працягваюць гастраляваць: сабраць іх у адным месцы досыць складана. Гэта заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь Валерый ДАЙНЭКА, Анатоль КАШАПАРАЎ, Уладзіслаў МІСЕВІЧ і Ігар ПЕНЯ. А гітарыст Аляксандр РАСТОПЧЫН цяпер жыве за акіянам — у Злучаных Штатах Амерыкі. На жаль, на прапанову абмеркаваць тэму не адгукнуўся Міхаіл Кулькоў, не толькі бас-гітарыст тагачаснага складу "Песняроў", але і фізік-ядзершчык па адукацыі. Думаецца, яму было б што дадаць да кантэксту гутаркі.

Падрыхтаваў Сяргей ТРАФІЛАЎ

■■■

Анатоль Кашапараў: — Памятаю сонечны канец красавіка 1986-га. Мы тады дзень пры дні плённа рэпеціравалі ў зале, што ў сутарэннях Акадэміі міліцыі. і сапраўды, нехта са знаёмцаў пачаў казаць, што ва Украіне нешта ядзернае выбухнула. З парадаў жа тых, хто нешта ў гэтай справе цяміў, скарысталіся толькі адной: сталі зачыняць форткі. Небяспеку мы не ўсведамлялі.

Аляксандр Растопчын: — Брат гітарыста Леаніда Вярэніча, калі не памыляюся, вучыўся некалі на фізтэху БДУ разам з яшчэ адным героем гэтых здымкаў Міхаілам "Майклам" Кульковым — тады бас-гітарыстам "Песняроў", а па адукацыі — фізікам-ядзершчыкам. Праз іх, а больш дакладна праз іх сяброў, што працавалі на атамных станцыях Саюза, і мы даведваліся: у Чарнобылі здарылася нешта нядобрае, ледзь не эквівалент ядзернага выбуху. Але ставіліся да гэтага неяк так: эквівалент ядзернага выбуху — ды з кім такога не бывае! Не разумелі нічога, бо не ўяўлялі, што такое радыяцыя. А ўрэшце, каб нават разумелі, як і дзе ратавацца? Тым часам пайшлі радыёактыўныя дажджы. Праўда, пра небяспеку тых ападкаў сказалі пасля. А мой старэйшы сын Саша нарадзіўся ў лістападзе 1985 года, і бабуля акурат напрыканцы красавіка — у пачатку мая 1986-га з вазочкам, дзе спаў хлопчык, шпацыравала вакол дома пад гэтымі дожджыкамі.

Уладзіслаў Місевіч: — А ў майго сябра акурат дзіця нарадзілася тымі днямі: з радзільні забіралі, прыкрыўшы немаўлятка цэлафанавай плёнкай.

Валерый Дайнэка: — Кіраўніцтва СССР і, адпаведна, БССР рабіла выгляд, што праблемы ніякай няма. І на Першамай, і на Дзень Перамогі шчаслівыя людзі са сцяжкамі гулялі з непакрытымі галовамі пад пякучым сонцам. Тым часам, у Еўропе людзі, як цяпер вядома, хоць дома за закрытымі вокнамі спрабавалі схавацца.

Фота робіць адзін са службоўцаў у форме ваеннага кшталту.

Уладзіслаў Місевіч: — Так, "майскія" адзначаць "Песняры" збіраліся акурат у Мінску. Урэзалася ў памяць такая карцінка, жах якой усвядоміў толькі з часам: у парку, дзе знаходзіцца помнік Марату Казею, бегалі дзеткі ў гімнастычнай форме, весяліліся, рыхтуючыся да свята. А бацькі побач знемагалі ад спёкі.

Валерый Дайнэка: — Я гэты час памятаю з дзвюх прычын. Акурат 1 Мая пасля дэманстрацыі нас здымаў фатограф Юрый Іваноў у парку Янкі Купалы і на набярэжнай Свіслачы. А яшчэ тымі ж днямі з жонкай у Мінску прыглядалі кватэру на абмен з Масквой. Але калі пра трагедыю праз колькі тыдняў стала шырока вядома, з ідэяй пераезду развіталіся.

Уладзіслаў Місевіч: — Ды пра якое інфармаванне вядзецца гаворка, калі людзі Чарнобыль з Цярнопалем блыталі? А вось чутак ставала! Спачатку выказвалася здагадка, маўляў, у навукова-даследчым інстытуце ў Соснах нешта рванула. Сустракаючы знаёмых з Гомеля на чыгуначным вакзале, даведаўся, што ў людзей там надзвычай зудзела скура, як пры алергіі, а ў горадзе фарміруюць саставы для эвакуацыі. Затым знаёмыя дактары параілі: давайце дзецям ёдавыя таблеткі (мне іх для дачкі ледзь дастала ў забітай хворымі лечкамісіі Святлана Пенкіна, жонка Валодзі Мулявіна). Праўда, іх трэба было даваць адразу, а не праз колькі дзён. Ну і, вядома ж, усяго за некалькі дзён у Мінску бадай кожны ведаў, прыкметай чаго з'яўляецца прысмак жалеза ў роце. А вось навукоўцы-суседзі па дачы, што атрымлівалі за шкоднасць сваёй працы дадатковыя 4 "соткі", звесткамі дзяліцца не спяшаліся. Ну, праверылі лес з-пад Стоўбцаў для майго дому з дазіметрам, але ніякай канкрэтыкі: што такое бэры, у чым небяспека? Хіба раілі агулам: больш мыцца і без дай патрэбы не выходзіць на вуліцу. (Кантраст з нашай непісьменнасцю: у Беларусь прыехалі японцы, усе да аднаго з міні-дазіметрамі, прычым яны проста разварочваліся і сыходзілі, калі бачылі большыя за норму лічбы на сваіх прыборах, пакідаючы рэчы ледзь не на перонах.) Ну а мы з уласнай ініцыятывы хіба больш выпівалі. Аднойчы тымі днямі я бавіў халасцяцкі вечар у сяброка. Хлопец гаспадарлівы, увішны, ён на балконе пасадзіў у скрынях грады закускі: лучок, пятрушка… Праўда, калі запрошаны ім да стала сусед-фізік правёў прыборчыкам па тых пасадках, дык сказаў адно: "Выкідай разам са скрынкамі!"

■■■

Аляксандр Растопчын: — Паездка па рэгіёнах, што пацярпелі ад аварыі, адбылася цэнтралізавана. Урэшце, у тых краях пабывалі ці не ўсе вядучыя мінскія і маскоўскія артысты. "Песняры", як, мяркую, і іншыя артысты, наведвалі раёны Гомельшчыны па раскладзе: гасцініца — сняданак — абед — канцэрт — аўтобус — гасцініца.

Валерый Дайнэка: — Зразумела, мы ведалі, што едзем не на самую небяспечную тэрыторыю. Ды і ў падрабязнасці нас не прысвячалі.

Уладзіслаў Місевіч: — А былі тыя, як Ала Пугачова, што выехалі ў сам Чарнобыль. Так, відаць яна і была самай першай, балазе мясцовыя людзі і хацелі яе бачыць. Але пасля ў артысткі хапала праблем са здароўем… Дарэчы, у хуткім часе пасля аварыі (але да выезду на Гомельшчыну) нас чакалася паездка ў Краснаярск. Многія з нас настроіліся абследавацца ў тамтэйшых дактароў. З трапа самалёта мы адразу просімся ў арганізатараў: вязіце ў лякарню. Але на нашы страхі пра Чарнобыль нам адказалі хіба: "Чулі, чулі…" А пасля патлумачылі прычыну такога спакою: у Краснаярску і яго ваколіцах стае такіх мясцінаў, дзе "фаніць" не менш, чым у Чарнобылі, ужо не першы год.

Анатоль Кашапараў: — І ўсё ж быў іншы час. Гэта цяпер грошы кіруюць усім, а тады за натуральны абавязак лічылі падтрымаць людзей маральна. Усведамленне навалы прыйшло пасля, а на той час, не валодаючы больш-менш поўнай інфармацыяй, хіба мы самі не былі гатовыя на нашым "лазіку" хоць на сам рэактар прыехаць?!. Урэшце, у гэтым "туры" нас чакалі не толькі Хойнікі, але і Брагін, Мазыр…

Гледачы канцэрта на стадыёне ў Хойніках.

спякотнага лета-86

Валерый Дайнэка: — Падаецца, акурат у Мазыры мы і жылі ў гатэлі, выязджаючы адтуль па гарадах Гомельшчыны.

Уладзіслаў Місевіч: — Напачатку сапраўды быў Мазыр. Спёка надзвычайная, а ў горадзе нібыта людзей там паменела. Бачу, працуе выязны гандаль: піражкі, сокі, квас. Толькі ўсё накрытае плёнкай, каб хоць неяк абараніць ад радыяцыйнага фону. Памятаю, як для пакупнікоў тую плёнку прыўзнімалі, каб наліць, скажам, шклянку напою.

Аляксандр Растопчын: — А ў Рагачове на Гомельшчыне рабілася згушчанае малако. Мы яго набывалі і лыжкамі елі. Нехта сказаў, маўляў, яно ж радыёактыўнае. Мы ў адказ: "Ну і што? Галоўнае ж — смачнае!"

Валерый Дайнэка: — З тае пары памятаю такі "чорны" жарт. Праз некалькі месяцаў пасля паездкі па Гомельшчыне "Песняры" апынуліся ў глыбінцы Расіі. Я (тады — з шыкоўнай капой валасоў) і Міхаіл Кулькоў (з куды радзейшай фрызурай, лічы, з яе амаль татальнай адсутнасцю) засяляліся ў адзін гасцінічны нумар. Адміністратар паспачувала нам, спытаўшы, як у Беларусі з радыяцыяй, як наша здароўе. Міша, стомлены з дарогі, праводзіць рукой па лысіне і кажа: "Бачыце? А да Чарнобыля было, як у яго!"

Анатоль Кашапараў: — Але жартавалі мы з той радыяцыі ці не, а пераапраналіся ўжо ў аўтобусе, які ішоў, не затрымліваючыся ў тых гарадках на лішнюю гадзіну і не трываючы да "месца дыслакацыі". А пасля ўезду ці выезду з тэрыторыі кожнага раёна, што пацярпеў, нам колы аўтобуса мыліся ў ачышчальных ямах, а сам транспарт паліваўі спецыяльным растворам.

Ігар Пеня: — Так, мне ў памяць урэзаліся блокпасты, праз якія праязджалі да забруджаных раёнаў і выязджаючы з іх. А гэта — агляды, замеры на дазіметрах.

Анатоль Кашапараў: — Была ў нас і свая прылада дзякуючы майму цесцю, які працаваў у сістэме грамадзянскай абароны. Усё, што елі, абавязкова папярэдне правяралі. Найбольш "фанілі" смажаныя яйкі. Я тую карысную штучку потайкам доўга вазіў, нават на замежныя гастролі. А найбольш верашчаў апарат недзе пад Кіевам, а яшчэ — на дыванку ў нумары адэскага гатэля.

Валерый Дайнэка: — У аўтобусе дазіметр выстаўлялі проста ў фортку, назіраючы, як на вачах раслі лічбы на экране.

Уладзіслаў Місевіч: — Цікава, што ў адну з апошніх маіх паездак у Злучаныя Штаты ў складзе "Песняроў" да ансамбля падышоў мужчына. Кажа: "Памятаеце, я салдатам вас суправаджаў у Хойнікі з дазіметрам у руках і забараняў выходзіць у поле падчас прыпынку гастрольнага аўтобуса?" І сапраўды ж такое было: тады зусім яшчэ хлопчык, ён паказаў нам лічбы ўжо на вялікім , як кажуць, дазіметры, і "зашкальвалі" яны асабліва ў збажыне. Па-чорнаму "фаніла" і на стадыённым газоне.

Анатоль Кашапараў: — А людзі ў тых гарадках, дзе выступалі "Песняры", як мне запомнілася, не былі надта напужаныя сітуацыяй. Нас традыцыйна чакалі цёплы прыём, беларуская добрасардэчнасць.

Ігар Пеня: — Хоць, вядома, нейкая напружанасць лунала, але людзі радаваліся. У такія моманты забывалася, што зусім недалёка, у Чарнобылі, адбылося нешта, не да канца зразумелае нам. На тым жа хойніцкім стадыёне — біток! Падавалася, увесь гарадок сабраўся. Прычым прыехалі са звычайнай песеннай праграмай.

Уладзіслаў Місевіч: — А паколькі Хойнікі — горад маленькі, адразу было заўважна: мужчын (можа, былі выкліканы на зборы) і дзяцей (іх вывезлі ў летнікі) сярод гледачоў няшмат. Памятаю яшчэ, што канцэрты мы адпрацоўвалі на сваім апараце, а стадыён быў у прыстойным стане з нейкім агітплакатам над трыбунай.

Валерый Дайнэка: — Дарэчы, цяпер пытаннем задаюся, разглядаючы здымкі: а чаму, уласна, канцэрт праходзіў на стадыёне, а не ў доме культуры, скажам? Пагадзіцеся, не самае бяспечнае месца ў тых варунках. Магчыма, кіраўнікі рознага ўзроўню хацелі большай агалоскі, каб паказаць, якія ўсе мы — што артысты, што мясцовыя жыхары — бясстрашныя. Цяпер, думаеш пра гэта і разумееш: з намі нібыта ў нейкую дзіцячую гульню гралі.

Ігар Пеня: — А ў агульнай масе гледачоў вылучалася ваеннага тыпу адзенне: не салдаты, не міліцыя. Мо гэта тыя, хто назаўтра паехаў на чарнобыльскую станцыю ліквідаваць наступствы аварыі?..

Уладзіслаў Місевіч: — Разпораз на Гомельшчыне сапраўды складвалася ўражанне, што ваенных ледзь не больш за грамадзянскіх. Ды і машын адпаведнай афарбоўкі хапала!

Аляксандр Растопчын: — Так, перад кожным такім канцэртам па перыметры стадыёна хлопчыкі ў шэра-карычневай форме і сядзелі. Тады прыгадаўся мне Афганістан, дзе гэткіх жа салдацікаў пабачыў, калі ў складзе "Тонікі" Віктара Вуячыча ездзіў туды.

Уладзіслаў Місевіч: — І наогул, мы прыехалі, калі пасля аварыі мінула некалькі месяцаў. А з першых дзён там знаходзіліся ўзнятыя ў першую ж ноч па трывозе курсанты на чале з колішнім камсамольскім важаком, а на той час — намеснікам начальніка Вышэйшай школы міліцыі Уладзімірам Падрэзам. Усе чорныя ад сонца, форма — брудная. Вось тады мне дакладна стала зразумела: справа — не жартоўная. А яшчэ хлопцы-міліцыянеры шчыра прызналіся: ратуюцца гарэлкай. Не магу сказаць, ці радыяцыю яны ёй выганялі, ці проста хацелі хоць на час выкінуць з галавы страх праз тое, што адбывалася наўкол.

Ігар Пеня: — Мы ж ратаваліся чырвоным віном, праўда, пасля канцэртаў.

Валерый Дайнэка: — Гэта было балгарскае "Кабернэ", таннае, ды і было яго — хоць заліся! Прафілактыку ж праводзілі штодзённа.

■■■

Уладзіслаў Місевіч: — Быў яшчэ момант, калі "Песняроў" сабралі ў Міністэрстве культуры БССР. Маўляў, у вас ёсць ваенная праграма, Лучанка запрасіце і рабіце дабрачынны канцэрт на мінскім стадыёне "Дынама". Мулявін упарціўся: трэба рыхтавацца, а ў нас апаратура - ніякая (у выніку яе давялося збіраць і там, і сям). Ды і часу — вобмаль. Але міністр культуры на ўсе нашы аргументы адрэзаў: хоць у ЦК ідзіце, а трэба зрабіць. Да ўсяго, насуперак жаданню Валодзі, каб людзі прыходзілі на стадыён задарма, наладзілі продаж білетаў коштам 1 рубель (на футбол — 1 рубель 40 капеек). Усе сродкі, маўляў, пойдуць ў пацярпелыя рэгіёны. Але нам такая форма працы на той час была мала вядомая, і ў ансамблі ўсур'ёз хваляваліся, што людзі падумаюць, нібыта "Песняры" зарабляюць на бядзе суграмадзян. Нават калі прыняць да ўліку, што на стадыёне было больш за 30 тысяч гледачоў (прыкладна з 50 тысяч магчымых), гэта відавочна адзін з канцэртаў ансамбля для найбольшай колькасці гледачоў. Прычым усё рабілася ў лічаныя дні, без рэкламы. Мо і без прафсаюзаў не абышлося, але факт, што людзі стаялі ў чэргах па білеты.

Анатоль Кашапараў: — У тых краях я пабываў зноў ужо ў сярэдзіне "нулявых" у рамках традыцыйнай культурнай акцыі "Чарнобыльскі шлях". Пабачыў здалёк і дрот, якім абнесена адселеная зямля, і пакінутыя гаспадарамі старыя машыны — даўно ўжо праржавелыя бляшанкі: гэта страшна, як шрамы на сэрцы... Так, у тых раёнах, якія перажылі трагедыю, народу стала менш, але людзі такія ж, як і раней: чулыя, добрыя, душэўныя. Братэрства і яднанне засталіся. І канцэрты ледзь не з двайнымі перааншлагамі зноў "на ўра!" праходзяць (як і ў 1986-м), што ў Беларусі, што на расійскай Браншчыне ці ва ўкраінскіх абласцях).

Уладзіслаў Місевіч: — Жыццё гэтак хутка ўсё змяніла. Думалася, бяда будзе бясконцай. А тут вялізную тэрыторыю за пэўны час нейкім чынам адаптавалі да жыцця.

Валерый Дайнэка: — А ўрэшце, добра, што стае кніг па тэме, што знятыя фільмы пра аварыю і яе наступствы для Беларусі, што з'явілася, нарэшце, інфармацыя.

Уладзіслаў Місевіч: — Мусіць, тады ўсе, і я ў тым ліку, чакалі паездкі кіраўніка савецкай краіны Міхаіла Гарбачова ў Чарнобыль у час найбольш складанай сітуацыі. Такога не адбылося. Затое цяпер зразумела, як важна, калі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка бывае ў пацярпелых ад радыёнуклідаў тэрыторыях у дні памяці пра чарнобыльскую бяду (ды і не толькі тады), гутарыць з людзьмі, якія засталіся ці вярнуліся на тыя землі…

К

Як знайсці сведкаў хойніцкага "песняроўскага" канцэрта ўлетку 1986-га? Трэба на паўдня "сесці" на тэлефон. Балазе ў Хойніках быў процьму разоў (зона любіць перасяленцаў-чарнобыльцаў, такіх, як я, і прыцягвае нібыта магнітам) і маю там мноства знаёмых. Усё атрымалася так, як і чакалася.

Яўген РАГІН

Маленькі эпізод вялікай бяды

Адзін памятаў тую даўнюю падзею, але на райцэнтраўскім стадыёне, дзе адбыўся канцэрт, не прысутнічаў. Другі не памятаў і не быў. Трэцяя — таксама. Але дала слушную параду: чуць і бачыць "Песняроў" павінен быў Павел Барадулін, які і па сёння грае ў вакальна-інструментальным ансамблі, а працуе вадзіцелем. Так матузок пошуку скруціўся ў вузельчык адкрыцця. А да першага сведчання ўдала дадаліся і ўспаміны мясцовага журналіста Віктара Назаранкі — саліста таго самага хойніцкага ВІА. 30 гадоў таму ён пабываў на гарадскім стадыёне.

Па словах Паўла Барадуліна, монстры беларускага рока аказаліся простымі хлопцамі. Да Уладзіміра Мулявіна ўсе хойніцкія звярталіся па бацьку — "Георгіевіч". І ён з задавальненнем адгукаўся, абдымаўся з усімі, цалаваўся з дзяўчатамі. А апаратура шыкоўнай была. "Каб не чарнобыльская бяда, — разважаў сведка, — ці пабачылі б мы ўсё гэта?!" Стадыён быў паўнюткі. Канцэрт доўжыўся некалькі гадзін. Натуральна, усе ўразіліся якасцю выканання. "Адно толькі шматгалоссе было проста неймаверным", — згадваў Павел. Напэўна, лішне казаць, што надалей хойніцкі ВІА развіваўся пад уплывам песняроўскага майстэрства, у высокім узроўні якога ўсе прысутныя пераканаліся. Пасля канцэрта "Песняры" заспяшаліся ў Мазыр, дзе яны начавалі. Пакуль збіралі апаратуру, іх і абступілі. Бралі аўтографы (на жаль, нічога не захавалася). Адзін з хойніцкіх музыкантаў нават сфатаграфаваўся з кіраўніком зорнага гурта. І здымак гэты, як сцвярджаў Павел Барадулін, нібыта захаваўся і дапаможа яго адшукаць Віктар Назаранка — колішні саліст ВІА і сённяшні журналіст хойніцкай газеты.

Так, пацвердзіў Віктар, здымак ёсць, на ім разам з Мулявіным — хойніцкі музыкант Генадзь Галдзецкі, які ўжо сышоў з жыцця. І яшчэ цікавы факт: Віктар Назаранка вучыўся ў Інстытуце культуры адным часам з Валерыем Дайнэкам. Першы асвойваў тэатральную рэжысуру, другі — харавое дырыжыраванне. Пасля канцэрта Дайнэка заўважыў сярод тых, хто цікавіўся песняроўскай апаратурай, Назаранку і паклікаў: "Рэжысёр!". Менавіта Дайнэка распавёў аднакашніку, што "Песняры" накіроўваюцца днямі ў Індыю.

30 гадоў мінула з таго часу, многае з памяці выпала. Але засталося галоўнае."Ні да, ні пасля гэтага канцэрта я больш такога не бачыў, — казаў Віктар Назаранка. — Прафесіяналізм самага вышэйшага кшталту. Суладдзе і галасавое, і музычнае, як на студыйным запісе гучанне. Пачалі з "Каня незацуглянага". А электрасілкаванне ішло з судзейскага памяшкання, і штосьці там здарылася (адзін з правадоў парваўся?), але не было ніякай панікі. Імгненна выскачылі хлопцы з кейсамі, усё хутка запаялі". Канцэрт распачалі наноў. А пасля яго, пацвердзіў Віктар Назаранка, "Песняры" кантактавалі з удзячнымі слухачамі. Прымалі кветкі, смяяліся, раздавалі аўтографы. "Кідалася ў вочы тое, — казаў Віктар, — што высокі мастацкі густ арганічна спалучаўся з прастатой чалавечых зносін"…

Вось і ўсё. Маленькі эпізод вялікай беларускай бяды, якую "Песняры" раздзялілі з жыхарамі Хойнікаў.

На здымках невядомага аўтара: Уладзімір Мулявін і Генадзь Галдзецкі; падчас канцэрта.

К

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.". (У рамках экспазіцыі дзейнічае выстава **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя"**.

Выставы:

■ **"Героіка і лірыка мінулага стагоддзя"** — рускі жывапіс са збору музея — да 25 мая.
■ Выстава **"Кераміка Палесціны"** (традыцыйная кераміка з горада Хеўрона — ганчарнага цэнтра Палесціны) — да 24 красавіка.
■ Сумесная выстава іспанскага мастака Дуйліа дэ Хенара і беларускага скульптара Сяргея Парцянкова — да 16 мая.
■ Выставачны праект **"Vita–Ludi–Veritas"**, у якім прымуць удзел тры беларускія мастакі: Уладзімір Тоўсцік, Алена Шлегель і Уладзімір Ганчарук — з 27 красавіка да 26 мая.
■ Выстава твораў Мікалая Мішчанкі **"Рэальнасць чуйнай цішыні"** — з 25 красавіка да 20 мая.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Да самага Вялікадня кожную нядзелю музей запрашае на майстар-клас **"Пісанкі"** па роспісе найважнейшага атрыбута свята — велікодных яек. Пачатак а 12-й.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:

■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".

Выставы:

■ Выставачны праект **"Гандаль Беларусі на шалях гісторыі"** — да 1 чэрвеня.
■ Міжнародны выставачны праект **"Усё жыццё ў адным ровары"** — да 24 красавіка.
■ Выстава **"Баявыя нагалоўі засцерагальнага ўзбраення і харугвы беларускіх зямель XI — XVII стст."** — да 10 чэрвеня.
■ Інавацыйны выставачны праект 3D карцін **"Ілюзорыум"** — да 3 ліпеня.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыі:

■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езду РСДРП".
■ Інтэрактыўная выстава **"Вар'яцкая лабараторыя"**, падрыхтаваная сумесна з мінскім музеем папулярнай навукі "Элемента", — да 3 ліпеня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:

■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 9а. Тэл.: 237 46 94.

■ Выстава **"Мумії свету"** — да 6 мая.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.

■ Выстава **"Лукамор'е"** (фігуры, якія рухаюцца) — да 1 чэрвеня.
■ Выстава **"Экзатычныя жывёлы свету"** — да 5 верасня.
■ Незвычайны атракцыён – **"Стужачны лабірынт"** — да 31 снежня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".
■ Выстава **"Грані майстэрства"** — да 18 красавіка.
■ Выстава **"Верасковы мёд у парыжскім "Вуллі"** — да 30 красавіка.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:

■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.

Выставы:

■ **"Аўтамабіль на далоні"**.
■ Выстава **"Вялікдзень у Пецярбургу"** — да 16 мая.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:

■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".
■ Выстава графікі славенскага мастака Стояна Брэзачніка **"Вяртанне"** — да 8 мая.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе:
пн. — выхадны,
аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й,
сер. — ад 12-й да 20-й.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Беларусь — радзіма марскіх герояў"** — да 24 красавіка.
■ Выстава **"Не жанчыны прыдумалі вайну..."** — да 24 красавіка.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51,
+37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Археалагічныя знаходкі Палаца вялікіх князёў літоўскіх. Штодзённасць Віленскага двара"** з фондаў музея-палаца вялікіх князёў літоўскіх (Вільня) — з 29 красавіка да 19 верасня.
■ Выстава **"Мастацтва ў камені"** — да 1 мая.

Выставачная зала сектара экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці

■ Выстава **"Адлюстраванне"** — да 24 красавіка.

Ратуша

■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Уецца веер акрылены"** — да 5 верасня.
■ Выстава **"Скарбы князёў Радзівілаў у Скарбцы Мірскага замка"** — да 28 мая.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выставы:

■ Выстава работ Ігара Шаймарданава **"Вясёлы Пушкін"** — да 23 красавіка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.

Акцыі:

■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

Выстава:

■ Выстава твораў Барыса і Аксаны Аракчэевых **"Плывуць леты, нібы рэкі..."** — да 26 красавіка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва".**
■ Выстава твораў Віктара Шматава, Уладзіміра Кожуха, Віктара Барабанцава **"Зямля адчужэння"**, прымеркаваная да 30-й гадавіны трагедыі на Чарнобыльскай АЭС, — да 22 мая.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку СССР і Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г.Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ Выстава твораў Уладзіміра Масленікава **"Прастора і час"** — да 24 красавіка.
■ Выстава **"Адзінства"** мастакоў — членаў Пятроўскай акадэміі навук і мастацтваў — з 27 красавіка да 10 мая.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

Выстава:

■ Выстава графікі і скульптуры Уладзіміра Даўгялы і Сяргея Аганава **"Гонар. Годнасць"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.

■ Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыі:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ "Народныя іконы Беларусі 2-й пал. XIX ст.".
■ Выстава **"Нараджэнне гуказапісу"** — да 9 ліпеня.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МѢСТА"

г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

■ Выстава ў рамках праекта **"KOLO-ART"** (работы мастакоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія працуюць у кірунку мастацкага тэкстылю) — да 27 красавіка.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Экспазіцыі:

■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея".**
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст.".**
■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).

Выставы:

■ Выстава **"Мумії свету"** — да 8 мая.
■ Выстава **"Керамічны цуд з Гжэлі"** — да 24 красавіка.
■ Выстава жывапісных работ Вольгі Капачовай **"Гарадская архітэктура"** — да 4 мая.

Вежа палаца

Экспазіцыя:

■ **"Уладальнікі Гомельскага палаца Румянцавы і Паскевічы".**

Выставы:

■ Выстава **"Мудрая думка"** — выданні ўсходняй літаратуры (фонд мініяцюр) другой паловы XX ст. — да 29 мая.
■ **"Родны край, навек любімы"** — мастацка-адукацыйны праект, прысвечаны творчасці гомельскіх мастакоў — да 1 мая.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:

■ **"Свет звяроў Гомельшчыны".**

Выстава:

■ Выстава **экзатычных жывёл**.

Зімовы сад

■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл".**

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"Па праве Памяці"**, прысвечаная Чырвонай арміі першай паловы XX стагоддзя, з фондаў музея.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).

Выставы:

■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.

ІЎЕЎСКІ МУЗЕЙ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР

г. Іўе, вул. 17 верасня, 9
тэл. 801595- 2-68-96

■ Экспазіцыя **"Пад адзіным небам праз стагоддзі"** ("Карэннае насельніцтва Іўеўшчыны", "Беларускія татары").
■ Выставы **"Яўрэйскі квартал"**, **"Доўгія вёрсты вайны"**.
■ Персанальная выстава ікон Ядзвігі Сянько.
■ Прадстаўленні лялечнага тэатра "Батлейка", паслуга "Дні нараджэння ў музеі".

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

■ Выстава работ беларускіх фотамастакоў **"Энергія жыцця. Чарнобыль. 30 год"** — да 23 красавіка.
■ Фотавыстава **"Усе дарогі вядуць у... Італію"** — з 28 красавіка да 15 мая.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.

■ Міжнародная духоўна-асветніцкая выстава-кірмаш **"Вербны кірмаш"** — да 23 красавіка.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.

■ **24 —"Іяланта"** (опера ў 2-х дзеях) П.Чайкоўскага.
■ **25 — "Цені"** (сцэна з балета "Баядэрка") Л.Мінкуса; **"Маленькая смерць"**, **"Шэсць танцаў"** (балеты ў адной дзеі)В.А. Моцарта.
■ **26 — "Рэквіем"** Дж.Вердзі.
■ **27 — "Анюта"** (балет у 2-х дзеях) В.Гаўрыліна.
■ **28 — "Пікавая дама"** (опера ў 2-х дзеях) П.Чайкоўскага.
■ **29 — "Сільфіда"** (балет у 2-х дзеях) Х.Левінсхольда.
■ **29 — Вечар музыкі Сяргея Рахманінава** (Музычныя вечары ў Вялікім, камерная зала імя Л.П. Александроўскай). Пачатак у 19.30.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.

■ **23 — "Белы анёл з чорнымі крыламі"** (сучасная драма) Д.Балыка.
■ **24, 26 — "Чарнобыльская малітва"** (сумесны франка-беларускі праект) С.Алексіевіч.
■ **25 — "Дзве стралы"** (спектакль-прытча) А.Валодзіна.
■ **27 — "Кругі раю"** (дакументальная алегорыя) С.Навуменка.
■ **28 — "Адамавы жарты"** (камедыя паводле твораў Ф. Аляхновіча і Л. Родзевіча) С.Навуменка.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.

■ **23 — "Прыгоды брэменскіх музыкаў"** (мюзікл для дзяцей і дарослых у 2-х дзеях) Г.Гладкова. Пачатак у 11.30.
■ **23 — "Вяселле ў Малінаўцы"** (музыкальная камедыя ў 2-х дзеях) Б.Аляксандрава.
■ **24 — "Чароўная лампа Аладдзіна"** (мюзікл для дзяцей і дарослых у 2-х дзеях) М.Самойлава. Пачатак у 11.30.
■ **24 — "Цыганскі барон"** (аперэта ў 2-х дзеях) І.Штрауса.
■ **27 — "Аднойчы ў Чыкага"** Дж.Стайна, Г.Мілера, Дж.Кандэра і інш.
■ **28 — "Вясельны базар" ("Аршын мал алан"**, камедыя ў 2-х дзеях) У.Гаджыбекава.
■ **29 — "Шклянка вады"** (мюзікл у 2-х дзеях) У.Кандрусевіча.
■ **30 — "Прыгоды Кая і Герды"** (мюзікл для дзяцей і дарослых у 2-х дзеях) Г.Шайдулавай. Пачатак у 11.30.
■ **30 — "Баль у Савое"** (аперэта ў 2-х дзеях) П.Абрахама.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

■ **23 — "Музыка — усё"** (прэзентацыя новай музычна-тэатральнай праграмы). Пачатак аб 18.
■ **28 — "Дэкамерон"** (тэатральная імправізацыя на 2 дзеі для дарослых) Д.Бакача. Пачатак аб 18.
■ **30 — "Асцярожна, Соня!"** А.Усачова. Пачатак аб 11-й.